Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

# КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 “Гісторыя”,
1-02 01 02 “Гісторыя. Англійская мова”

Складальнік С. У. Касцюкевіч

Наваполацк 2006

УДК 930(075.8)
ББК 63.2я73
К 85

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

І. А. МАРЗАЛЮК, д-р гіст. навук, заг. каф. археалогіі і дапаможных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта;
Д. У. ДУК, канд. гіст. навук, заг. кафедры гісторыі і сацыялогіі;
Я. У. ГЛАЗЫРЫН, старшы выкладчык кафедры гісторыі і сацыялогіі

Рэкамендаваны да выдання саветам гісторыка-філалагічнага факультэта

**К 85** **Крыніцазнаўства :** вучэб.-метад. комплекс / склад. С. У. Касцюкевіч. – Навапалацк : ПДУ, 2006. – 160 с.
ISBN 985-418-481-1

Прадстаўлены вучэбны матэрыял па модулях, якія адпавядаюць тэмам вучэбнай праграмы, тэматыка практычных заняткаў, кантрольныя заданні, спіс паняццяў і літаратуры па тэмах вывучаемага курса.

Прызначаны для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання.

**УДК 930(075.8)**
**ББК 63.2я73**

ISBN 985-418-481-1

© УА “ПДУ”, 2006
© С. У. Касцюкевіч, складанне, 2006

# УВОДЗІНЫ

Крыніцазнаўства – гэта вучэбная дысцыпліна, якая закладвае падмурак прафесійнай культуры будучых гісторыкаў. Азнаямленне з ёй дазволіць студэнтам навучыцца асноўным прыёмам, метадам і прынцыпам працы з гістарычнымі крыніцамі, без якіх немагчыма праца гісторыка.

Крыніцазнаўства склалася як навуковая дысцыпліна, што вывучае гістарычныя крыніцы і распрацоўвае метады атрымання з іх інфармацыі аб гістарычных з'явах і працэсах. У адрозненні ад іншых гуманітарных навук, толькі крыніцазнаўства разглядае крыніцы і метады іх даследавання ў якасці свайго прадмета. Забеспячэнне ўзрастаючых запатрабаванняў у рэтраспектыўнай інфармацыі гістарычных крыніц суправаджаецца пашырэннем грамадскіх функцый крыніцазнаўства, актуалізацыяй усяго комплекса праблем, звязаных з аховай, збіраннем, навуковым апісаннем, публікацыяй гістарычных крыніц. Пашырэнне сацыяльных функцый крыніцазнаўства звязана з задачамі ўдасканалення метадаў выкладання і распаўсюджання крыніцазнаўчых ведаў. У сучаснасці пашырылася кола праблем, якія цікавяць гісторыкаў. Гістарычная навука стала цікавіцца не толькі палітычнай і эканамічнай гісторыяй, але і нетрадыцыйнымі для яе тэмамі: святамі, міфамі, выхаваннем дзяцей, рамёствамі, мастацтвам і г.д. Пашырыліся міждысцыплінарныя даследаванні, з'явіліся новыя напрамкі гістарычнай навукі. Таму спецыяліст-гісторык павінен навучыцца шукаць і апрацоўваць тыя віды крыніц, якія дадуць найбольшы аб'ём інфармацыі па канкрэтнай праблеме, а таксама ітэрпрэтаваць атрыманыя веды ў адпаведнасці з сучасным узроўнем гістарычнай навукі.

На жаль, сёння ў распараджэнні студэнтаў вельмі мала падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, якія б дазволілі стварыць цэльнае ўяўленне аб крыніцазнаўстве як вучэбнай дысцыпліне. Даць пачатковыя сістэмныя веды аб крыніцазнаўстве і гістарычнай крыніцы як прадмеце крыніцазнаўства – менавіта такая мэта ставіцца ў прапануемым вучэбна-метадычным комплексе.

Дадзены вучэбна-метадычны коплекс пабудаваны па модульнаму прынцыпу. Мэтай курса з'яўляецца павышэнне якасці і эфектыўнасці пазнавальна-навучальнай дзейнасці студэнтаў. У ВМК змешчаны вучэбная праграма лекцыйнага і практычнага курса студэнтаў, а таксама вучэбна-метадычная карта дысцыпліны. Асноўную частку складаюць вучэбныя модулі па дысцыпліне. Такіх модуляў восем. Складаючымі часткамі кожнага модуля з'яўляюцца: змест праграмы па асобных тэмах, вучэбны

матэрыял, план практычнага занятка (уключае план семінара па тэме, спіс рэфератаў, кантрольныя заданні). Модулі адпавядаюць тэмам вучэбнай праграмы па курсу “Крыніцазнаўства” для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных установ. Модулі звязаны паміж сабой лагічна, таму студэнтам не варта пераходзіць да наступнага модуля не засвоіўшы папярэдні. Схема працы па модулях можа выглядаць наступным чынам:

М-1 → М-2 → М-3 → М-4 → М-5 → М-6 → М-7 → М-8

Абавязковай умовай працы па модулю з’яўляецца карыстанне дадатковай літаратурай, акрамя вучэбнага тэкста модуля. Кожны модуль мае спіс рэкамендаванай літаратуры. Кантрольныя заданні (і тэмы рэфератаў) складзены так, што іх выкананне вымушае студэнта звярнуцца да канкрэтных кніг. Разам з тым, прапанаваны вучэбны матэрыял дае магчымасць студэнту арыентавацца ў тэме. У тэксце вучэбнага матэрыяла адметным шрыфтам вылучаны асобныя паняцці, імёны, даты, якія з’яўляюцца абавязковымі для засваення па канкрэтнай тэме.

У канцы ВМК змешчаны пытанні да экзамена, тэмы для кантрольных работ студэнтаў завочнай формы навучання, кароткі тэрміналагічны слоўнік. Тэмы кантрольных работ для завочнікаў складзены так, што ахопліваюць розныя раздзелы курса, што дазволіць пракантраляваць самастойнае вывучэнне студэнтамі матэрыяла. Паслядоўная праца студэнтаў па модулях ВМК, выкананне імі ўсіх заданняў і патрабаванняў дазволіць з лёгкасцю засвоіць курс і атрымаць трывалыя веды, якія студэнты могуць выкарыстаць у працы з гістарычнымі крыніцамі пры напісанні студэнцкіх дыпломных і курсавых работ.

# РАБОЧАЯ ПРАГРАМА

## Мэты і задачы дысцыпліны

**Мэта курса** – засваенне студэнтамі ведаў аб агульных крыніцах і метадах вывучэння гістарычных крыніц. Тэарэтычнае крыніцазнаўства служыць фундаментам для вывучэння «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі» і іншых асноўных і спецыяльных гістарычных курсаў.

**Задачы курса:**

– Даць студэнтам разуменне, што такое гістарычная крыніца і якая яе прырода;
– Прасачыць асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны;
– Пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі прыёмамі пошуку, класіфікацыі, сістэматызацыі і крытыкі крыніц;
– Навучыць студэнтаў выкарыстоўваць асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц.

## Віды заняткаў і формы кантроля ведаў

| Віды заняткаў, формы кантроля ведаў | Дзённая форма | Завочная форма |
|---|---|---|
| Курс | 2 | 3 |
| Сяместр | 3 | 5 |
| Лекцыі, гадзіны | 18 | 4 |
| Экзамен (сяместр) | 3 | 5 |
| Залік (сяместр) | – | – |
| Практычныя (семінарскія), гадзіны | 18 | 4 |
| Лабараторныя заняткі (гадзіны) | – | – |
| Кантрольныя работы (сяместр) | – | 5 |
| Курсавая работа (сяместр/гадзіны) | – | – |
| Кіруемая самастойная работа студэнтаў (гадзіны) | 4 | – |

## Вучэбная праграма дысцыпліны

Лекцыйны курс

| Назвы раздзелаў і тэм лекцый, іх змест | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Дзённая форма | | Завочная форма | |
| | П | С | П | С |
| **Тэма 1. Прадмет і змест крыніцазнаўства.**<br>**Вызначэнне гістарычнай крыніцы**<br>**1. Крыніцазнаўства ў сістэме гуманітарных навук.** Гістарычная навука і крыніцазнаўства. Аб'ект і прадмет крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца і гістарычны дапаможнік. Гістарычны факт і крыніца. Месца крыніцазнаўства ў сістэме навук: архівазнаўства, музеязнаўства, бібліяграфіі, інфарматыкі. Методыка і метадалогія крыніцазнаўства. Тэарэтычнае і прыкладное крыніцазнаўства. Крыніцазнаўства гісторыі і іншых навук, іх суадносіны. Гістарычная крыніца як аснова вызначэння міждысцыплінарнага сінтэзу. Метады гістарычнай навукі. Метадалогія і крыніцазнаўства.<br>**2. Прырода гістарычнай крыніцы.** Крыніца – адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага. Геаграфічнае асяроддзе як спецыфічная крыніца аб мінулым. Пазнавальная функцыя гістарычнай крыніцы. Крыніца і гістарычная свядомасць грамадства.<br>**3. Гістарычная крыніца і дапаможнік.** Археалагічныя крыніцы. Музейны экспанат. Вызначэнне «гістарыяграфічнай крыніцы». | 2 | – | 1 | – |
| **Тэма 2. Гісторыя крыніцазнаўства**<br>**1. Перадумовы зараджэння крыніцазнаўства як навукі.** Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных аўтараў. Гістарычная крыніца ў творах сярэдневякоўя. Ідэі Адраджэння і станаўленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц.<br>**2. Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства ў новы час.** Крытыка тэкстаў гістарычных крыніц Італіі. Выданні крыніц у Францыі, Англіі, Германіі. Зараджэнне расійскай школы крыніцазнаўства. Развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай імперыі. Назапашванне практычнага вопыту работы з крыніцамі па гісторыі феадалізму. Неабходнасць асэнсавання гістарычных крыніц у канцы XIX – пачатку XX ст. Распрацоўка тэорыі і методыкі гістарычнага крыніцазнаўства. Стварэнне першых навучальных дапаможнікаў і манаграфій па пытаннях крыніцазнаўства. Ш.-В. Ланглуа, Ш. Сеньабос, В. В. Ключэўскі. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства. А. С. Лаппо-Данілеўскі.<br>**3.Развіццё крыніцазнаўства ў навейшы час.** Дыскусіі аб сутнасці гісторыі і ролі гістарычных крыніц. М. Блок. Распрацоўка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі. С. О. Шміт, В. М. Медушэўская і інш. Колькасныя метады вывучэння крыніц І. Д. Кавальчанка. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. Дз. І. Даўгяла, У. І. Пічэта, М. М. Улашчык і інш. | 2 | – | – | – |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Тэма 3. Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц**<br>**1. Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты.** Крытэрыі класіфікацыі. Класіфікацыя і сістэматызацыя. Віды сістэматызацыі. Паняцці «тып» і «від» у класіфікацыі, іх суадносіны. Спробы класіфікацыі гістарычных крыніц на «рэшткі» і «паданні».<br>**2. Фіксаваная і нефіксаваная сацыяльная інфармацыя.** Падзел крыніц паводле спосабу фіксавання інфармацыі на рэчавыя, пісьмовыя, вусныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, фотакінадакументы, фонадакументы. Адлюстраванне ў крыніцы фіксаванай інфармацыі. Класіфікацыя крыніц, іх паходжання і віда.<br>**3. Падзел крыніц паводле форм адлюстравання рэчаіснасці.** Рэчавыя, пісьмовыя, фанічныя, выяўленчыя (выяўленча-графічныя, выяўленча-мастацкія, выяўленча-натуральныя) крыніцы. «Вусная гісторыя» і яе крыніцы.<br>**4. Тыпалагічныя класіфікацыі ў залежнасці ад знешніх прыкмет крыніц.** Класіфікацыя С. О. Шмідта. Падзел крыніц на рэчавыя, выяўленчыя, моўныя, канвенцыянальныя, крыніцы паводзін і гукавыя (аўдыяльныя).<br>**5. Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі.** Класіфікацыя пісьмовых крыніц. Дакументальныя і апавядальныя крыніцы, іх асноўныя віды.<br>**6. Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы.** Зараджэнне і станаўленне заканадаўства. Заканадаўства новага часу (XVI – пачатак XX ст.). Заканадаўства навейшага часу. Аналіз заканадаўчых дакументаў.<br>**7. Акты як гістарычныя крыніцы.** Вызначэнне. Асноўныя віды. Методыка вывучэння актаў.<br>**8. Справаводчыя матэрыялы як гістарычная крыніца.** Вызначэнне. Асноўныя рысы статыстычных крыніц і прынцыпы выкарыстання. Асноўныя стадыі фарміравання статыстычных крыніц.<br>**9. Апавядальныя крыніцы.** Агульная характарыстыка.<br>**10. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы.** Тэрміналогія летапісання. Асноўныя асаблівасці вывучэння і этапы развіцця летапісання.<br>**11. Мемуары.** Вызначэнне. Асноўныя віды мемуарнай літаратуры і іх вывучэнне.<br>**12. Эпісталярныя крыніцы.** Агульная характарыстыка. Вывучэнне эпісталярнага комплексу.<br>**13. Літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.** Вызначэнне, асноўныя этапы. Асаблівасці жанру мастацкай літаратуры.<br>**14. Перыядычны друк як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц.** | **4** | **–** | **1** | **–** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Тэма 4. Крыніцазнаўчая эўрыстыка**<br>**1. Пошук гістарычных крыніц.** Задача эўрыстыкі. Выяўленне і адбор.<br>**2. Пошук апублікаваных крыніц.** Звесткі аб публікацыях гістарычных крыніц. Перавагі і недахопы публікацыі. Гістарычная бібліяграфія.<br>**3. Выяўленне крыніц у архівах.** Элементы выпадковасці ў іх пошуку. Падрыхтоўчая работа да наведвання архіваў. Складанне спісаў архіваў, фондаў, фондаўтваральнікаў. Вывучэнне навукова-даведачнага апарату архіваў, вопісаў фондаў. Вывучэнне спраў. Пошук і сістэматызацыя крыніц. Складанне і збор рабочых матэрыялаў для афармлення работы. | **2** | – | – | – |
| **Тэма 5. Гістарычная крытыка крыніц**<br>**1. Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі.** Агульная характарыстыка.<br>**2. Устанаўленне тэксту.** Прачытанне і асэнсаванне зместу тэксту. Значэнне кантэксту для разумення граматычных норм і лексічнага зместу крыніцы. Гісторыя тэксту, задачы яе вывучэння. Паняцце рэдакцыі, спісу, ізводу. Інтэрпаляцыі і глосы. Этапы стварэння дакументаў: чарнавікі, белавікі, копіі. Аднаўленне арыгінала паводле тэксту ў некалькіх спісах, ізводах, рэдакцыях. Рэканструкцыя тэкстаў.<br>**3. Вывучэнне паходжання тэксту.** Агульная характарыстыка.<br>**4. Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы.** Паняцці «каляндар», «эра». Аналіз непасрэднай і ўскоснай інфармацыі аб часе. Сінтэз інфармацыі аб часе. Адлік часу ад вядомай падзеі. Вывучэнне формы дакумента. Дапасаванне звестак з іншых крыніц.<br>**5. Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.** Выкарыстанне дадзеных гістарычнай геаграфіі. Спалучэнне звестак графічных і пісьмовых помнікаў. Аналіз непасрэднай і ўскоснай прасторавай інфармацыі, яе сінтэз. Тапонімы і мікратапонімы, этнонімы і інш.<br>**6. Атрыбуцыя.** Улік непасрэдных звестак. Прозвішча, імя, мянушка. Раскрыццё крыптонімаў, псеўданімаў. Ананімныя крыніцы і іх атрыбуцыя. Новыя метады ўстанаўлення аўтарства з выкарыстаннем колькасных метадаў і інфармацыйных тэхналогій.<br>**7. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы, яе адрозненне ад граматычнага прачытання тэксту.** Гістарызмы, архаізмы, тлумачэнне паняццяў. Тэрміналагічны аналіз. Вытлумачэнне заканадаўчых крыніц. Выкарыстанне юрыдычнай тэрміналогіі. Вытлумачэнне актаў. Склад актавага фармуляра. Вытлумачэнне апавядальных крыніц. Вывучэнне непасрэднага зместу тэксту, алегорый, іншаказанняў. Веданне канкрэтных гістарычных абставін стварэння крыніцы.<br>**8. Выяўленне падложных і падробных крыніц.** Магчымыя мэты іх стварэння. Спосабы выяўлення інтэлектуальнага падлогу.<br>**9. Асаблівасці вывучэння рэчавых крыніц.** Прымяненне метадаў іншых навук. | **4** | – | **1** | – |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **10. Вывучэнне інфармацыі гістарычнай крыніцы.** Мэты і задачы ўнутранай крытыкі крыніц. Паняцце аб верагоднасці. Паўната і дакладнасць інфармацыі.<br>Метады выяўлення навуковай каштоўнасці розных відаў пісьмовых крыніц. Крыніца і гістарычны кантэкст.<br>**11. Вывучэнне ўплыву ўмоў, у якіх узнікае інфармацыя, на яе паўнату і дакладнасць.** Аналіз сведчанняў, што заснаваны на асабістым назіранні. Крытыка звестак, якія атрыманы з іншых крыніц і абагульненняў. Вызначэнне сацыяльных, палітычных і групавых пазіцый аўтара, іх уплыў на змешчаную ў крыніцы інфармацыю. Метады канчатковага ўстанаўлення каштоўнасці інфармацыі: праверка паўнаты, верагоднасці і дакладнасці інфармацыі адпаведнай крыніцы.<br>**12. Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы.** Сінтэз гістарычнай інфармацыі, яго сутнасць і мэты. Супастаўленне звестак, атрыманых на этапе ўнутранай і знешняй крытыкі. Вызначэнне ўзаемасувязі і ўзаемаўплываў. Пабудова генеалагічнага раду крыніц. Паняцце рэпрэзентатыўнасці. | | | | |
| **Тэма 6. Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц**<br>**1. Агульная характарыстыка метадаў даследавання гістарычных крыніц.** Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А. С. Лапо-Данілеўскага і І. Д. Кавальчанка. Выкарыстанне агульнанавуковых метадаў у крыніцазнаўстве. Аналіз, сінтэз, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага, метад класавага аналізу, індукцыя, дэдукцыя.<br>**2. Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц** – гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны.<br>**3. Інавацыйныя метады даследавання крыніц.** Неабходнасць у павышэнні інфарматыўнасці крыніц. Крыніца ў свеце тэорыі інфармацыі. Выкарыстанне ў крыніцазнаўстве колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій. Масавыя крыніцы і метады іх апрацоўкі.<br>**4. Магчымасці і абмежаванні выкарыстання колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц.** Мадэліраванне аўтарскага стылю і вызначэнне складанага характару тэксту крыніцы. Інфармацыйны пошук лакун, купюр, інкарпарацый, экстрапаляцый і пазнейшых уставак.<br>**5. Метады семіётыкі пры вывучэнні гістарычных крыніц.** Знакі і сімвалы як аб'екты вывучэння семіётыкі. Даследаванне культурных кодаў і камунікатыўных сістэм навукоўца-гісторыка і аўтараў крыніц. Вызначэнне дыскурсаў у тэкстах крыніц. Выкарыстанне метаду дэканструкцыі.<br>**6. Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц.** Выкарыстанне дасягненняў гістарычнай псіхалогіі і псіхагісторыі ў даследаванні крыніц. | **4** | **–** | **1** | **–** |
| **Усяго** | **18** | **–** | **4** | **–** |

Практычныя заняткі

| Назва тэм практычных заняткаў і іх змест | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|
| | Дзённая форма | Завочная форма |
| **Тэма 1. Прадмет і змест крыніцазнаўства**<br>1. Крыніцазнаўства як гуманітарная навука. Прадмет і аб’ект крыніцазнаўства.<br>2. Паняцці “гістарычная крыніца”, “гістарычны факт”, “гістарычны дапаможнік” і іх суадносіны.<br>3. Методыка і метадалогія, тэарэтычны і прыкладны ўзроўні крыніцазнаўства.<br>4. Месца крыніцазнаўства ў сістэме іншых навук. | 2 | 1 |
| **Тэма 2. Вызначэнне гістарычнай крыніцы**<br>1. Крыніца – адзінства аб’ектыўнага і суб’ектыўнага.<br>2. Пазнавальная функцыя гістарычнай крыніцы.<br>3. Сацыяльная прырода гістарычнай крыніцы.<br>4. Тэарэтыка-метадалагічны і канкрэтна-гістарычны аспекты крыніцазнаўчага даследавання. | 2 | |
| **Тэма 3. Гісторыя крыніцазнаўства.**<br>1. Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных і сярэднявечных аўтараў.<br>2. Станаўленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц у эпоху Адраджэння.<br>3. Зараджэнне і развіццё расійскай школы крыніца-знаўства.<br>4. Распрацоўка методыкі гістарычнага даследавання: Ш.-В. Ланглуа і Ш. Сеньабос, Э. Бернгейм і інш.<br>5. Крыніцазнаўства як цэласнае і сістэматызаванае вучэнне ў канцэпцыі А. С. Лапо-Данілеўскага.<br>6. Погляды прадстаўнікоў школы «Аналаў» М. Блока і Л. Феўра на метады гістарычнага даследавання.<br>7. Распрацоўка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі: С. О. Шміт, В. М. Медушэўская і інш.<br>8. Колькасныя метады вывучэння крыніц І. Д. Каваль-чанка.<br>9. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі: Дз. І. Даўгяла, У. І. Пічэта, М. М. Улашчык і інш.<br>10. Сучасны стан развіцця крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. | 4 | – |
| **Тэма 4. Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц**<br>1. Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты.<br>2. Класіфікацыя крыніц паводле іх паходжання і віда.<br>3. Класіфікацыя С. О. Шмідта.<br>4. Класіфікацыя пісьмовых крыніц. | 2 | – |
| **Тэма 5. Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі**<br>1. Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы.<br>2. Справаводчыя матэрыялы як гістарычная крыніца.<br>3. Апавядальныя крыніцы. | 2 | 1 |

| | | |
|---|---|---|
| 4. Мемуарныя і эпісталярныя крыніцы.<br>5. Літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.<br>6. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы. | | |
| **Тэма 6. Крыніцазнаўчая эўрыстыка**<br>1. Задачы гістарычнай эўрыстыкі.<br>2. Пошук апублікаваных крыніц.<br>3. Выяўленне крыніц у архівах. | 2 | |
| **Тэма 7. Гістарычная крытыка крыніц.**<br>1. Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі.<br>2. Этапы стварэння дакументаў.<br>3. Рэканструкцыя тэкстаў.<br>4. Вывучэнне паходжання тэксту.<br>5. Аналіз і сінтэз непасрэднай і ўскоснай інфармацыі аб часе стварэння крыніцы.<br>6. Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.<br>7. Атрыбуцыя.<br>8. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.<br>9. Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы. | 2 | 1 |
| **Тэма 8. Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц.**<br>1. Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А. С. Лапо-Данілеўскага і І. Д. Кавальчанка.<br>2. Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц.<br>3. Інавацыйныя метады даследавання крыніц.<br>4. Выкарыстанне колькасных метадаў і інфармацыйных (камп’ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц.<br>5. Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц. | 2 | 1 |
| **Усяго:** | **18** | **4** |

## Вучэбна-метадычныя матэрыялы па дысцыпліне:

1. Грицкевич, В. П., Каун, С. Б., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. – Мн., 2000.

2. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учеб. пособие // И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. – М., 1998.

3. Каун, С. Б., Липницкая, О. Л., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения: учеб.-метод. комплекс / С. Б. Каун, О. Л. Липницкая, С. Н. Ходин. – Мн., 2001.

4. Пронштейн, А. П., Задера, А. Г. Методика работы над историческими источниками. учеб.-метод. пособие / А. П. Пронштейн, А. Г. Задера. – М., 1977.

5. Пронштейн, А. П. Методика исторического источниковедения / А. П. Пронштейн. – Ростов н/Д, 1976.

## Дадатковая літаратура
## Прадмет і змест крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы

6. Беленький, И. Л. Разработка проблем теоретического источниковедения в исторической науке (1969 – 1983) / И. Л. Беленький. – М., 1983.

7. Борисенков, Е. П. Климат и деятельность человека / Е. П. Борисенков. – М., 1982.

8. Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання // Матэрыялы да Міжнар. навук.-практычнай канф., прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты. – Мн., 1998.

9. Иванов, Г. М. Исторический источник и историческое познание / Г. М. Иванов. – Томск, 1973.

10. Иванов, Г. М. О социальной природе исторического источника // Труды. Томского гос. ун-та. Т. 11. / Г. М. Иванов. – Томск, С. 73 – 85.

11. Иванов, Г. М., Коршунов, А. М., Петров, Ю. В. Методические проблемы исторического познания / Г. М. Иванов, А. М. Коршунов, Ю. В. Петров. – М., 1981.

12. Источниковедение истории СССР / под ред. И. Д. Ковальченко. – М., 1981. С. 5 – 7.

13. Клейн, Л. С. Археологические источники / Л. С. Клейн. – Л., 1978.

14. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – М., 1987.

15. Медушевская, О. М. Современное зарубежное источниковедение / О. М. Медушевская. – М., 1983.

16. Проблемы устной истории СССР (тезисы научной конференции). – Киев, 1990.

17. Пронштейн, А. П., Данилевский, И. Н. Вопросы теории и методики исторического исследования / А. П. Пронштейн, И. Н. Данилевский. – М., 1986.

18. Фарсобин, В. В. Источниковедение и его метод / В. В. Фарсобин. – М., 1983.

19. Шмидт, С. О. Путь историка: избр. тр. по источниковедению и историографии / С. О. Шмидт. – М., 1997.

20. Шмидт, С. О. Современные проблемы источниковедения // Источниковедение. Теорет. и методологические проблемы. – М., 1969.

21. Шмидт, С. О. Проблема взаимодействия общества и природы и некоторые вопросы источниковедения // Общество и природа. – М., 1981.

## Гісторыя крыніцазнаўства

22. Аксенов, А. И. Генеалогия // Вопр. истории. – 1972. – № 10.

23. Археалогія і нумізматыка Беларусі. – Мн., 1993.

23. Богданов, А. П. Филиграноведение вчера и сегодня // История и палеография: сб. статей. – М., 1993. Ч. 2. С. 302 – 432.

24. Генеалогия: источники, проблемы, методы исследования. – М., 1989.

25. Добиаш-Рождественская, О. А. История письма в средние века: руководство к изучению латинской палеографии / О. А. Добиаш-Рождественская. – М., 1987.

26. Историческое краеведение Белоруссии. – Мн., 1980. С. 201 – 213.

27. Каменцева, Е. И., Устюгов, Н. В. Русская сфрагистика и геральдика / Е. И. Каменцева, Н. В. Устюгов. – М., 1963.

28. Каштанов, С. М. Очерки русской дипломатики / С. М. Каштанов. – М., 1970.

29. Каштанов, С. М. Русская дипломатика / С. М. Каштанов. – М., 1988.

30. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларуская палеаграфія: навуч. дапам. / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Гродна, 1996.

31. Люблинская, А. Д. Латинская палеография / А. Д. Люблинская. – М., 1969.

32. Медушевская, О. М. О проблемах генеалогии // Советские архивы. – 1989. – № 6.

33. Музееведение. Музеи исторического профиля. – М., 1988.

34. Нарбут, А. Н. Генеалогия Белоруссии / А. Н. Нарбут. – М., 1994. Вып. 2. – М., 1995. Вып. 1.

35. Наш радавод. Кн. 5. Ч. 1. – Гродна, 1993.

36. Рейсер, С. А. Русская палеография нового времени / С. А. Рейсер. – М., 1982.

37. Рябцевич, В. Н. Нумизматика Беларуси / В. Н. Рябцевич. – Мн., 1995.

38. Скурат, К. Даўнія беларускія меры / К. Скурат. – Мн., 1974.

39. Тихомиров, М. Н., Муравьев, А. В. Русская палеография / М. Н. Тихомиров, А. В. Муравьев. – М., 1982.

40. Фарсобин, В. В. О предмете дипломатики и ее соотношении с источниковедением // Вопр. истории. – 1978. – № 1.

41. Хорошкевич, А. Л. Печати полоцких грамот XIV – XV вв. // Вспомогательные ист. науки. Кн. 4. – Л., 1972.

42. Цітоў, А. К. Геральдыка беларускіх месцаў / А. К. Цітоў. – Мн., 1998.

43. Цітоў, А. К. Пячаткі старажытнай Беларусі / А. К. Цітоў. – Мн., 1993.

44. Шкуратов, И. А. Историческая психология / И. А. Шкуратов. – М., 1997.

45. Щепкин, В. М. Учебник русской палеографии / В. М. Щепкин. – М., 1967.

## Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц

46. Евграфов, Е. М. Кинофотодокументы как исторический источник / Е. М. Евграфов. – М., 1973.

47. Каштанов, С. М. Русская дипломатика / С. М. Каштанов. – М., 1988.

48. Лаппо-Данилевский, А. С. Методология истории / А. С. Лаппо-Данилевский. – СПб., 1910 – 1913. Вып. 1 – 2.

49. Пушкарев, Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории / Л. Н. Пушкарев. – М., 1975.

50. Шмидт, С. О. Путь историка: избр. тр. по источниковедению и историографии / С. О. Шмидт. – М., 1997.

## Крыніцазнаўчая эўрыстыка

51. Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм. – Мн., 1969.

52. Воронин, Ю. А. Введение в теорию классификации / Ю. А. Воронин. – Новосибирск, 1982.

53. Глобальная сеть Internet в информационном обеспечении исторических исследований и образования // Е. Б. Белова, Л. И. Бородкин, И. М. Гарскова и др. Ист. информатика. – М., 1996. – С. 369 – 373.

54. Государственные архивы СССР: справ. : В 2 ч. – М., 1989.

55. Дакументы па гісторыі Беларусі, якія зберагаюцца ў Цэнтральных архівах СССР. – Мн., 1991.

56. Доорн, П. Электронный лабиринт: возможности и «ловушки» компьютерной системы INTERNET для историков // Круг идей: развитие исторической информатики. Тр. II конф. Ассоциации «История и компьютер». – М., 1995. – С. 122 – 135.

57. Каралёў, Г. І. Польскія публікацыі царкоўна-гістарычных крыніц у XIX – XX ст. // Наш радавод. Кн. 4. Ч. 3. – Гродна, 1992. – С. 184 – 190.

58. Каталог сборников документов, изданных архивными учреждениями СССР. 1917 – 1960. – М., 1961.

59. Леонтьева Т. Е. Документальные материалы фонда князей Радзивиллов как исторический источник // Вопр. архивоведения и источниковедения в БССР. – Мн., 1971. С. 320 – 328.

60. Сокольчик, А. А. Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768 – 1917 гг.) : библиогр. указатель / А. А. Сокольчик. – Мн., 1976.

61. Правила издания исторических документов. – М. : , 1969.

62. Пушкин, В. Н. Эвристика – наука о творческом мышлении. – М., 1967.

63. Суслова, Е. Н. Поиск архивных документов / Е. Н. Суслова. – Л., 1987.

64. Улащик, Н. Н. Очерки по источниковедению и археографии истории Беларуси феодального периода / Н. Н. Улащик. – Мн., 1973.

65. Федотов, В. В. Техника и организация умственного труда / В. В. Федотов. – Мн., 1983.

66. Ходаковский, И. И. Организация поиска источников и литературы в источниковедческом исследовании: учеб. пособие / И. И. Ходаковский. – М., 1976.

67. Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР в г. Гродно: путеводитель. – Мн., 1956.

68. Центральный государственный исторический архив БССР в г. Минске: путеводитель. – Мн., 1974.

### Гістарычная крытыка крыніц

69. Бережков, Н. Г. Хронология русского летоисчисления // Проблемы источниковедения. – 1958. – Вып. 6.

70. Берков, П. Н. Введение в технику литературоведческого исследования. Источниковедение. Библиография. Разыскания / П. Н. Берков. – Л., 1955.

71. Бикерман, Э. Хронология древнего мира / Э. Берман. – М., 1975.

72. Борисенков, Е. П., Пасецкий, В. М. Экстремальные явления в русских летописях XI – XVII вв. / Е. П. Борисенков, В. М. Пасецкий – Л., 1983.

73. Виноградов, В. В. Проблемы авторства и теория стилей / В. В. Виноградов. – М., 1961.

74. Горбачевский, Н. Краткия таблицы, необходимые для истории, хронологии, вообще для всякого рода археологических исследований / Н. Горбачевский. – Вильна, 1867.

75. Ермолаев, И. П. Историческая хронология / И. П. Ермолаев. – Казань, 1980.

76. Ефременков, Э. Л. Раскрытие авторства на основе анализа идейного содержания произведений // Вопр. текстологии. Вып. 2. – М., 1960.

77. Жучкевич, В. А. Общая топонимика / В. А. Жучкевич. – Мн., 1980.

78. Жучкевич, В. А. Топонимика Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Мн., 1968.

79. Каменцева, Е. И. Хронология / Е. И. Каменцева. – М., 1982.

80. Климишин, И. А. Календарь и хронология / И. А. Климишин. – М., 1985.

81. Историческая география СССР // И. Д. Ковальченко и др. – М., 1973.

82. Лихачев, Д. С. Вопросы атрибуции произведений древнерусской литературы // Тр. Отдела древнерусской литературы АН СССР. Ин-т литературы. Т. 17. – М.; Л., 1961.

83. Лихачев, Д. С. Текстология / Д. С. Лихачев. – М., 1983.

84. Максаковский, В. П. Историческая география мира / В. П. Максаковский. – М., 1997.

85. Нечкина, М. В. Кто автор «Записок» Н. И. Горбачевского? // Ист. зап. Т. 54. – М., 1955.

86. Носовский, Г. В., Фоменко, А. Г. Новая хронология и концепция древней истории Руси, Англии, Рима. Факты, гипотезы. Т. 1. Русь / Г. В. Носовский, А. Г. Фоменко. – М., 1995.

87. О принципах определения авторства в связи с общими проблемами теории и истории литературы. – Л., 1960.

88. От Нестора до Фонвизина: Новые методы определения авторства / под ред. Л. В. Милова. – М., 1994.

89. Пиотровский, Р. Г. Анонимные произведения и их авторы / Р. Г. Пиотровский. – Мн., 1988.

90. Пронштейн, А. П., Кияшко, В. Я. Хронология / А. П. Пронштейн, В. Я. Кияшко. – М., 1981.

91. Рейсер, С. А. Основы текстологии / С. А. Рейсер. – Л., 1978.
92. Рыбаков, Б. А. Петр Бориславич: Поиск автора «Слова о полку Игореве» / Б. А. Рыбаков. – М., 1997.
93. Рылюк, Г. Я. Истоки географических названий Беларуси (с основами общей топонимики) / Г. Я. Рылюк. – Мн., 1997.
94. Святский, Д. О. Астрономические явления в русских летописях с научно-критической точки зрения / Д. О. Святский. – Пг., 1915.
95. Статистика текста. – Мн., 1969.
96. Хавский, П. В. Взгляд на хронологию еврейскую, христианскую вообще и русскую в особенности. – СПб., 1849.
97. Ходзін, С. М. Летапісанне на Беларусі // Бел. гіст. часоп. – 1997. – № 2. – С. 81 – 82.
98. Хронология Российской истории: Энцикл. справ. – М., 1994.
99. Цыб, С. В. Древнерусское времяисчисление в «Повести временных лет» / С. В. Цыб. – Барнаул, 1995.
100. Черепнин, Л. В. Повесть временных лет, ее редакции и предшествующие ей летописные своды // Исторические записки. Т. 25 – 27. – М., 1948.
101. Черепнин, Л. В. Русская хронология / Л. В. Черепнин. – М., 1944.
102. Шахматов, А. А. Обозрение русских летописных сводов XIV – XVI вв. / А. А. Шахматов – М., 1972.
103. Щербиновский, Н. С. Сезонные явления в природе / Н. С. Щербиновский. – М., 1966.

## Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц

104. Бородкин, Л. И., Милов, Л. В., Морозова, Л. Е. К вопросу о формальном анализе авторских особенностей стиля в произведениях Древней Руси // Математические методы в историко-экономических и историко-культурных исследованиях. – М., 1977. – С. 298 – 326.
105. Бородкин, Л. И., Милов, Л. В. О некоторых аспектах автоматизации текстологических исследований (Закон Судный людем) // Математические методы в историко-экономических и историко-культурных исследованиях. – М., 1977. – С. 235 – 280.
106. Бородкин, Л. И. Многомерный статистический анализ в исторических исследованиях / Л. И. Бородкин. – М., 1986.

107. Буховец, О. Г. Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи начала XX века: новые материалы, методы, результаты / О. Г. Буховец. – М., 1996.

108. Ковальченко, И. Д. Исторический источник в свете учения об информации (к постановке проблемы) // История СССР. – 1982. – № 3. – С. 129 – 148.

109. Количественные методы в исторических исследованиях / под ред. И. Д. Ковальченко. – М., 1984.

110. Липницкая, О. Л., Кудряшов, В. Е. Компьютерное источниковедение в Беларуси: некоторые итоги и проблемы // Информ. бюллетень ассоциации «История и компьютер». – 1997. – № 21. – С. 167 – 171.

111. Моисеенко, Т., Свищев, М. Изучение аграрной России последних десятилетий: перспективы «компьютерного источниковедения» // История и компьютер: Новые информационные технологии в исторических исследованиях и образовании. – Геттинген, 1993. – С. 151 – 167.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № тыдня | № тэмы | Назва пытанняў, якія вывучаюцца на лекцыях | Занятки (нумары) | | Нагляд. і метадыч. сродкі навучання | Кіруемая самастойная работа студэнта | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | семінары | лабар. | | змест | гадзіны | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1, 2 | 1 | 1. Крыніцазнаўства ў сістэме гуманітарных навук.<br>2. Прырода гістарычнай крыніцы.<br>3. Гістарычная крыніца і дапаможнік. | 1 | – | 1 – 5;<br>6 – 21 | | | Апытанне |
| 3, 4 | 2 | 1. Перадумовы зараджэн-ня крыніцазнаўства як навукі.<br>2. Асноўныя этапы раз-віцця крыніцазнаўства ў новы час.<br>3. Развіццё крыніцазнаў-ства ў найноўшы час. | 2 | – | 1 – 5;<br>22 – 45 | 1. Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных аўтараў.<br>2. Гістарычная крыніца ў творах сярэдневякоўя.<br>3. Ідэі Адраджэння і станаў-ленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц. | 2 | Апытанне |
| 5, 6 | 2 | 1. Класіфікацыя, яе сут-насць і мэты.<br>2. Фіксаваная і нефіксава-ная сацыяльная інфарма-цыя. | 3 | | 1 – 5;<br>46 – 50;<br>51 – 69;<br>105 – 112 | 1. Паняцці «тып» і «від» у класіфікацыі, іх суадносіны.<br>2. Спробы класіфікацыі гістарычных крыніц на «рэшткі» і «паданні». | 2 | Тэставае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 3. Падзел крыніц паводле форм адлюстравання рэчаіснасці.<br>4. Тыпалагічныя класіфікацыі ў залежнасці ад знешніх прыкмет крыніц.<br>5. Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі.<br>6. Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы. | | | | 3.«Вусная гісторыя» і яе крыніцы.<br>4. Класіфікацыя С.О. Шмідта.<br>5. Класіфікацыя пісьмовых крыніц.<br>6. Класіфікацыя Л. Пушкарова і А. Пранштэйна. | | |
| 7, 8 | 3 | 1. Акты як гістарычныя крыніцы.<br>2. Справаводчыя матэрыялы як гістарычная крыніца.<br>3. Апавядальныя крыніцы.<br>4. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы.<br>5. Мемуары.<br>6. Эпісталярныя крыніцы.<br>7. Перыядычны друк як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц. | 3 | | 1 – 5; 47; 49; 50; 39; 36; 28; 77. | 1. Зараджэнне і станаўленне заканадаўства. 2. Заканадаўства новага часу (XVI – пачатак XX ст.).<br>3. Асаблівасці вывучэння і этапы развіцця летапісання.<br>4. Асаблівасці мастацкай літаратуры як крыніцы. | 2 | Апытанне |
| 9, 10 | 4 | 1. Пошук гістарычных крыніц.<br>2. Пошук апублікаваных крыніц.<br>3. Выяўленне крыніц у архівах. | 4 | | 51 – 69 | | | Апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 11, 12 | 5 | 1. Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі.<br>2. Устанаўленне тэксту крыніцы.<br>3. Вывучэнне паходжання тэксту.<br>4. Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы.<br>5. Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.<br>6. Атрыбуцыя. | 5 | | 70 – 104 | 1. Паняцце рэдакцыі, спісу, ізводу. Інтэрпаляцыі і глосы.<br>2. Этапы стварэння дакументаў: чарнавікі, белавікі, копіі.<br>3. Новыя метады ўстанаўлення аўтарства з выкарыстаннем колькасных метадаў і інфармацыйных тэхналогій.<br>4. Метады выяўлення навуковай каштоўнасці розных відаў пісьмовых крыніц. | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 13, 14 | 5 | 1. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы, яе адрозненне ад граматычнага прачытання тэксту.<br>2. Выяўленне падложных і падробных крыніц.<br>3. Асаблівасці вывучэння рэчавых крыніц.<br>4. Вывучэнне інфармацыі гістарычнай крыніцы.<br>5. Вывучэнне ўплыву ўмоў, у якіх узнікае інфармацыя, на яе паўнату і дакладнасць.<br>6. Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы. | 6 | | 105 – 112;<br>1 – 5 | | | Апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 15, 16 | 6 | 1. Агульная характарыстыка метадаў даследавання гістарычных крыніц.<br>2. Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц.<br>3. Інавацыйныя метады даследавання крыніц.<br>4. Магчымасці і абмежаванні выкарыстання колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц. | 7 | | 1 – 5;<br>105 – 112 | 1. Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А. С. Лапо-Данілеўскага.<br>2. Метадалогія крыніцазнаўства ў працах І. Д. Кавальчанка.<br>3. Выкарыстанне агульнанавуковых метадаў у крыніцазнаўстве.<br>4. Масавыя крыніцы і метады іх апрацоўкі. | 4 | Апытанне |
| 17, 18 | 6 | 1. Метады семіётыкі пры вывучэнні гістарычных крыніц.<br>2.Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц. | 8 | | 105 – 112;<br>16; 8; 6; 4 | 1. Выкарыстанне метаду дэканструкцыі пры аналізе крыніц.<br>2. Выкарыстанне дасягненняў гістарычнай псіхалогіі і псіхагісторыі ў даследаванні крыніц. | 2 | Апытанне |

# МОДУЛЬ 1
# ПРАДМЕТ І ЗМЕСТ КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

## Змест праграмы

**Крыніцазнаўства ў сістэме гуманітарных навук.** Гістарычная навука і крыніцазнаўства. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца і гістарычны дапаможнік. Гістарычны факт і крыніца. Месца крыніцазнаўства ў сістэме навук: архівазнаўства, музеязнаўства, бібліяграфіі, інфарматыкі. Методыка і метадалогія крыніцазнаўства. Метады гістарычнай навукі. Тэарэтычнае і прыкладное крыніцазнаўства. Крыніцазнаўства гісторыі і іншых навук, іх суадносіны. Гістарычная крыніца як аснова вызначэння міждысцыплінарнага сінтэзу.

## Вучэбны матэрыял

Сацыяльная рэальнасць уяўляе сабой складаную сістэму розных з’яў і працэсаў. Гэта сацыяльна-эканамічныя з’явы, палітычна-прававыя, грамадска-ідэалагічныя, мастацка-культурныя, маральна-этычныя, сацыяльна-псіхалагічныя і г.д. Працэс іх пазнання прывёў да з’яўлення асобных грамадска-гуманітарных навук, аб’ектам пазнання якіх з’яўляюцца пэўныя цэласныя кампаненты грамадскага развіцця. Такім чынам, асобныя гуманітарныя навукі маюць розныя аб’екты пазнання, а значыць, розныя спецыяльна-навуковыя і канкрэтна-праблемныя тэарэтыка-метадалагічныя асновы і метады пазнання. Напрыклад, для гістарычнай навукі аб’ектам пазнання з’яўляецца ўся сукупнасць з’яў грамадскага жыцця на працягу ўсёй гісторыі грамадства. Пазнанне ажыццяўляецца шляхам вывучэння гістарычных крыніц. Крыніцазнаўства дапамагае гісторыку інтэрпрэтаваць гістарычныя крыніцы ў суадносінах з сучасным узроўнем навукі. Прафесіянал-гісторык павінен валодаць такой тэарэтычна-пазнавальнай і практычнай сістэмай ведаў, якая б адкрывала яму шлях непасрэдна да першакрыніц сваёй праблемы – заканадаўчым актам, аўдыявізуальным крыніцам, філасофскім, літаратурным творам і г.д. Усё гэта аднachасова і творы культуры пэўнай эпохі і носьбіты сацыяльнай інфармацыі.[1] Любая гуманітарная навука звяртаецца да крыніц сацыяльнай інфармацыі, але робіць гэта зыходзячы са сваіх асаблівых пазнаваўчых мэтаў. Інфармацыйныя працэсы з’яўляюцца ўсеагульнай і арганічнай рысай усіх аспектаў

[1]Гл.: Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособие / И.Н. Данилевский, В.В. Кабанов, О.М, Медушевская, М.Ф. Румянцева. – М., 1998, с. 20 – 21; Медушевская О.М. Современное зарубежное источниковедение: учеб. пособие для студентов ист. факультетов вузов. – М., 1983, с. 7 – 9.

чалавечага жыцця.[2] **Крыніцазнаўства** – адна з навук, што здабываюць сацыяльную інфармацыю. Але яно распрацоўвае метады яе крытычнай праверкі, інтэрпрэтацыі. Таму для гісторыка гэта не толькі дапаможная гістарычная дысцыпліна, але і самастойная навука аб крыніцах, як захавальніках сацыяльнай інфармацыі.[3] Гістарычная навука не можа існаваць без вывучэння гістарычных крыніц. Спецыфіка гістарычнага пазнання заключаецца ў тым, што паміж аб'ектам вывучэння (гістарычнай рэальнасцю) і суб'ектам вывучэння (гісторыкам) знаходзіцца гістарычная крыніца. Крыніцазнаўства з'яўляецца той галіной, якая прадметам свайго вывучэння зрабіла менавіта крыніцы. У крыніцазнаўстве адрозніваюць паняцці *"гістарычная крыніца," "гістарычны факт," "гістарычны дапаможнік," "гістарычнае даследаванне."*

Факты складаюць змястоўную частку кожнай навукі. Так, гістарычныя факты складаюць змест гістарычнай навукі. Складанасць гістарычна-пазнавальнага працэса выклікае неабходнасць падзяляць паняцці гістарычнага факта і гістарычнай крыніцы.

Паняцце "**факт**" (ад лац. factum – дзеянне, падзея) выкарыстоўваецца ў розных сэнсах. Перш за ўсё, факт разумеецца як канкрэтная праява рэчаіснасці ў яе мінулым ці сучасным стане (г.зн. аб'ектыўная рэчаіснасць). Другі сэнс паняцця "факт" звязаны з працэсам навуковага пазнання. Факты разумеюцца тут як адлюстраванне ў свядомасці даследчыка рэчаіснасці.[4] Разуменне **гістарычнага факта** мае некалькі навуковых трактовак.[5]

*Пазітывісцкая* трактоўка атаясамляе факты аб'ектыўнай рэчаіснасці і факты гістарычнай навукі. Працэс гістарычнага пазнання ўяўляецца як працэс дакладнага ўзнаўлення гістарычных фактаў, зафіксаваных у крыніцах. Факты ўяўляюцца ў дадзенай трактоўцы як "цаглінкі," з якіх складаецца рэальнсць. Прырода кожнага гістарычнага факта можа быць адлюстравана пры дапамозе тлумачэння натуральных з'яў (біялагічных, дэмаграфічных, фізічных і г.д.). Таму паміж фактамі грамадскімі і прыроднымі няма прынцыповай розніцы і пазнанне сацыяльнай рэчаіснасці магчыма прыродазнаўчымі метадамі.

---

[2] Гл.: Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования. – 2-е изд., доп. – М., 2003, с. 127 – 134.

[3] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 118 – 120.

[4] Ковальченко И.Д., с. 141.

[5] Гл.: Методология истории: учеб. пособие для студентов / под ред. А.Н. Алпеева и др. – Мн., 1996, с. 88 – 99; Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / под общ. ред. В.Н.Сидорцова. – Мн., 2006., с. 165 – 170.

Другі напрамак у разуменні гістарычных фактаў называецца *суб'ектыўна-ідэалістычным*. Сутнасць падыхода ў супрацьпастаўленні гістарычных і прыродных фактаў. Факты прыродазнаўчага характару разглядаліся як пачуццёвае ўспрыняцце рэчаіснасці. Гістарычныя факты гісторык не можа непасрэдна адчуць, іх унутраны сэнс схаваны для даследчыка. Таму гісторык толькі можа надаваць фактам мінулага свой сэнс. Такім чынам, аб'ектыўная прырода гістарычных фактаў адмаўляецца і атрымоўваецца, што кожны гісторык піша "сваю" гісторыю. Такім чынам, "гісторый" столькі, колькі гісторыкаў.

Падыход *школы "Аналаў"* (М. Блок, Л. Феўр) абсалютызаваў магчымасці даследчыка ў адносінах да гістарычных фактаў. Прыхільнікі падыхода лічылі, што даследчык зможа пераадолець праблему абмежаванасці гістарычных крыніц шляхам пастаноўкі новых праблем і з дапамогай інтуітыўнага спасціжэння рэчаіснасці мінулага. Галоўная ўвага прадстаўнікоў гэтага напрамку была сканцэнтравана на пазнавальнай дзейнасці гісторыка, даследчых працэдурах ("крыніцы апавядаюць тады, калі ўмееш іх пытацца" М. Блок).

*Неаканціянская* трактоўка захоўвае адмаўленне аб'ектыўнай прыроды гістарычных фактаў, адмаўляе сапраўдную магчымасць пазнання мінулага. Веды аб мінулым, праходзячы праз свядомасць даследчыка, ператвараюцца цалкам у суб'ектыўныя канструкцыі. Неаканціянства паставіла шэраг значных для метадалогіі гістарычнага даследавання пытанняў: аб шляхах і метадах выяўлення гістарычных фактаў, аб спецыфіцы пазнання мінулага, аб магчымасці атрымання аб'ектыўных гістарычных ведаў.

*Дыялектычна-матэрыялістычны* падыход вылучае тры катэгорыі фактаў: факты гістарычнай рэчаіснасці, факты гістарычных крыніц (паведамленні гістарычных крыніц), навукова-гістарычныя факты ("факты-веды").

*Факты гістарычнай рэчаіснасці* аб'ектыўны і ў адносінах да творцаў гістарычных крыніц і ў адносінх да гісторыкаў. У іх выяўляецца ўся шматграннасць чалавечай дзейнасці і тых адносінаў, у якіх яна ажыццяўлялася.

*Факты гістарычнай крыніцы* – уяўляюць сабой адлюстраванне фактаў гістарычнай рэчаіснасці стваральнікам крыніцы. Такое адлюстраванне суб'ектыўна, бо носіць адбітак светасузірання аўтара. Але, паколькі гэтае адлюстраванне ўжо здзейснілася, то яно нязменнае.[6]

*Навукова-гістарычны факт* – гэта адлюстраванне гісторыкам фактаў гістарычнай рэчаіснасці на аснове фактаў крыніц. Таму, навукова-гістарычны факт – гэта двойчы суб'ектывізаванае адлюстраванне мінулага. Выключэнне складаюць тыя выпадкі, калі крыніцы з'яўляюцца непасрэднымі

[6] Ковальченко И.Д., с. 141 – 143.

рэшткамі мінулага, якія даюць магчымасць непасрэдна-адчувальнага ўспрыняцця мінулага. Уласцівасцю гэтай групы фактаў з'яўляецца тое, што яны ўвесь час дапаўняюцца ў працэсе гістарычнага пазнання.[7]

Сапраўдны сэнс гістарычных фактаў і іх разуменне і адзнака сучаснікамі можа не супадаць. Таму важнай для даследчыка з'яўляецца задача выяўлення і пераадолення памылковых меркаванняў сучаснікаў. Факты гістарычных крыніц ("апавяданні крыніц") таксама могуць недакладна адлюстроўваць рэальнасць. У выяўленні правільнага сэнса гістарычных фактаў важнае значэнне мае *герменеўтыка*. Герменеўтыка – навука аб тлумачэнні сэнса тэкста. Пераадоленне суб'ектыўнасці паведамленняў крыніц, выяўленне ступені адэкватнасці адлюстравання фактаў гістарычнай рэчаіснасці і раскрыццё інфармацыйных магчымасцяў крыніц адкрывае шлях да выкарыстання іх фактаў як асновы для навуковага пазнання мінулага. Па меркаванню М.А. Барга, навуковым **гістарычным фактам** можна лічыць не сведчанне, знойдзенае ў крыніцы і перанесенае ў гістарычную працу, а толькі факт, пастаўлены ў належную сувязь з іншымі гістарычнымі фактамі.[8] Такім чынам, працэс гістарычнага пазнання ўяўляе сабой ланцуг: *ад факта рэчаіснасці – да факта крыніцы, а ад яго – да навукова-гістарычнага факта*.[9] Палемічным з'яўляецца пытанне, ці варта абмяжоўваць прадмет гістарычнай крытыкі толькі канстатаваннем быцця факта ці больш шырока падыходзіць да праблемы вызначэння факта. Факт можа быць апісаны ці адлюстраваны ў крыніцы не цалкам. Іншы раз неабходна шмат крыніц, каб аднавіць структуру факта блізка да рэчаіснасці. Таму навукова-гістарычныя факты абагульняюцца, аналізуюцца і параўноўваюцца ў гістарычным даследаванні. **Гістарычнае даследаванне** – гэта праца прафесійнага гісторыка, якая выканана на аснове гістарычных крыніц з выкарыстаннем распрацаваных у гістарычнай навуцы метадаў даследавання. Пры гэтым, гістарычнае даследаванне адрозніваецца ад гістарычнага дапаможніка. **Гістарычны дапаможнік** – гэта мадэль, якая заснавана на дадзеных крыніц і дазваляе вывучаць падзеі мінулага. У якасці дапаможніка могуць выступаць рэчавыя і іншыя тыпы крыніц.[10] Напрыклад, прылады працы, прадстаўленыя ў археалагічных калекцыях музеяў. Асноўным з'яўляецца паняцце "гістарычная крыніца."

**Крыніца** ўяўляе сабой адзінства суб'ектыўнага і аб'ектыўнага. Кожная крыніца суб'ектыўна, паколькі яна з'яўляецца прадуктам

---

[7] Ковальченко И.Д., с. 143.
[8] Цыт. па Ковальченко И.Д., с. 148.
[9] Там жа, с. 143.
[10] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н. Теория и история источниковедения: пособие для студентов гуманитарных факультетов. – Мн., 2000, с. 8.

чалавечай свядомасці. З іншага боку, гістарычная крыніца аб’ектыўна, бо з’яўляецца часткай гістарычнай рэчаіснасці. Аднак, крыніца не адлюстроўвае цалкам рэальнасці і не можа атаясамляцца з ёй, гэта вызначае неабходнасць распрацоўкі тэарэтычных прынцыпаў і метадычных прыёмаў атрымання з крыніцы гістарычнай інфармацыі. Менавіта гэтыя прыёмы і прынцыпы выпрацоўвае крыніцазнаўства. Яно, у адрозненні ад іншых гуманітарных дысцыплін, разглядае крыніцы і метады іх вывучэння ў якасці свайго прадмета.[11]

**Гістарычныя крыніцы** – гэта матэрыяльныя аб’екты, якія маюць сацыяльную прыроду паходжання, адлюстроўваюць гістарычнае мінулае грамадства, уцягнуты ў сферу гістарычнага даследавання і служаць сродкам гістарычнага пазнання. Яны знаходзяцца ў працэсе гістарычнага пазнання паміж аб’ектам пазнання (гістарычнымі з’явамі, падзеямі) і суб’ектам (гісторыкам), які вывучае. Гістарычныя крыніцы існуюць у форме рэальных аб’ектаў і не залежаць ад даследчыка, але яны нясуць у сабе суб’ектыўны пачатак, які адлюстроўвае ўплыў стваральніка-чалавека, яго патрэбы, свядомасць, магчымасці.[12]

**Аб’ектам вывучэння** крыніцазнаўства пры гэтым з’яўляецца ўся сукупнасць гістарычных крыніц, а таксама сукупнасць метадаў іх даследавання і вывучэння. Існуе шырокае і вузкае разуменне прадмета крыніцазнаўства. У вузкім разуменні **прадметам вывучэння крыніцазнаўства** з’яўляюцца канкрэтныя бакі гістарычнай крыніцы, якія вывучаюцца з пэўнай мэтай у пэўны момант. У шырокім, **прадметам** крыніцазнаўства з’яўляюцца заканамернасці ўзнікнення гістарычных крыніц і адлюстравання ў іх гістарычнай рэчаіснасці. Крыніцазнаўства ўключае як тэарэтычнае, так і канкрэтнае раскрыццё сувязяў суб’екта – гісторыка з вывучаемай ім крыніцай. У цэнтры ўвагі крыніцазнаўства знаходзяцца праблемы паходжання, аўтарства крыніц, гісторыі іх стварэння, інтэрпрэтацыі і аналіза іх зместу, паўнаты, дакладнасці звестак крыніц.[13]

У сувязі з вызначэннем прадмета і аб’екта крыніцазнаўства ўзнікае пытанне аб структуры гэтай навуковай дысцыпліны, яе месцы і ролі ў гістарычных ведах як сістэме. Разуменню асаблівасцяў і задач крыніца-

[11] Медушевская О.М. Современное заруежное источниковедение: Уч. пособие для студентов ист.факуьтетов вузов. – М., 1983, с. 5 – 6; Никулин П.Ф. Учебное пособие "Теория и методика источниковедения в отечественной истории X – начала XX вв.". Часть I. Томск, 2000, с. 10.

[12] Гл. Медушевская О.М., с. 16 – 17; Никулин П.Ф., с. 10.

[13] Гл. Ковальченко И.Д., с. 52 – 53; Каун С.Б., Ходин С.Н., Липницкая О.Л. Теория и история источниковедения. Источниковедение истории Беларуси. учеб.-метод. комплекс для студентов заочных отделений гуманитарных факультетов вузов. – Мн., 2001, с. 6.

знаўства можа спрыяць схема, якая адлюстроўвае (на наш погляд) структуру і сувязі гістарычнага крыніцазнаўства *(гл. схему*)*.

**Схема ***

*Гістарычнае крыніцазнаўства як сістэма ведаў*




* Выкарыстана схема з дапаможніка Бандзелікава М.Ф. Асновы тэорыі і методыкі крыніцазнаўства: вучэб. дапам. – 2-е выд., стэр. – Мн. : БДПУ, 2004, с. 18.

У XIX ст. гісторыкі імкнуліся пісаць “аб’ектыўную гісторыю”. Яны імкнуліся абапірацца выключна на пісьмовыя крыніцы, таму вялікае значэнне для крыніцазнаўства мела археаграфія. Археаграфічныя праблемы шмат у чым былі і праблемамі крыніцазнаўства. У савецкай гісторыі таксама аб’ектам вывучэння былі найбольш дакументальныя крыніцы. Другая Сусветная вайна стала пачаткам т.зв. “антрапалагічнага перавароту” у гуманітарнай сферы. Гісторыкі звярнуліся да нязвыклых крыніц: прадметаў побыту, вусных сведчанняў, апавядальных крыніц. Метады засваення такога віду матэрыялаў мусілі быць запазычанымі з іншых гуманітарных навук: псіхалогіі, этналогіі, сацыялогіі. У развіцці сучаснага крыніцазнаўства пазначаюцца розныя тэндэнцыі. Спробы прымянення новых метадаў дазволілі рэалізаваць такія накірункі, як “псіхагісторыя”, “вусная гісторыя”, “гендэрная гісторыя” і г.д. Гэтыя з’явы парушылі класічныя прынцыпы крытыкі гістарычных крыніц. У даследаваннях школ псіхагісторыі мы можам назіраць выпадкі, калі апрабаваныя ў XX ст. псіхагістарычныя метады і прыёмы ўжываюцца для вывучэння чалавека сярэднявечча і старажытнасці. Але ўжо з часу “Школы Анналаў” пачала зацвярджацца думка, што людзі мінулага не тое, што людзі сучаснасці, а іншыя. У крыніцазнаўстве з’явіліся новыя навуковыя пытанні. Пэўныя праблемы ўзнікаюць як з вызначэннем паняцця “*вуснай крыніцы*”, так і пры зборы, апрацоўцы такога роду гістарычных крыніц, метадах фіксацыі вусных крыніц.[14] Праблема вызначэння “гісторыі” як навукі адбілася на трактоўцы “крыніцазнаўства”. У сучаснасці існуюць тры яго трактоўкі:

1. **Класічная.** Калі крыніцазнаўства разглядаецца ў якасці адной з частак гістарычнай навукі, як комплекс спецыяльных дысцыплін. Пры гэтым падыходзе вырашаюцца пазітывісцкія задачы ўстанаўлення сапраўднасці крыніц (месца, даты, часу) і верагоднасці іх інфармацыі. Распаўсюджана была ў 1960 – 1980-я гг. У сучаснасці губляе прыхільнікаў.[15]

2. **Інфармацыйная.** Крыніцазнаўства разумеецца як самадастатковая гуманітарная метанавука, што вывучае спосабы атрымання інфармацыі аб мінулым і ўзаемадзеяння інфармацыйных адзінак. Апошняе вядзе да вызначэння крыніцы праз характар самой інфармацыі – “масавыя”, “адзінкавыя”. Адзначаны падыход народжаны прылівам у гісторыю даследчыкаў у галіне матэматыка-статыстычных метадаў.[16]

---

[14] Гл. Ковальченко И.Д., с. 56 – 60; Бандзелікаў М.Ф., с. 9 – 11; Каун С.Б., Ходин С.Н., Липницкая О.Л., с.12 – 13.
[15] Гл. Медушевская О.М., с. 5 – 16.
[16] Гл. Ковальченко И.Д., с. 309 – 340; Хвостова К.В. Количественные методы в истории // Вопросы философии. – 2002. – № 6. – с. 60 – 67.

3. **Культуралагічная**. Крыніцазнаўства разумеецца як самадастатковая гуманітарная метанавука, што ў сучасных гуманітарных навуках выконвае функцыю адзінага метада. Сутнасць яго – вывучэнне крыніц як “помнікаў культуры”, уяўляючых сабой не носьбітаў інфармацыі,ператворанай даследчыкам у гістарычныя факты, а саму рэальнасць. Апошні падыход увасоблены ў цікавым навуковым выданні кафедры крыніцазнаўства і дапаможных дысцыплін Расійскага гуманітарнага універсітэта. Імкнучыся падкрэсліць, што крыніца не змяняе сваю форму, аўтары выдання выкінулі тэрмін “гістарычная”.[17]

Значная частка сучасных беларускіх гісторыкаў разумее гісторыю як пазітывісты – як збіральніцу фактаў для развіцця іншых навук. Т.ч. у беларускім крыніцазнаўстве можна казаць аб пераходзе ад класічна-савецкіх тэндэнцый да антрапалагічна-арыентаваных, культуралагічных. Адным з важнейшых пытанняў крыніцазнаўства з’яўляецца пытанне аб тэрміналогіі, узнікае таксама неабходнасць канкрэтызаваць суадносіны паняццяў “крыніцазнаўства – гістарыяграфія”, “крыніцазнаўства – метадалогія”, “крыніцазнаўства – археаграфія”. У сучаснасці можна казаць аб пачатку традыцыі вывучэння гістарычных крыніц эмпірычнымі метадамі ўсіх гуманітарных навук.[18]

Адной з першапачатковых задач крыніцазнаўства была эўрыстыка – пошук патрэбных матэрыялаў. Паступова ў задачы крыніцазнаўства была ўключана крытыка знойдзеных крыніц. Крытычнае вывучэнне пісьмовасці было немагчыма без вывучэння графікі, гісторыі тэкста, аналіза формы і зместу, а крыніцазнаўства стала аб’ядноўваць і гістарычную крытыку і палеаграфію, тэксталогію і дыпламатыку і інш. Такім чынам крыніцазнаўства ператварылася ў комплекс навук аб крыніцах. Комплекснасць крыніцазнаўства разумеецца як сінтэз тэорый асобных спецыяльных гістарычных дысцыплін. Асноўным паняццем крыніцазнаўства з’яўляецца “гістарычная крыніца”.

Паняцце “крыніца” прысутнічае ў апараце палеаграфіі, дыпламатыкі, тэксталогіі, гістарычнай крытыкі і інш. гістарычных дысцыплін. Аднак, распрацоўку гэтага тэрміна нельга аднесці ні да воднай са спецыяльных гістарычных дысцыплін, акрамя крыніцазнаўства. Такім чынам, крыніца-

---

[17] Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособие / И.Н. Данилевский, В.В. Кабанов, О.М, Медушевская, М.Ф. Румянцева. – М., 1998. – с. 99 – 108.

[18] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н. Теория и история источниковедения. Пособие для студентов гуманитарных факультетов. – Мн., 2000. – с. 14; Кафедра источниковедения: 10 лет творчества // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып.1. – Мн., 2002. – с. 5 – 12.

знаўства выконвае сінтэзуючую функцыю ў адносінах да іншых спецыяльных гістарычных навук. Даследчыкі адзначаюць, што крыніцазнаўства прайшло развіццё ад комплекснай навукі да метанавукі. Месца сучаснага крыніцазнаўства – гэта цэнтр у сістэме гістарычных навук, кожная з якіх займаецца асобным відам гістарычных крыніц.[19]

Напрыклад, **археаграфія** (ад грэч. archaios – старажытны + grapho – пішу ) – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая распрацоўвае методыку пошуку і збору пісьмовых помнікаў, пытанняў навуковага ўліку і апісання рукапісаў і рукапісных кніг (камеральная археаграфія), прынцыпы і метады выдання тэкставых гістарычных крыніц (эдыцыйная археаграфія). Тэрмін упершыню быў выкарыстаны ў працы Ш. Спона, выдадзенай у 1685 г. Спачатку тэрмін пазначаў навуку аб помніках старажытнасці. У 1-й чвэрці XIX ст. гэты тэрмін выкарыстаны ў Расіі П. Строевым. Ён быў арганізатарам у 1820 – 1830-х гадах Археаграфічнай камісіі для сістэматызацыі, збірання і выдання крыніц па айчыннай гісторыі. С.О. Шмідт прапанаваў тлумачыць археаграфію як навуку аб збіранні, апісанні і выданні пісьмовых гістарычных крыніц, і ў вузкім сэнсе – як тэорыю, методыку і практыку публікацыі дакументальных помнікаў. [20] Дзякуючы метадам і прыёмам археаграфіі, крыніцазнаўства пазбягае пры аналізе крыніц скажэння інфармацыі. Паколькі крыніцазнаўства вывучае ўвесь комплекс гістарычных крыніц, у тым ліку і пісьмовыя, то аб'ект крыніцазнаўства больш шырокі за аб'ект археаграфіі.

**Архівазнаўства** – комплексная дысцыпліна, што вывучае гісторыю, арганізацыю, тэорыю і практыку работы архіваў у галіне ўліку, апісання, выкарыстання, забеспячэння захаванасці дакументаў, навуковую арганізацыю працы і эканоміку архіўнай справы. Як спецыяльная гістарычная дысцыпліна архівазнаўства выкладаецца на гістарычных факультэтах універсітэтаў. Архіўныя крыніцы з'яўляюцца асобнай групай гістарычных крыніц, таму крыніцазнаўства вывучае сярод іншых і гэты від крыніц.[21]

**Музеязнаўства** (музеялогія) – навуковая дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці ўзнікнення і развіцця музейных адносін да рэчаіснасці, гісторыю музея як сацыяльнага інстытута і яго функцыі ў грамадстве, формы і спосабы рэалізацыі гэтых функцый на розных этапах грамадскага развіцця. Музеязнаўства вывучае толькі тыя крыніцы, якія з'яўляюцца музейнымі прадметамі. Існуе такі раздзел музеязнаўства, як музейнае

---

[19] Источниковедение истории СССР: учебник / под. ред. И.Д. Ковальченко. – М., 1981. – с. 217 – 218.

[20] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т 1.

[21] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н.Теория и история источниковедения. источниковедение истории Беларуси, с. 7.

крыніцазнаўства. Яго прадмет даследавання вельмі блізкі з прадметам крыніцазнаўства. Музеязнаўцы ў сваёй практыцы непазбежна карыстаюцца прыёмамі і метадамі крыніцазнаўства: крытыкай музейнага прадмета, музеязнаўчай адзнакай і г.д.[22]

Існуе падабенства задач крыніцазнаўчай эўрыстыкі і **інфарматыкі**. Праблемы пошуку крыніц і інфармацыі (эўрыстыка) распрацоўваліся ў розных галінах навукі: у бібліяграфіі, архівазнаўстве, археаграфіі, палеаграфіі і інш. У кожнай з іх складаліся свае пошукавыя сістэмы: агляды, апісанні, каталагі, даведнікі, бібліяграфіі і г.д. Стварэнне навукі інфарматыкі, якая вывучае новыя сістэмы навуковай інфармацыі, вызначае магчымасць аб’яднання інфармацыйна-пошукавых сістэм – старых і новых – у прадмеце адной навукі. Між тым, сучасныя ўяўленні аб прадмеце інфарматыкі як навукі зыходзяць з таго, што яна бярэ ад старых сістэм толькі тэарэтычныя абгрунтаванні і пакідае практыку ў традыцыйных галінах. Уключэнне ў прадмет інфарматыкі тэарэтычных абгрунтаванняў традыцыйных даследчыцкіх напрамкаў па складанню бібліяграфій, анатаванню, рэфераванню і г.д. пры адначасовым захаванні практыкі бібліяграфіравання, анатавання, рэферавання ў тых галінах, у якіх развіваліся гэтыя віды работ, не дае ўмоў для стварэння адзінай інфармацыйнай навукі. Аб’яднанне ў інфарматыцы ўсіх напрамкаў, што абслугоўваюць інфармацыйныя патрэбы розных галінаў навукі – адна з неабходных умоў, якая садзейнічае фарміраванню ўяўленняў аб прадмеце інфарматыкі, яго складаных частках. Дысцыпліны, якія з’яўляюцца карыстальнікамі інфармацыі таксама атрымліваюць імпульс для ўпарадкавання свайго апарата. У роўнай ступені гэта адносіцца і да палеаграфіі. Вызваленне яе ад інфармацыйных задач стварае цэлы даследчы напрамак. Напрыклад, вызначэнне фактаў – прадмет аднаго з напрамкаў гістарычнай навукі, а размяшчэнне фактаў па пэўнай сістэме (у храналагічным парадку) мае інфармацыйную мэту. Гістарычнае крыніцазнаўства карыстаецца колькаснымі і фармальнымі метадамі працы з крыніцамі. Колькасныя метады выкарыстоўваюцца як правіла ў сацыяльна-эканамічных даследаваннях, пры наяўнасці вялікага масіва крыніц. Сотні тысяч колькасных дадзеных немагчыма ахапіць пры дапамозе інтуіцыі і рэпрэзентаваць пры дапамозе наратыва. Напрамак гістарычных даследаванняў з выкарыстаннем камп’ютэрных метадаў працы з дадзенымі атрымаў у заходніх гісторыкаў назвы *кліаметрыі* і *квантытатыўнай гісторыі*. Выкарыстанне колькасных метадаў савецкімі гісторыкамі пачалося з 60-х гг. XX ст. пад

[22] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 8.

кіраўніцтвам акадэміка І.Д. Кавальчанка.[23] У 1993 г. дадзены напрамак атрымаў сусветнае прызнанне, якое выявілася ў прысуджэнні амерыканскім навукоўцам Р. Фогелю і Д. Норту Нобелеўскай прэміі за цыкл прац па гісторыі амерыканскага рабаўладальніцтва.[24] У гэтых працах былі выкарыстаны так званыя контрафактычныя мадэлі, што дазвалялі выявіць і параўнаць альтэрнатыўныя, але не развітыя сацыяльныя тэндэнцыі. У сучасных гістарычных даследаваннях на хвале постмадэрнізма модным стала падкрэсліваць гістарычны суб'ектывізм і акцэнтаваць увагу на вывучэнні чалавека, але працягваюць развівацца і колькасныя метады ў вывучэнні крыніц.

Спрэчным застаецца змест той часткі крыніцазнаўства, якая атрымала назву **дыпламатыкі**. Гісторыкі па-рознаму вызначаюць яе прадмет. Распаўсюджаным з'яўляецца меркаванне аб тым, што дыпламатыка рознабакова вывучае толькі акты.[25] Пры гэтым паняцце акта зводзіцца да дакументальных крыніц дамоўнага характара. Больш можна пагадзіцца з меркаваннем, што дыпламатыка павінна сваёй задачай ставіць вывучэнне ўсіх помнікаў пісьмовасці з пункту гледжання даследавання фармуляра. Такім чынам, **дыпламатыка** – спецыяльная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае паходжанне, форму і змест дакументальных крыніц для вызначэння іх сапраўднасці. Сучасная дыпламатыка з'яўляецца часткай агульнага крыніцазнаўства, у задачы яе ўваходзіць даследаванне форм і зместу дакументаў. Актавыя крыніцы – гэта крыніцы пераважна дамоўнага характару (міжнародныя дамовы, граматы, арэндныя дамовы і г.д.). Паколькі аб'ектам вывучэння крыніцазнаўства з'яўляецца ўся сукупнасць гістарычных крыніц, то і актавыя крыніцы таксама. Таму аб'ект вывучэння крыніцазнаўства значна шырэйшы за аб'ект вывучэння дыпламатыкі. Разам з тым, дыпламатыка пры дапамозе спецыфічных метадаў вывучае спецыфічную групу крыніц. [26]

Сярод дапаможных гістарычных дысцыплін асобнае месца займае **гістарычная бібліяграфія.** Гэта дысцыпліна, прадметам якой з'яўляецца распрацоўка метадаў пошуку, бібліяграфічнага апісання, мэтавага адбору і прадастаўлення атрыманай інфармацыі даследчыку. У задачу бібліяграфіі ўваходзіць пошук бібліяграфічных пазіцый па абранай тэме. Гістарычная бібліяграфія вывучае не толькі гістарычныя крыніцы, але і гістарычныя даследаванні.[27]

---

[23] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 310 – 314.
[24] Хвостова К.В. Количественные методы в истории, с. 61.
[25] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 8.
[26] Гл.: Каштанов С.М. Русская дипломатика: учеб. пособие для вузов. – М., 1988. с. 39 – 52.
[27] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н. Теория и история источниковедения, с. 16.

**Метад** – гэта мэтанакіравана абраная форма дзейнасці. А яе знешняя канкрэтна-прадметная форма з мэтай атрымання навуковых ведаў ці забеспячэння ўмоў для гэтага – **методыка. Метадалогія** ў дадзеным выпадку разглядаецца ў яе прыкладным значэнні – як сукупнасць метадаў, у адрозненні ад метадалогіі (ў філасофскім сэнсе) як вучэння аб навуковым метадзе пазнання, метадалагічнай рэфлексіі, бачанні гістарычнай рэальнасці, што падлягае вывучэнню. Метады ў самым агульным сэнсе – гэта пэўным чынам упарадкаваная дзейнасць па дасягненню пастаўленай мэты. Метады гістарычнага даследавання, якія прызначаны выконваць адну важную функцыю, – фарміраваць асноўныя прынцыпы тэорыі пазнання, – розныя па сутнасці і матэрыялу, да якога яны прыстасаваны, таксама розныя па вырашаемых з іх дапамогай задачах. [28]

Навуковае пазнанне заснавана на выкарыстанні сукупнасці пазнавальна-даследчых метадаў. Падмуркам для любога канкрэтна-гістарычнага даследавання з'яўляюцца канкрэтна-навуковыя метады (канкрэтна-праблемныя) метады. Спецыфіка кожнага метада вызначаецца асаблівасцямі аб'екта пазнання і сутнасцю даследчай задачы. Канкрэтна-праблемныя метады заснаваны на метадах спецыяльна-навуковых, агульнанавуковых ці філасофскіх. Калі для спецыяльна-навуковых метадаў характэрны канкрэтныя прыёмы, то агульнанавуковыя метады характарызуюцца найбольшай абагуленасцю.

Да **агульнанавуковых метадаў** адносяцца:

**1. Гістарычны і лагічны** метады – дазваляюць вывучаць аб'ект у прасторы і часе.

**Гістарычны метад** паказвае рух аб'екта ў часе. Аднак, гістарычны метад не зводзіцца да простага ўзнаўлення часавай паслядоўнасці ў развіцці аб'екта, азначае разгляд аб'ектыўнага генезіса аб'екта і выніка яго развіцця.

**Лагічны метад** уяўляе сабой спосаб узнаўлення гістарычна развіваючагася аб'екта як выніка пэўнага працэса, у ходзе якога сфарміраваліся неабходныя ўмовы яго далейшага існавання ў якасці ўстойлівага сістэмнага ўтварэння. Неабходнасць лагічнага метада вывучэння грамадскіх з'яў як найважнейшай умовы адэкватнага і эфектыўнага раскрыцця гісторыі падцвярджаецца фактамі. Так, напрыклад, аналіз дынамікі гістарычных працэсаў на аснове прымянення матэматычных метадаў і ЭВМ паказаў, што ён не можа быць дастаткова эфектыўным без папярэдняга вывучэння структуры і функцый адпаведных сістэм у прасторавым і сінхронным аспектах.

---

[28] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 38 – 52.

**2. Метад узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага** і **метад узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага.**

Катэгорыя "канкрэтнае" адлюстроўвае аб'ектыўную рэальнасць, якую пазнае гісторык з усімі, характэрнымі для яе рысамі, уласцівасцямі. "Абстрактнае" разумеецца як няпоўныя (у сэнсе канкрэтнасці) веды аб рэальнасці. Пераход да абстрактнага ці абстрагаванне – гэта вылучэнне ў аб'екце толькі такіх рысаў, якія цікавяць даследчыка і ігнараванне іншых. Працэс абстрагавання дасягаецца шляхам такіх прыёмаў, як атаясамленне, ідэалізацыя, адцягненне. Прымяненне метада ўзыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага можна прасачыць у працы К. Ясперса "Сэнс і прызначэнне гісторыі," дзе ён ім карыстаўся ў сукупнасці з іншымі метадамі.

Узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага – найбольш высокі тэарэтычны ўзровень пазнання. Прыкладам такога ўзроўня тэарэтычнага пазнання можа быць распрацоўка школай "Аналаў" канцэпцыі "часавай працягласці". Метад узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага – гэта **індуктыўны метад**, метад ад абстрактнага да канкрэтнага – **дэдуктыўны метад**.

**3. Метад мадэлявання –** гэта даследаванне аб'ектаў пазнання на аснове іх мадэляў, узнаўляючых ці адлюстроўваючых гэтыя аб'екты. Асновай метада з'яўляецца тэорыя падабенства. Мадэль – гэта наўмысна абраная ці створаная даследчыкам сістэма, якая ўзнаўляе з пэўнай мэтай істотныя бакі вывучаемага аб'екта і знаходзіцца з ім у такой ступені падабенства, што яе даследаванне з'яўляецца спосабам атрымання ведаў аб самім аб'екце.

**4. Сістэмны метад** – у аснове мае погляд на аб'ект вывучэння як сістэму. У якасці спецыфічных прыёмаў сістэмных даследаванняў можна разглядаць структурны і функцыянальны аналізы, што накіраваны на вывучэнне структуры сістэм і вызначэнне іх функцый. Усебаковае вывучэнне сістэмы патрабуе разгляду яе структуры і функцый у арганічным адзінстве, г.зн. прымянення структурна-функцыянальнага аналіза.

**5. Метад аналогіі** – дапамагае выявіць сходнасць паміж аб'ектамі даследавання шляхам выяўлення іх адрозненняў. Гэты метад выкарыстоўваецца ў сукупнасці з іншымі метадамі.

**6. Метад аналіза і сінтэза** – дазваляе раскласці ўяўна цэлае на часткі і скласці цэлае з частак. Гэты метад выкарыстоўваецца на ўсіх ступенях пазнавальнага працэса. Яго формамі з'яўляюцца класіфікацыя прадметаў і з'яў, выяўленне этапаў іх развіцця, знаходжанне супярэчлівых тэндэнцый і

інш. Сінтэз дапаўняе аналіз, вядзе да аб'яднання ў адзінае цэлае частак, уласцівасцяў, адносін, вылучаных шляхам аналіза.[29]

Да **спецыяльна-гістарычных метадаў** адносяцца:

**1. Гісторыка-генетычны метад** – вывучэнне гістарычных з'яў у працэсе іх развіцця, ад зараджэння да знікнення ці сучаснага стану.

**2. Гісторыка-параўнаўчы метад** (кампаратыўны) – параўнанне гістарычных аб'ектаў у прасторы і часе і вызначэнне падабенства і розніцы паміж імі.

**3. Гісторыка-сістэмны метад** – разглядае сацыяльна-гістарычныя сістэмы, раскрывае ўнутраныя і знешнія механізмы іх функцыянавання.

**4. Гісторыка-тыпалагічны –** вызначае агульныя рысы ў прасторавых групах гістарычных падзей і з'яў ці вылучае аднародныя стадыі ў іх бесперапынным часавым развіцці.

**5. Метад дыяхранічнага аналіза** – пабудова ў часе розных па прыродзе гістарычных працэсаў.

**6. Рэтраспектыўны метад** – паслядоўнае пранікненне ў гістарычнае мінулае з мэтай вызначэння прычыны дадзенай падзеі.

**7. Метад класавага аналіза** – тлумачэнне гістарычнага працэса праз прызму наяўнасці пэўных класаў і класавай барацьбы. Гэты метад быў вельмі папулярным у гістарычных працах савецкага перыяду. Заснаваны на марксісцкім падыходзе.[30]

Кожны метад дапаўняе папярэдні. У мэтах эфектыўнага прымянення дадзеных метадаў выпрацоўваюцца правілы і працэдуры, якія называюцца даследчай методыкай. Акрамя вышэй пералічаных метадаў, гісторыкі пры вывучэнні гістарычных крыніц і канструяванні гістарычных працэсаў карыстаюцца **колькаснымі** метадамі, **сацыяльна-псіхалагічнымі** метадамі, метадамі **герменеўтыкі**, **лінгвістычнымі,** метадамі **семіётыкі**, **мастацтвазнаўчым аналізам** і інш.

Кожная навука мае два ўзроўні – тэарэтычны і прыкладны. У крыніцазнаўстве таксама вылучаецца два ўзроўні: **тэарэтычны і прыкладны**.[31] Тэорыя крыніцазнаўства – гэта навуковая сістэма ведаў аб крыніцах, якая дазваляе разглядаць іх істотна агульныя ўласцівасці. Тэорыя крыніцазнаўства распрацоўвае праблемы: прырода гістарычнай крыніцы, законы адлюстравання ў крыніцы сацыяльнай рэальнасці, класіфікацыя гістарычных крыніц, змест і паслядоўнасць этапаў вывучэння крыніц. Таксама

[29] Гл.: Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов / под общ. ред. В.Н. Сидорцова – Мн., 2006. – с. 209 – 220; Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования, с. 154 – 182.

[30] Методологические проблемы истории, с. 221; Ковальченко И.Д., с. 183 – 208.

[31] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 6.

тэарэтычнае крыніцазнаўства распрацоўвае агульныя метады вывучэння і даследавання гістарычных крыніц. Гэтыя метады канкрэтызуюцца пры вывучэнні асобных груп крыніц, ці асобных іх характарыстык. Прадметам даследавання для тэарэтычнага крыніцазнаўства з'яўляюцца метады. Асабліва важная роля тэарэтычнага крыніцазнаўства ў навучанні методыцы даследавання. Для навучання методыцы даследавання неабходна яе прааналізаваць на ўзроўні тэорыі, надаючы ўвагу ўмовам, межам яе прымянення ў залежнасці ад аб'ектыўных уласцівасцяў вывучаемага прадмета. У прыкладным крыніцазнаўстве метад – гэта інструмент вывучэння крыніц. Прыкладное (практычнае) крыніцазнаўства займаецца такімі пытаннямі працы з крыніцамі, як датаванне крыніцы, вызначэнне месца стварэння крыніцы, атрыбуцыя крыніцы, рэканструяванне крыніцы. На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі тэорыя і методыка крыніцазнаўства працягваюць узбагачацца практыкай гістарычных даследаванняў. Новыя задачы гістарычнай навукі ва ўмовах інтэграцыі розных галінаў ведаў пашыраюць кола гістарычных крыніц розных відаў, гістарычных эпох, пашыраецца і кола праблем грамадскай практыкі і навукі, для якіх выкарыстанне метадаў крыніцазнаўства з'яўляецца неабходным.

Кожная навука выконвае пэўныя функцыі. Найбольш значнымі ў крыніцазнаўстве з'яўляюцца наступныя **функцыі:**

1. **Эўрыстычная** функцыя – гэта адна з асноўных функцый крыніцазнаўства. Яна дазваляе арыентавацца ў гістарычных крыніцах.

2. **Методыка-аналітычная** функцыя – дапамагае выпрацоўваць новыя метады працы з крыніцамі, аналіза якасці здабытай у крыніцах інфармацыі, паўнаты і дакладнасці зместу крыніц.

3. **Пазнавальная** функцыя крыніцазнаўства – праяўляецца ў тым, што праблемы пазнавальнасці гістарычных працэсаў, заканамернасцяў развіцця грамадства і мыслення маюць непасрэдную шчыльную сувязь з больш спецыфічнымі і канкрэтнымі праблемамі і метадамі пазнання мінулага праз гістарычную крыніцу. Крыніцазнаўства дапамагае спазнаць рэчаіснасць праз гістарычную крыніцу, выпрацоўвае для гэтага неабходны інструментарый.

4. **Маральна-этычная** функцыя крыніцазнаўства цесна звязана з навуковымі крытэрыямі дакладнасці, надзейнасці, навізны інфармацыі крыніцы, з пытаннямі аб задачах і грамадскіх функцыях гістарычнай навукі, крытэрыямі пазіцыі гісторыка, які "чытае" інфармацыю крыніцы і дае ёй новае жыццё ў даследаванні.[32]

[32] Гл.: Медушевская О.М., с. 5 – 10.

Узаемасувязь гуманітарных і прыродазнаўчых навук з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў інтэграцыі навукі. Гісторыя навукі і тэхнікі актыўна развіваецца і мае перспектывы. Роля гісторыі ў працэсе гуманізацыі ведаў, бясспрэчна, высокая. Таму эўрыстычная і методыка-аналітычная функцыі крыніцазнаўства, якія яно выконвае ў гістарычнай навуцы, з'яўляюцца карыснымі і для іншых навук. Гістарыяграфія, напрыклад, ужо фарміруе сваё крыніцазнаўства. Шэраг праблем, якія разглядае гістарыяграфія як гісторыя гістарычнай навукі, спецыфічны толькі для яе – яны з'яўляюцца агульнымі для гісторыі навукі ўвогуле. Да такіх належыць пытанне аб крыніцазнаўчай базе гісторыі навукі, аб яе крыніцах. У межах філасофіі, мастацтва, ваеннай справы, медыцыны і іншых галінаў ужо зроблены першыя спробы распрацоўкі крыніцазнаўчых праблем. Крыніцазнаўства ўступае ва ўзаемадзеянне з шэрагам навук, уваходзячы ў міждысцыплінарныя комплексы, якія фарміруюцца на сутыку гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук. Напрыклад, складаныя інтэграцыйныя працэсы адлюстроўваюць узаемасувязь крыніцазнаўства і архівазнаўства. Шэраг агульных праблем вывучаюць археаграфія, лінгвістыка, літаратуразнаўства і інш.[33]

Крыніцазнаўства ў літаратуразнаўстве – адна са спецыяльных дысцыплін, якая вывучае літаратурны твор з пункту гледжання яго крыніц. У межах літаратурнай навукі, якая займаецца вывучэннем творчасці пісьменнікаў на аснове іх твораў, літаратурнае крыніцазнаўства займаецца даследаваннем незакончаных, папярэдніх рэдакцый тэкстаў, чарнавых матэрыялаў і г.д. У якасці прыклада крыніцазнаўчага аналіза літаратурнага твора можна прывесці аналіз матэрыялаў Ф. Дастаеўскага да рамана "Бесы." Па першапачатковай задуме аўтара, што адлюстравана ў яго запісах, "Бесы" павінны былі мець выгляд "паэмы аб тым, як жадаў ажаніцца і не ажаніўся Граноўскі." У тых жа запісах даследчыкі знайшлі планы пісьменніка аб тым, як будзе разгортвацца сюжэт, як пабудуюцца ўзаемаадносіны герояў, пазначана храналогія рамана. Акрамя тэкстаў крыніцазнаўства ў літаратуры цікавяць дзённікі пісьменнікаў, іх мемуары, аўтабіяграфіі. Яны дапамагаюць зразумець умовы, у якіх працаваў пісьменнік, уплыў на яго творы асяроддзя, сяброў, цэнзуры і г.д. Пры гэтым, літаратурнае крыніцазнаўства цікавяць тыя ж праблемы, што і гістарычнае – праблема сапраўднасці крыніцы, наяўнасць іншых рэдакцый, час стварэння, аўтарства і г.д. З іншага боку ў гістарычным крыніцазнаўстве існуе спрэчка: ці можна лічыць літаратурны тэкст гістарычнай крыніцай? З аднаго боку – гэта прадукт творчасці аўтара, з іншага – адбітак сваёй эпохі. Таму суадносіны

[33] Там жа, с. 12 – 15.

крыніцазнаўства гісторыі і іншых навук можна прасачыць выключна праз феномен крыніцы. Узнікнуўшы ў ходзе гістарычнага працэса і зрабіўшыся аб'ектам вывучэння крыніца як бы ўвасабляе адзінства гісторыі і навуковагістарычнага пазнання. У самым шырокім крыніцазнаўчым разуменні крыніца – прадукт чалавечай псіхікі, адбітак думак і дзеянняў людзей мінулага ці ўсяго таго, што стварыў чалавек і да чаго ён меў дачыненне. Крыніца ў залежнасці ад таго, якая навука займаецца яе вывучэннем здольна даваць пэўны від інфармацыі. Аб'ём інфармацыі крыніцы неабмежаваны і залежыць толькі ад метадаў яе атрымання. Кожная навука карыстаецца сваімі метадамі, аднак у сучаснай гуманітарнай сферы назіраецца тэндэнцыя да ўзаемапранікнення метадаў розных навук, да міждысцыплінарнага сінтэзу.[34]

Традыцыйнае для крыніцазнаўства служэнне гістарычнай навуцы, якое дало аснову для яго трактоўкі ў якасці дапаможнай гістарычнай дысцыпліны, склалася і ажыццяўляецца ў двух напрамках: эўрыстычным і методыкааналітычным. Эўрыстычны напрамак – гэта арыентаваннне ў гістарычных крыніцах (агляд, класіфікацыя, характарыстыка асобных відаў і груп). Гістарычныя крыніцы складаюць базу для вывучэння развіцця грамадства ў межах гістарычнага працэса ў цэлым ці гісторыі асобных рэгіёнаў, краін. Методыка-аналітычны напрамак ажыццяўляе арыентаванне ў інфармацыі гістарычных крыніц з дапамогай распрацоўкі і ўдасканалення метадаў здабывання інфармацыі, аналіза яе якасці з пункту гледжання паўнаты, навізны і дакладнасці. З развіццём гістарычнай навукі абодва напрамкі напаўняюцца новым зместам. Пашырэнне функцый крыніцазнаўства вызначаецца новымі задачамі гістарычнай навукі, узбагачэннем яе праблематыкі, увядзеннем у навуковы зварот новых комплексаў крыніц, перспектыўных з пункту гледжання новых напрамкаў навуковых даследаванняў.

Актуальныя ў сучаснасці гісторыка-культурныя аспекты крыніцазнаўства. Гістарызм грамадскай свядомасці нельга адасобіць ад неабходнасці авалодання крыніцазнаўчамі крытэрыямі, ад умення падняцца на пэўны ўзровень абстракцыі ў рэальных жыццёвых сітуацыях, зразумець і ўбачыць, напрыклад, у фотаздымках сямейнага альбома, дзённіку, прадмеце хатняга ўжытку гістарычны помнік, захаваць яго як гістарычную крыніцу. Гісторыка-культурныя аспекты крыніцазнаўства шчыльна пераплецены тут з задачамі архівазнаўства, музеязнаўства, гісторыі мастацтва, аховай помнікаў гісторыі і культуры.[35]

[34] Гл.: Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособие, с. 104 – 108.
[35] Гл.: Никулин П.Ф., с. 11; Бандзелікаў М.Ф., с. 20.

## Практычны занятак

## План семінара:

1. Крыніцазнаўства як гуманітарная навука. Прадмет і аб’ект крыніцазнаўства.

2. Паняцці “гістарычная крыніца,” “гістарычны факт,” “гістарычны дапаможнік” і іх суадносіны.

3. Методыка і метадалогія, тэарэтычны і прыкладны ўзроўні крыніцазнаўства.

4. Месца крыніцазнаўства ў сістэме іншых навук.

## Тэмы рэфератаў:

1. Месца гісторыі і гісторыка ў разуменні прадстаўніка школы “Аналаў” М. Блока.

*(Па кнізе “Апалогія гісторыі, ці Рамяство гісторыка” М. Блока)*

2. Гістарычная крыніца ў святле вучэння аб інфармацыі.

*(Па кнізе “Метады гістарычнага даследавання” І.Д. Кавальчанка, с. 118 – 151)*

3. Паняцце “гістарычны факт” у розных навуковых канцэпцыях.

*(Па кнізе “Метадалогія гісторыі / пад рэд. А.Н. Алпеева і інш.”, с. 88 – 100)*

## Кантрольныя заданні да практычнага занятка “Прадмет і змест крыніцазнаўства”

### Заданне 1

**Да якой катэгорыі: “гістарычны факт,” “гістарычная крыніца,” “гістарычны дапаможнік,” “гістарычнае даследаванне” Вы б аднеслі наступныя рэчы:**

а) крыж Ефрасінні Полацкай, што зроблены ювелірам Лазарам Богшам у 1161 г.;

б) копію крыжа Ефрасінні полацкай, зробленую сучасным майстрам М. Кузьмічом;

в) “Апологію гісторыі, ці Рамяство гісторыка” Марка Блока;

г) “Хроніку Прускай зямлі” Пятра Дусбурга, напісаную па-лацінску і скончаную на 1326 г.;

д) рэканструкцыю старажытнага Ізяслаўля (Заслаўля), выкананую Ю.А. Зайцам;

е) сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы радзімічаў з курганнага могільніка Ветачка Рагачоўскага раёна;

ё) карціну В. Гардзеенка "Салют над Прыпяццю" 1957 г.

ж) скульптурную кампазіцыю ў г. Мінску "Архангел Міхаіл перамагае Дракона" скульптара І. Голубева.

### Заданне 2

**Якія агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады маглі б быць вакарыстаны ў наступных гістарычных даследаваннях:**

а)"Неаліт Беларускага Панямоння";

б)"Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягелонах";

в)"Жизнь Чернышевского";

г)"Астрономические сведения в изданиях Франциска Скорины";

д)"Беларускі фальклор".

### Заданне 3

**Суаднясіце паняццце і яго азначэнне:**

| | |
|---|---|
| 1. Дыпламатыка | а) спецыяльная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае паходжанне, форму і змест актавых крыніц для вызначэння іх сапраўднасці. |
| 2. Археаграфія | б) дапаможная дысцыпліна, якая займаецца распрацоўкай метадаў пошуку, бібліяграфічнага апісання літаратурных крыніц, мэтавым адборам і прадастаўленнем атрыманай інфармацыі даследчыку. |
| 3. Музеязнаўства | в) дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая распрацоўвае методыку пошуку і збору пісьмовых помнікаў, пытаннямі навуковага ўліку і апісання рукапісаў і рукапісных кніг, прынцыпамі і метадамі выдання тэкставых гістарычных крыніц. |
| 4. Архівазнаўства | г) навуковая дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці ўзнікнення і развіцця музейных адносін да рэчаіснасці, гісторыю музея як сацыяльнага інстытута і яго функцыі ў грамадстве, формы і спосабы рэалізацыі гэтых функцый на розных этапах грамадскага развіцця. |
| 5. Бібліяграфія | д) комплексная дысцыпліна, што вывучае гісторыю, арганізацыю, тэорыю і практыку работы архіваў у галіне ўліку, апісання, выкарыстання, забеспячэння захаванасці дакументаў, навуковую арганізацыю працы і эканоміку архіўнай справы. |

**Заданне 4**

**Да чаго прывёў так зв. “антрапалагічны пераварот” у гістарычнай навуцы?**

а) гісторыкі сталі імкнуцца напісаць “аб’ектыўную гісторыю”;

б) гісторыкі імкнуліся выкарыстоўваць метады запазычаныя з іншых гуманітарных навук: псіхалогіі, сацыялогіі і г.д.;

в) гісторыкі імкнуліся карыстацца толькі пісьмовымі крыніцамі;

г) з’явіліся новыя напрамкі ў гістарычнай навуцы – “гендэрная гісторыя,” “вусная гісторыя,” “псіхагісторыя” і г.д.

**Заданне 5**

**Дайце разгорнуты адказ на пытанне:**

Як суадносяцца прадметы крыніцазнаўства, гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін?

**Заданне 6**

**Што ўяўляе сабой “гістарычны факт” у пазітывісцкай трактоўцы?**

а) факты такія, як іх трактуе гісторык. Таму кожны гісторык піша “сваю” гісторыю;

б) гісторык можа інтуітыўна спасцігнуць гістарычныя факты;

в) сапраўды гістарычныя факты нам не вядомы, мы знаёмімся толькі з іх адлюстраваннем у крыніцах, таму няма магчымасці сапраўднага пазнання мінулага;

г) факты – гэта цаглінкі, з якіх складаецца рэальнасць. Няма прынцыповай розніцы паміж гістарычным і прыродазнаўчым пазнаннем.

**Заданне 7**

**Дайце адказы на наступныя пытанні:**

а) якая розніца паміж гістарычным фактам і гістарычнай крыніцай?

б) якая розніца паміж аб’ектам і прадметам крыніцазнаўства як навукі?

в) якая розніца паміж методыкай і метадалогіяй?

**Заданне 8**

**Растлумачце:**

а) чым эдыцыйная археаграфія адрозніваецца ад камеральнай археаграфіі?

б) чым эўрыстыка адрозніваецца ад бібліяграфіі?

в) чым наратыўныя крыніцы адрозніваюцца ад апавядальных?

**Заданне 9**

**Ці з'яўляюцца правільнымі наступныя выказванні:**

а) да агульнанавуковых метадаў адносяцца: гістарычны метад, лагічны метад, рэтраспектыўны метад, метад узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага, метад дыяхранічнага аналіза;

б) да спецыяльна-гістарычных метадаў адносяцца: гістарычны метад, гісторыка-сістэмны метад, гісторыка-параўнальны метад, метад аналогіі, метад дыяхранічнага аналіза;

в) крыніцазнаўства як навука выконвае наступныя функцыі: пазнавальную, маральна-этычную, методыка-аналітычную, эўрыстычную, выхаваўчую, прагнастычную, інструменталісцкую.

**Заданне 10**

**Дайце разгорнутый адказ на пытанне:**

Чым адрозніваецца **эўрыстычнае** і **методыка-аналітычнае крыніцазнаўства**?

**Заданне 11**

**Падумайце і паспрабуйце растлумачыць, у чым недахопы *метада класавага аналіза*?**

**Рэкамендаваная па модулю літаратура:**


1. Бернгейм, Э. Введение в историческую науку / Э. Бернгейм. – СПб., 1908.
2. Бернгейм, Э. Философия истории, ее истории и задачи / Э. Бернгейм. – М., 1910.
3. Блок, М. Апология истории, или Ремесло историка / перевод Е. М. Лысенко / под ред. А.Я. Гуревича – М., 1973.
4. Грицкевич, В. П., Каун, С. Б., Ходин, С.Н. Теория и история источниковедения: пособие для студентов гуманитарных факультетов / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. – Мн., 2000.
5. Источниковедение истории СССР: учебник / под. ред. И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., перераб. и доп. – М., 1981.
6. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособие / И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. – М., 1998.

7. Ланглуа, Ш.-В., Сенъобос, Ш. Введение в изучение истории / Ш.-В. Ланглуа, Ш. Сеньобос. – М., 1898.

8. Медушевская, О. М. Источниковедение и гуманитарная культура // Отечественные архивы. – 1992. – №4. – С. 11 – 19.

9. Медушевская, О. М. Источниковедение социалистических стран: учеб. пособие / О. М. Медушевская. – М., 1985.

10. Медушевская, О. М. Современная буржуазная историография и вопросы источниковедении: учеб. пособие / О. М. Медушевская. – М., 1979.

11. Медушевская, О. М. Современное зарубежное источниковедение: учеб. пособие для студентов ист. факультетов вузов / О. М. Медушевская. – М., 1983.

12. Медушевская, О. М. Теоретические проблемы источниковедения: учеб. пособие / О. М. Медушевская. – М., 1977.

13. Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов и аспирантов ист. и филос. специальностей учреждений, обеспечивающих получение высш. образования / под общ. ред. В. Н. Сидорцова. – Мн., 2006.

14. Пичета, В. И. Введение в русскую историю: (Источники и историографии) / В. И. Пичета. – М., 1922.

15. Хвостова, К. В. Количественные методы в истории // Вопросы истории. – 2002 – № 6 – С. 60 – 68.

## МОДУЛЬ 2
## ВЫЗНАЧЭННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ

### Змест праграмы:

**Прырода гістарычнай крыніцы.** Крыніца – адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага. Геаграфічнае асяроддзе як спецыфічная крыніца аб мінулым. Пазнавальная функцыя гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца як носьбіт сацыяльнай інфармацыі. Крыніца і гістарычная свядомасць грамадства. Фарміраванне прадстаўнічай сістэмы навукова-гістарычных фактаў.
**Гістарычная крыніца і дапаможнік**. Археалагічныя крыніцы. Музейны экспанат. Вызначэнне «гістарыяграфічнай крыніцы».

### Вучэбны матэрыял

У якасці базы гістарычнага пазнання выступаюць гістарычныя крыніцы. Найважнейшым этапам у структуры гістарычнага даследавання з'яўляецца фарміраванне яго крыніцазнаўчай базы. Наяўнасць у гісторыка крыніц для даследавання – абавязковая ўмова яго навуковай дзейнасці. Невыпадкова навукоўцы такую ролю надаюць праблеме крыніцы як носьбіта інфармацыі аб мінулым, яе прыродзе і яе пазнавальным магчымасцям. **Гістарычнымі крыніцамі** з'яўляюцца матэрыяльныя аб'екты, што створаны ў працэсе чалавечай дзейнасці і выкарыстоўваюцца даследчыкамі для атрымання дадзеных аб працэсах грамадскага развіцця.[1] Пад гэта азначэнне трапляюць ўсе аб'екты культуры, створаныя чалавекам ў працэсе ўсялякай свядомай дзейнасці. У той жа час не выключана ўключэнне ў сферу цікавасці гісторыка дадзеных аб геаграфічным асяроддзі, умовах жыцця людзей дадзенага гістарычнага часу, калі гэтыя ўмовы ўзніклі ў выніку дзейнасці чалавека, г.зн. створаны чалавекам, а не прыродай. У сувязі з вызначэннем паняцця крыніцазнаўства важна падкрэсліць, што чалавечая дзейнасць мае **сацыяльную прыроду** і з'яўляецца камунікатыўнай. Найбольш інфарматыўны тыя аб'екты рэчаіснасці, якія ўжо ў момант стварэння запраграмаваны на ажыццяўленне камунікатыўных функцый – перадачу інфармацыі ў часе і прасторы, для гэтага інфармацыя замацоўваецца на матэрыяльным носьбіце. Таму крыніцы, якія ўтрымліваюць інфармацыю закадзіраваную знакавымі сістэмамі, найбольш інфарматыўны і складаюць асноўны аб'ект вывучэння крыніцазнаўства. Кожны дакумент, кожны матэрыяльны прадукт чалавечай дзейнасці мае акрамя непасрэднага мэтавага

[1] Медушевская О. М. Современное зарубежное источниковедение, с. 16.

прызначэння яшчэ і другое прызначэнне – з'яўляецца патэнцыйнай гістарычнай крыніцай, можа выкарыстоўвацца для атрымання дадзеных аб працэсах гістарычнага развіцця свайго часу. Прадукт матэрыяльнай і духоўнай культуры (гістарычны помнік) ствараецца чалавекам з пэўнымі мэтамі, мае сваё практычнае прызначэнне. Калі ён пачынае выкарыстоўвацца для атрымання інфармацыі, ён ператвараецца ў крыніцу інфармацыі, а калі гэтая інфармацыя аб мінулым, то ён становіцца гістарычнай крыніцай. Напрыклад, кожны музейны экспанат меў у мінулым непасрэднае практычнае значэнне. Зрабіўшыся музейным экспанатам, ён ператвараецца для нас у крыніцу, якая нясе інфармацыю аб гісторыі і культуры свайго часу. Вывучаць гістарычную крыніцу можна толькі зыходзячы з таго, якімі прычынамі выклікана яе з'яўленне, якое месца яна займала ў сваім часе. Інфармацыя крыніцы не толькі адлюстроўвае гістарычную рэчаіснасць, але і прадстаўляе даследчыку складальніка тэкста. Праз тэкст выяўляецца сістэма каштоўнасцяў, асаблівасці мыслення, светаўспрымання, мэты і інтарэсы аўтара. Такім чынам, інфармацыйная форма крыніцы *перадае суб'ектыўна-аб'ектыўную структуру мінулага.*[2] Разам з тым, тэкст крыніцы *перадае мінулае няпоўна,* у асноўных яго інфармацыйных вузлах і сувязях. Да гісторыка ў асноўным даходзяць звесткі аб сацыяльных інстытутах, правячых саслоўях, дзяржаве. Інфармацыя аб іншых аб'ектах сацыяльнай рэчаіснасці заўсёды другасная. Напрыклад, звесткі аб жыцці сялян XVIII ст. можна знайсці ў архівах дзяржаўных устаноў. У XIX ст. матэрыялы аб сялянах папоўніліся навуковымі даследаваннямі (статыстычнымі, фальклорнымі і інш.). “Сялянскія” пісьмовыя крыніцы малакольккасныя, што абумоўлена вусным характарам народнай культуры. Асноўная маса пісьмовых крыніц так званага дарэвалюцыйнага перыяда адлюстроўвае культуру і ідэалогію правячага класа і інтэлігенцыі. Акрамя таго, *мінулае ў тэксце прадстаўлена ў абагуленай, знакава-сімвалічнай форме.*[3] Таму, абапіраючыся на крыніцы, гісторык можа складаць толькі прыблізную, лагічную мадэль гістарычнай рэальнасці. Разам з тым, разнастайнасць знакава-паняційных сістэм дазваляе даследчыку пабудаваць дастаткова поўны малюнак. Вобразная інфармацыя перадае знешні бок падзей, яе сімвалічная форма нясе каштоўнасці, ідэалы, ідэі. Славесна-паняційная інфармацыя адлюстроўвае як знешні, так і ўнутраны, сутнасны бок гістарычных з'яў. Таму гісторык павінен працаваць з усім комплексам

[2] Там жа, с. 22.
[3] Гл.: Никулин П.Ф. Теория и методика источниковедения в отечественной истории X – начала XX вв., с. 15.

гістарычных крыніц, выкарыстоўваць ўсю іх інфармацыйную і відавую разнастайнасць. Можна сфармуляваць і *інфармацыйнае вызначэнне* крыніцы:

***Гістарычная крыніца*** – гэта рэштка пісьмовага інфармацыйнага абмена ў мінулым, які ў знакава-паняційнай, тэкставай форме перадае інфармацыю аб рэальным мінулым. Тэкст крыніцы аб сацыяльным аб'екце выкарыстоўваецца для пабудовы вобразна-лагічнага малюнка мінулага.[4]

Гістарычная крыніца – паняцце шматграннае, паколькі шматаспектна яе прырода. Існуе некалькі падыходаў у разуменні гістарычнай крыніцы:

Даследчык пачатку XX ст. **А. С. Лапо-Данілеўскі** разумее **гістарычную крыніцу** як "рэалізаваны прадукт чалавечай псіхікі, прыдатны для вывучэння фактаў з гістарычным значэннем".[5] Такім чынам, інтэрпрэтаваць гістарычную крыніцу азначала зразумець яе аўтара – чалавека мінулага. Яго канцэпцыя была лагічна працягнута ў дзейнасці навукова-педагагічнай школы Маскоўскага гісторыка-архіўнага інстытута. Прынцыповымі з'яўляюцца тры асноўныя моманты: 1) вызначэнне паняцця "гістарычнай крыніцы" (прадмет даследавання); 2) структуры крыніцазнаўчага аналіза (метад даследавання); 3) значнасці свядомасці даследчыка ў гістарычным пазнанні (метадалогія). Прадстаўнікі дадзенай школы разумеюць гістарычнае пазнанне як рэканструкцыю мінулага. У аснове такога пазнання дыялог паміж свядомасцю даследчыка і свядомасцю людзей мінулага. Крыніцазнаўчы аналіз і сінтэз разумеецца як сістэма даследчых працэдур ніводная з якіх не можа быць ігнаравана без страт для аб'ектыўнасці. Першаснае значэнне надаецца характарыстыцы аўтара, абставінам стварэння крыніцы, яе значэнню ў гістарычнай рэальнасці мінулага. Толькі пасля высвятлення дадзеных аспектаў, даследчык можа перайсці да інтэрпрэтацыі інфармацыі крыніцы. Адсюль азначэнне **гістарычнай крыніцы як прадукта культуры**, аб'ектывізаванага выніка дзейнасці людзей. Пры гэтам крыніца з'яўляецца адзіным аб'ектам даследавання гуманітарных навук пры разнастайнасці іх прадметаў вывучэння. Яна стварае адзіную аснову для міждысцыплінарнага даследавання і інтэграцыі навук, а таксама для параўнальна-гістарычнага аналіза.[6]

---

[4] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 128 – 129.

[5] Гл.: Медушевская О.М., с. 16.

[6] Гл.: Приймак Н.И. Становление и развитие источниковедения отечественной истории в Петербургском-Ленинградском университете (2-я пол. XIX – 70 гг. XX в.) // Историография и источниковедение отечественной истории: сб. научных статей. – СПб., 2001, с. 11; Бандзелікаў М.Ф., с. 8 – 9; Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособие, с. 71 – 76.

У **марксісцкай канцэпцыі** гістарычная крыніца разумелася як сховішча фактаў, неабходных гісторыку для рэканструкцыі інварыянтнага мінулага. Таму крыніцазнаўчы метад ператвараўся ў рамках гэтай канцэпцыі ў "тэхніку" здабывання карыснай гісторыку інфармацыі. Гістарычная крыніца разумелася як сацыяльная з'ява, што існавала незалежна і аб'ектыўна ў адносінах да вывучаўшага яе гісторыка. Аснову вырашэння пытанняў аўтарства і паходжання крыніц давала катэгорыя сацыяльна-эканамічнай фармацыі і вучэнне аб класавай барацьбе. Класавы аналіз падыходзіў да крыніцы як да сацыяльна-абумоўленай з'явы, стварэнне крыніц тлумачылася імкненнем праявіць свае інтарэсы рознымі класамі грамадства. Асноўным метадам пазнання гэтай школы стала больш-менш дакладнае мадэляванне адзінага магчымага мінулага. Змена метадалагічных установак прывяла ў постсавецкім грамадстве да страты метадалагічных асноў. Пры гэтам значная частка даследчыкаў працягвае карыстацца старымі прыёмамі. Вынікам стала імкненне напісаць "аб'ектыўную гісторыю", без перагляда ўласна даследчага метадалагічнага апарата. У сучаснасці робяцца спробы па-новаму падысці да крыніцазнаўчага аналіза і сінтэза.[7]

Абодва падыходы не адмаўляюць **сацыяльнай прыроды** крыніцы як выніка чалавечай дзейнасці. Даследаваць крыніцу, у такім разе, магчыма толькі зыходзячы з прычын з'яўлення крыніцы, вызначэння яе функцый. Узнікшы ў ходзе сацыяльных працэсаў і зрабіўшыся затым аб'ектам гістарычнага вывучэння, крыніца ўвасабляе ў сабе метадалагічнае адзінства гісторыі як працэса і навуковага гістарычнага пазнання.

**Гістарычнай крыніцай** называецца матэрыяльны прадмет, які ўтрымлівае інфармацыю аб мінулым і ўключаны ў працэс навуковага даследавання.[8] У навуковым крыніцазнаўстве разуменне прыроды гістарычнай крыніцы і метадалогіі гістарычнага працэса непадзельны. Крыніцазнаўчае даследаванне вядзецца па двух аспектах: **тэарэтыка-метадалагічным** і **канкрэтна-гістарычным**. Тэарэтычна-метадалагічны аспект мае два напрамкі. Адзін звязаны з распрацоўкай агульных тэарытычна-метадалагічных праблем крыніцазнаўства. У цэнтры ўвагі тут знаходзяцца пытанні аб крыніцах як носьбітах звестак аб мінулым, аб іх сацыяльнай прыродзе, аб суадносінах суб'ектыўнага і аб'ектыўнага, аб паўнаце і праўдзівасці адлюстравання гістарычнай рэчаіснасці, аб тыпах і відах крыніц, аб інфармацыйных магчымасцях крыніц, аб асноўных прынцыпах, шляхах і метадах навуковай крытыкі крыніц, аб апрацоўцы і аналізе звестак гістарычных крыніц.[9]

---

[7] Гл.: Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории, с. 9 – 100.
[8] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 6.
[9] Гл.: Медушевская О.М., с. 8 – 10.

Другі напрамак тэарэтычна-метадалагічнага гістарычнага даследавання можна вызначыць як гістарычна-тыпалагічны. Ён звязаны з вывучэннем сукупнасці ці асобных відаў крыніц той ці іншай эпохі як з’яў гістарычнай рэчаіснасці, г.зн. з разглядам крыніц у анталагічным аспекце. У цэнтры ўвагі ў такім выпадку апынуліся пытанні аб заканамернасцях узнікнення і эвалюцыі відаў крыніц, аб ролі, якую яны адыгралі для іх творцаў і сучаснікаў, аб уплыве на адэкватнасць, метады і формы адлюстравання суб’ектыўнай прыроды крыніц, іх мэтавага прызначэння, дасягненняў культурнай творчасці эпохі і г.д. Такі напрамак развіты ў адносінах да крыніц сярэднявечча. У апошнія часы ён распаўсюдзіўся і на крыніцы перыяда новага і найноўшага часу.[10]

Галоўная сярод прыкладных задача крыніцазнаўства – павышэнне інфармацыйнасці крыніц. Такая патрэба абумоўлена тым, што існуе розніца паміж запатрабаваннямі гісторыка ў адносінах да інфармацыі крыніцы і тым, што непасрэдна адлюстравана ў крыніцы. Гэтая задача вырашаецца шляхам прыцягнення новых, раней невядомых гістарычных крыніц і шляхам больш глыбокага вывучэння ўжо вядомых крыніц. Першы шлях, як і любы экстэнсіўны шлях, абмежаваны. Таму распрацоўка прынцыпаў, шляхоў і метадаў павышэння інфармацыйнай аддачы крыніц становіцца ўсё больш актуальнай задачай крыніцазнаўства.[11]

Чалавечая дзейнасць прадстаўляе ўзаемадзеянне суб’екта з сацыяльнай рэчаіснасцю. Такое ўзаемадзеянне характарызуецца дзьвума супрацьлеглымі, але непарыўна звязанымі паміж сабой момантамі: суб’ектывізацыяй рэчаіснасці і аб’ектывізацыяй самога сябе ў прадуктах сваёй дзейнасці. Такім чынам, гістарычная крыніца – прадукт мэтанакіраванай дзейнасці чалавека – уяўляе сабой супярэчнае *адзінства аб’ектыўнага і суб’ектыўнага*; яны ўзаемапранікаюць адно ў другое, не існуюць адно без другога.[12] Працэс суб’ектывізацыі аб’ектыўнай рэальнасці і аб’ектывізацыі суб’екта – стваральніка крыніцы працякае ў розных формах. Працэс чалавечай дзейнасці можа быць прадстаўлены як інфармацыйны працэс, у якім удзельнічае суб’ект – творца крыніцы і аб’ект – адлюстроўваемая рэчаіснасць. Гэты працэс, як і любы інфармацыйны працэс, мае пэўную мэту. Такой мэтай з’яўляецца перадача звестак аб мінулым. Але крыніца

[10] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 244 – 249.
[11] Гл. там жа, с. 134.
[12] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 7.

можа быць створана і не спецыяльна для перадачы інфармацыі, яна можа абслугоўваць іншыя патрэбы людзей (напрыклад, пабытовая рэч). Таму крыніца перш з'яўляецца прадуктам дзейнасці, сацыяльных адносінаў, гістарычных падзей і працэсаў. Такім чынам, крыніца не толькі адлюстроўвае аб'ектыўную рэальнасць, а і сама з'яўляецца яе неад'емным кампанентам. Паколькі ў працэсе стварэння крыніцы аб'ектыўная рэчаіснасць перадаецца праз суб'ект і адначасова сам суб'ект у якасці аб'екта адлюстроўваецца ў крыніцы, яна мае інфармацыю апасродкаваную і непасрэдную. *Апасродкаванай* з'яўляецца такая інфармацыя, якая трапляе ў крыніцу праз свядомасць суб'екта, праз яго асэнсаванне аб'ектыўнай рэчаіснасці. На адэкватнасць інфармацыі ўплывае свядомасць суб'екта.

*Непасрэдная інфармацыя* – такая, у якой аб'ект адлюстроўваецца прама, без "пасрэдніка". Гэта непасрэднае адлюстраванне пазнаецца праз мэты, якіх намагаецца дасягнуць стварэннем гэтай крыніцы яе творца, праз метады і формы ўспрымання аб'ектыўнай рэальнасці і г.д. Наяўнасць у крыніцы непасрэднай інфармацыі аб яе стваральніку з'яўляецца аб'ектыўнай асновай для выяўлення ступені адэкватнасці адлюстравання ў ёй гістарычнай рэчаіснасці. З пункту гледжання культуралагічнага падыхода, даследчык сам уключаны ў кантэкст сучаснай яму культуры, таму праца гісторыка з гістарычнай крыніцай – гэта ўзаемадзеянне дзвюх культур: стваральніка тэкста і даследчыка. Гісторык прадстаўляе актыўны бок – ён арганізуе ўзаемадзеянне. Ён нават можа навязваць крыніцы свае сэнсы і тлумачыць яе сэнс у сістэме сваіх каштоўнасцяў. Аднак гэта закранае рэальна існаваўшае мінулае. Таму адзіна праўдзівы шлях да мінулага – вывучыць, зразумець сістэму каштоўнасцяў, ідэалаў, сімвалаў даследуемай культуры. Грунтуючыся на гэтым, можна вызначыць прызначэнне, сацыяльную і культурную функцыі тэкста і яго суб'ектыўна-сэнсавы бок. Гэта дазволіць ацаніць фактычны змест крыніцы, вызваліць яго ад суб'ектыўна-культурных скажэнняў і пабудаваць аб'ектыўнае ўяўленне аб мінулым. [13]

Можна сфармуляваць сацыяльна-філасофскае вызначэнне гістарычнай крыніцы:

**Гістарычныя крыніцы** – гэта прадукты мінулай суб'ектыўна-культурнай, сацыяльнай і псіхічнай дзейнасці людзей, якія ўтрымліваюць у сабе аб'ектыўныя дадзеныя аб сацыякультурным мінулым цывілізацыі (краіны) і выкарыстоўваюцца ў працэсе гістарычнага пазнання. Гістарыч-

[13] Гл.: Бандзелікаў М.Ф., с. 24 – 28.

ныя крыніцы варта адрозніваць ад гістарычных помнікаў. *Гістарычныя помнікі* гэта таксама рэшткі мінулага. Аднак яны, у адрозненні ад крыніц, не выкарыстоўваюцца ў працэсе гістарычнага даследавання.

Як ужо было адзначана (гл. модуль 1), **рэчавыя крыніцы** – гэта любыя матэрыяльныя аб’екты, створаныя працай чалавека і якія ўтрымліваюць інфармацыю аб мінулым. У пэўных абставінах для гісторыка сучаснасці крыніцай можа з’яўляцца і гістарычны дапаможнік мінулага (напрыклад, працы М. Стрыйкоўскага, В. Тацішчава і г.д.).[14] **Гістарычны дапаможнік** – гэта мадэль, заснаваная на дадзеных крыніцы, якая дазваляе вывучаць падзеі мінулага. У якасці дапаможніка могуць выступаць і рэчы (напрыклад, рэканструяваныя прылады працы). Пытанне аб суаднясенні паняццяў археалагічнай крыніцы, музейнага экспаната, гістарыяграфічнай крыніцы разглядалася ў папярэднім модулі (гл. модуль 1).

Археалагічныя крыніцы ўяўляюць прадметы, знойдзеныя пры археалагічных раскопках ці выпадкова. Археолаг Л.С. Клейн лічыць, што істотнай прыкметай археалагічных крыніц з’яўляецца тое, што страчаны спосаб іх функцыянавання ў культуры.[15] Музейныя прадметы – гэта крыніцы, якія знаходзяцца ў экспазіцыі і фондах музеяў. Тэрмін “музейны экспанат” часта выкарыстоўваецца ў якасці сіноніма паняцця “музейны прадмет,” але ён абазначае тыя крыніцы, якія знаходзяцца ў экспазіцыі музея. Рэчавыя крыніцы ўключаюць у сябе і археалагічныя крыніцы і музейныя прадметы. Рэчавыя крыніцы класіфікуюцца па наступных крытэрыях: выконваемай функцыі, матэрыялу выканання. Паводле функцыянальнага крытэрыя можна вылучыць наступныя групы: архітэктурныя пабудовы, зброю, прылады працы, мэблю, посуд, вопратку, абутак, транспартныя сродкі, упрыгожанні і г.д. Паводле матэрыяла вырабу: каменныя і драўляныя пабудовы; каменную, металічную, зброю і інш. У заходняй археалогіі прынята выкарыстоўваць тэрмін “артэфакт”, які па вызначэнню блізкі да паняцця “рэчавая крыніца”. Артэфакт – гэта любы аб’ект, зроблены ці зменены чалавекам. Рэчавая крыніца з’яўляецца носьбітам інфармацыі, уключае і функцыянальныя рэчы і тое, што мы адносім да твораў мастацтва. Вывучаючы і інтэрпрэтуючы археалагічныя, рэчавыя крыніцы археалогія як бы перакладае інфармацыю з “мовы рэчаў” у зразумелую нам знакавую форму.

---

[14] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 6.
[15] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 7.

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Крыніца – адзінства аб’ектыўнага і суб’ектыўнага.
2. Пазнавальная функцыя гістарычнай крыніцы.
3. Сацыяльная прырода гістарычнай крыніцы.
4. Тэарэтыка-метадалагічны і канкрэтна-гістарычны аспекты крыніцазнаўчага даследавання.

### Тэмы рэфератаў:

1. Гістарычная крыніца ў трактоўцы А. С. Лапа-Данілеўскага.
2. Гістарычная крыніца ў трактоўцы І. Д. Кавальчанкі.
3. Гістарычная крыніца з пункту гледжання культуралагічнага падыхода Расійскага гуманітарнага універсітэта *(па кнізе: Данилевский И. Н, Кабанов В. В., Медушевская О. М., Румянцева М. Ф. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учеб. пособие. – М., 1998.).*

## Кантрольныя заданні да практычнага занятка
## “Вызначэнне гістарычнай крыніцы”

### Заданне 1

**Растлумачце:**

а) Чым адрозніваюцца паняцці *“гістарычны помнік,” “інфармацыйная крыніца,” “гістарычная крыніца.”*

б) Чаму сцвярджаюць, што чалавечая дзейнасць мае *сацыяльную прыроду*?

в) Чаму кажуць, што крыніца перадае *суб’ектыўна-аб’ектыўную структуру мінулага*?

### Заданне 2

Звярнуўшыся да вучэбнага матэрыяла **модуля 1** узгадайце ланцуг гістарычнага пазнання: *ад факта рэчаіснасці – да факта крыніцы, а ад яго – да навукова-гістарычнага факта.* **Якое месца адводзіцца даследчыку ў такой мадэлі гістарычнага пазнання?**

**Заданне 3 ****

**Падумайце, якія высновы можа зрабіць гісторык аб сацыяльным становішчы аўтара крыніцы**, калі крыніца ўтрымлівае наступныя суб'ектыўныя звесткі: *"В року шесот третем за шесть недель перед Великоднем водлуг старого календара кобыла сивая жеребилася"*. Хто мог зрабіць такі запіс: магнат, дробны шляхціч, заможны пан, мяшчанін?

**Заданне 4**

**Прадстаўнікі якой школы ў крыніцазнаўстве разумеюць гістарычнае пазнанне *як рэканструкцыю мінулага*?**

а) марксіскай школы;

б) школы Аналаў;

в) школы Маскоўскага гісторыка-архіўнага інстытута.

**Заданне 5**

**Суаднясіце праблемы з наступнымі аспектамі крыніцазнаўчага даследавання:**

| | |
|---|---|
| **1. Тэарэтыка-метадалагічны аспект** | а) Праблема суб'ектыўнага і аб'ектыўнага ў крыніцы |
| | б) Праблема паўнаты і праўдзівасці крыніцы |
| | в) Праблема тыпаў і відаў крыніц |
| **2. Канкрэтна-гістарычны аспект** | г) Праблема інфармацыйных магчымасцяў крыніцы |
| | д) Праблема метадаў навуковай крытыкі крыніц |
| | е) Праблема эвалюцыі крыніц |

**Заданне 6**

**Як называецца інфармацыя, што трапляе ў крыніцу папярэдне прайшоўшы праз свядомасць суб'екта?**

а) ускосная;

б) прамая;

в) непасрэдная;

г) апасродкаваная;

д) аб'ектыўная.

** Скарыстана заданне з кнігі Теория и история источниковедения: учеб.-метод. комплекс / С.Б. Каун, О.А. Липницкая, С.Н. Ходин. – Мн., 2001.

**Рэкамендаваная па модулю літаратура:**

1. Бандзелікаў, М. Ф. Асновы тэорыі і методыкі крыніцазнаўства: вучэб. дапам. / М. Ф. Бандзелікаў. – 2-е выд., стэр. – Мн., 2004.

2. Введение в специальные исторические дисциплины: учеб. пособие / Т. П. Гусарова, О. В. Дмитриева, И. С.Филлипов и др. – М., 1990.

3. Грицкевич, В. П., Каун, С. Б., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. – Мн., 2000.

4. Данилевский, И. Н, Кабанов, В. В., Медушевская, О. М., Румянцева, М. Ф. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учебное пособие / И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. – М., 1998.

5. Илизаров, С. С. Некоторые проблемы изучения источниковой базы истории науки // Теория и методика историографических и источниковедческих исследований. Межвузовский сборник научных трудов. – Днепропетровск, 1989. – С. 140 – 145.

6. Источниковедение истории СССР: учебник / под. ред. И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., перераб. и доп. – М., 1981.

7. Каштанов, С. М. Русская дипломатика: учеб. пособие для вузов по спец. «История» / С. М. Каштанов. – М., 1988.

8. Каун, С. Б. Теория и история источниковедения: учеб.-метод. комплекс / С. Б. Каун, О. Л. Липницкая, С. Н. Ходин. – Мн., 2001.

9. Книга в России: проблемы источниковедения и историографии: сб. научных трудов. – Санкт-Петербург, 1991.

10. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., доп. – М., 2003.

11. Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 1. / адк. рэд. С. М. Ходзін. – Мн., 2002.

12. Медушевская, О. М. Современное зарубежное источниковедение: учеб. пособие для студентов ист. факультетов вузов / О. М. Медушевская. – М., 1983.

13. Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / под общ. ред. В. Н.Сидорцова. – Мн., 2006.

14. Пронштейн, А. П., Задера, А. Г. Методика работы над историческими источниками / А. П. Пронштейн, А. Г. Задера. – М., 1977.

15. Пронштейн, А. П. Источниковедение в России. Эпоха феодализма / А. П. Пронштейн. – Ростов: Изд.-во Ростовского университета, 1989.

16. Пронштейн, А. П. Методика исторического источниковедения / А. П. Пронштейн. – Ростов-на-Дону, 1976.

17. Сборник документов для практических занятий по источниковедению истории СССР. Вып. 1. Эпоха феодализма: учеб. пособие. / под. ред. И. Д. Ковальченко. – М., 1980.

18. Сидорцов, В. Н. Методология исторического исследования (механизм творчества историка) – Мн., 2000.

19. Шахматов, А. А. Обозрение русских летописных сводов XIV – XVI вв. / А. А. Шахматов. – М., 1972.

20. Ходзін, С. М. Летапісанне на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 81 – 82.

# МОДУЛЬ 3
# ГІСТОРЫЯ КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

## Змест праграмы:

**Перадумовы зараджэння крыніцазнаўства як навукі.** Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных аўтараў. Гістарычная крыніца ў творах сярэдневечча. Ідэі Адраджэння і станаўленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц.

**Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства ў новы час.** Крытыка тэкстаў гістарычных крыніц Італіі. Выданні крыніц у Францыі, Англіі, Германіі. Зараджэнне расійскай школы крыніцазнаўства. Развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай імперыі. Назапашванне практычнага вопыту работы з крыніцамі па гісторыі феадалізму. Неабходнасць асэнсавання гістарычных крыніц у канцы XIX – пачатку XX ст. Распрацоўка тэорыі і методыкі гістарычнага крыніцазнаўства. Стварэнне першых навучальных дапаможнікаў і манаграфій па пытаннях крыніцазнаўства. Ш.-В. Ланглуа, Ш. Сеньабос. В. В. Ключэўскі. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства. А. С. Лаппо-Данілеўскі.

**Развіццё крыніцазнаўства ў навейшы час.** Дыскусіі аб сутнасці гісторыі і ролі гістарычных крыніц. М. Блок. Распрацоўка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі. С. О. Шмідт, В. М. Медушэўская і інш. Колькасныя метады вывучэння крыніц І. Д. Кавальчанка. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. Дз. І. Даўгяла, У. І. Пічэта, М. М. Улашчык і інш.

## Вучэбны матэрыял

### Перадумовы зараджэння крыніцазнаўства як навукі.

Фарміраванню крыніцазнаўства як асобнай навуковай дысцыпліны папярэднічаў перыяд назапашвання практычнага вопыту працы гісторыкаў з гістарычнымі крыніцамі. Гісторыкі ранняга сярэднявечча карысталіся любым пісьмовым тэкстам як крыніцай, калі давяралі аўтарытэту таго, каму належыла крыніца. Аўтарытэт не прадугледжваў крытычнай праверкі. Умовай аўтарытэтнасці крыніцы было прызнанне яе аўтара царквой.

Пачатак крытыкі крыніц звязваюць з пачаткам распрацоўкі дыпламатыкі. Пачатак сярэднявечнай крытыкі крыніц (актаў) ўмоўна датуецца 590 годам. Гэтым годам у “Гісторыі франкаў” Рыгора Турскага зафіксавана паведамленне аб тым, што рэфендары Аттон вызначыў падробку подпісу на грамаце, выдадзенай каралём Хільбертам II рэймскаму біскупу Эгідыю.

У сувязі з частай падробкай папскіх бул у 1198 г. з'явілася пасланне папы Інакенція III, дзе тлумачыліся спосабы адрознення сапраўдных і падробных актаў. У гэтым дакуменце быў сканцэнтраваны назапашаны вопыт праверкі сапраўднасці дакументаў. У XIII – XIV стст. праца па верыфікацыі дакументаў разгарнулася ў Германіі, Францыі, Італіі, Польшчы. Паняцце падробкі ("составной" граматы) было выпрацавана і на Русі. Шэраг летапісных зводаў паведамляе пад 1487/88 г. аб падробцы "жалаванай граматы" валагодскага князя Андрэя Васільевіча Меншага (памёр у 1481 г.) Спаса-Каменскаму кляштару. [1]

Удасканаленню інтэрпрэтацыі крыніц садзейнічала складанне зборнікаў копій грамат. Такія зборнікі называліся ў Заходняй Еўропе капітулярыямі (ад лац. charta, carta – ліст, грамата, кніга), а на тэрыторыі Русі – "капійныя кнігі" (ад слова "*копия*"). Складаліся яны ў практычных мэтах – для ўмацавання землеўласніцкіх правоў, прывілеяў, уліку дакументацыі і г.д. У Заходняй Еўропе капітулярыі вядомы з X ст., але ў "Гісторыі" Рыгора Турскага ёсць звесткі аб іх існаванні ўжо ў VI ст. У X ст. капітулярыі складаліся ў біскупствах, кляштарах, цэрквах і г.д. Але існавалі і капітулярыі цэхаў, універсітэтаў, брацтваў, сямей, каралеўскіх канцэлярый і г.д. У Вялікім княстве Літоўскім капітулярыі ствараліся ўжо ў XV ст. –1-й пал. XVI ст., але ў пач. XVII ст. былі страчаны. Ад 1-й пал. XVI ст. захаваліся толькі дзве сапраўдныя кнігі (каля 1514 г. і 1516 г.), іншыя дайшлі ў копіях кан. XVI ст. Кнігі XVII – XVIII стст. з'яўляюцца сапраўднымі. У XVIII ст. у канцэлярыі Рэчы Паспалітай распаўсюджваюцца рэгістры тыпу рэгестаў (кнігі сігілят – дакументаў, на якіх стаяла пячатка). У Расіі першыя капійныя кнігі складзены не пазней XV ст.[2]

Прыкладам крытыкі крыніцы з'яўляецца доказ несапраўднасці т.зв. **"Канстанцінавага дара"** – граматы, якой нібыта імператар Канстанцін I (306 – 337 гг.) падараваў папу рымскаму Сільвестру I (314 – 335 гг.) уладу над заходняй часткай Рымскай Імперыі, уключаючы Італію. У канцы XIX ст. П. Шеффер-Бойхарст на падставе дыпламатычна-філалагічнага аналіза тэкста датаваў дакумент часам паміж 750 і 780 гг. і аднёс да перыяда Паўла I (757 – 767 гг.). Пазней даследчык дакумента В. Шлезінгер датаваў яго пазней 806 г., а даследчык Х. Фурман лічыць, што грамата ўзнікла не пазней XI ст. Тэкст "Канстанцінавага дара" ўпершыню з'яўляецца ў канчатковай рэдакцыі ў так званых *ілжэісідоравых дэрэкталіях* – зборніку сяр. IX ст., які паходзіў з заходнефранкскага рэгіёна Каралінгскай імперыі. Магчыма,

[1] Каштанов С.М. Русская дипломатика: учеб. пособие, с. 28 – 29.
[2] Каштанов С.М., с. 30.

яму папярэднічаў тэкст больш ранняй рэдакцыі, аб якім можна меркаваць па некаторых рукапісах IX – X ст. Гэтыя рукапісы паходзілі не з Італіі і Рыма. Першая спасылка на "Канстанцінаў дар" з'явілася ў папскім пасланні і адносіцца да 979 г., папа Леў IX першым скарыстаў у 1053 г. "Канстанцінаў дар" для прэтэнзій царквы. Крыніцай падробкі магло быць жыццё Сільвестра, дзе казалася, што на чацвёрты дзень пасля хрышчэння Канстанцін даў папе прывілей, па якому той прызнаваўся першым сярод духоўных асобаў. Даследчык В. Шлезінгер высветліў, што тытул Канстанціна ў фальшыўцы адпавядае тытулу Карла Вялікага ў дакументах, значыць мог быць запазычаны. [3]

Ва ўмовах Адраджэння ў Еўропе аналіз сярэднявечных дакументаў набыў новую актуальнасць. Распрацоўка навуковых прыёмаў аналіза дакументаў пачалася з вывучэння канкрэтных дакументаў. Захавальнік французскага каралеўскага архіва Жэрар дэ Мантэгю склаў цэлы зборнік практычных заўваг аб актах. Паэт Петрарка ў пасланні імператару Карлу IV (1361 г.) абверг сапраўднасць прывілеяў Цэзара і Нерона Аўстрыі, аб якіх казалася ў падцвярджальнай грамаце караля Генрыха IV (1058 г.) маркграфу Эрнсту Аўстрыйскаму.

Італьянскі гуманіст Ларэнца Валла каля 1443 г. напісаў трактат аб несапраўднасці "Канстанцінавага дара". У пач. XVI ст. спецыяльны трактат аб граматах склаў швейцарскі юрысконсульт Іахім дэ Ватт (1484 – 1551 гг.). У перыяд Рэфармацыі з крытыкай некаторых папскіх дакументаў выступіў Ульрых фон-Гуттэн. Славянскі гуманіст Матвей Франковіц у сваёй "Гісторыі царквы" (у 13 т., 1560 – 1574 гг.) даказаў несапраўднасць некаторых дакументаў, што імкнуліся замацаваць царкоўныя прывілеі.[4]

**Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства ў новы час.**

У XVII ст. шырока разгарнулася публікацыя дакументальных крыніц. У 1626 г. з'явіўся зборнік, які ўключаў шэраг грамат, што захоўваюцца ў архіве Сэн-Дэні. Каштоўныя зборнікі дакументаў былі выдадзены ў Францыі ў 2-й пал. XVII ст., у вывучэнні актаў панаваў скептычны напрамак. У 1655 г. англічанін **Дж. Марш** выступіў са сцвярджэннем, што чым старажытней акт, тым ён больш падазроны. Найбольш грунтоўнай крытычнай працай гэтага перыяду лічыцца кніга Германа Конрінга (1606 – 1681 гг.), якога ў Германіі нават лічылі заснавальнікам дыпламатыкі. Вывучэннем актаў займаўся таксама манах-бенедыктынец **Жан Мабільён** (1632 – 1707 гг.), які прааналізаваў імператарскія граматы, папскія булы за

[3] Там жа, с. 36 – 37.
[4] Там жа, с. 40.

перыяд з V па XII стст. уключна. Праца Мабільёна лічыцца асновай навуковай дыпламатыкі, у ёй выкладзены прынцыпы аналіза дакументаў, якія доўгі час выкарыстоўвалі ў Францыі, Іспаніі, Англіі і інш. Паслядоўнікі Мабільёна (Тусен, Тассен і інш.) узбагацілі навуку новымі крыніцамі, але так і не пераўзышлі ўзровень навуковай крытыкі, якога ён дасягнуў. З сяр. XVIII ст. дыпламатыка як дысцыпліна выкладаецца ва універсітэтах Германіі.[5]

У XVIII – XIX стст. пашырэнне ў крыніцазнаўстве атрымалі спецыяльныя прафесійныя методыкі, якія сфарміраваліся на аснове тэксталагічнай крытыкі крыніц, галоўным чынам, наратыўных тэкстаў і дакументаў тыпа сярэднявечных дыпломаў і хартый, што садзейнічала развіццю дапаможных дысцыплін гісторыі і яе прыватных методык. Найбольшыя поспехі былі дасягнуты ў лацінскай і грэчаскай сярэднявечнай эпіграфіцы, палеаграфіі, якія неабходны для апублікавання арыгінальных крыніц. Пэўныя поспехі заўважаюцца і ў дыпламатыцы, храналогіі і сфрагістыцы, што палепшыла крытыку афіцыйных сярэднявечных дакументаў. Аднак, усе гэтыя дысцыпліны былі спецыяльнымі і прыстасаванымі да канкрэтных даследчых задач. Да канца XIX ст. спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны ўжо вывучаліся ва ўсіх еўрапейскіх універсітэтах. І. Лялевель выказаў удалую формулу, што адлюстроўвала мэты і задачы дапаможных дысцыплін, ён іх назваў: “*навукі, што даюць пазнаць гістарычныя крыніцы.*”[6] Пазітывізм, які панаваў у навуковай думцы XIX ст. дакладна вызначыў мэту гістарычнага даследавання: “гісторыя ствараецца па дакументах, калі іх няма, то няма і гісторыі”.

У Аўстрыі, Германіі, Францыі, Італіі быў назапашаны значны вопыт па методыцы вывучэння гістарычных пісьмовых помнікаў (пераважна сярэднявечных). У развіцці сярэднявечнай крытыкі значная роля належала дыпламатыцы як навуцы, што вывучае дакументальныя архіўныя крыніцы. Архіўныя дакументы, якія гістарычна ствараліся ў практычных мэтах, прадстаўлялі каштоўнасць таму, што былі створаны непасрэдна ў час падзей, аб якіх сведчаць. Асаблівую ролю ў развіццё дыпламатыкі ўнеслі **Т. Зіккель і Ю. Фіккер.** Т. Зіккель заклаў асновы дыпламатыкі заходнееўрапейскіх сярэднявечных актаў, Ю. Фіккер увёў у сферу вывучэння дыпламатыкі прыватныя акты, падкрэсліваў іх гісторыка-прававое значэнне.

Буйны архівіст з Італіі **Дж. Віттані** распрацаваў падрабязны курс лацінскай дыпламатыкі, прапанаваў класіфікацыю актавага матэрыялу,

[5] Каштанов С.М., с. 42 – 45.
[6] Медушевская О.М. Современное заруежное источниковедение: учеб. пособие, с. 69 – 70.

што захоўваецца ў італьянскіх архівах. Ён таксама распрацоўваў праблемы крытыкі актавых дакументаў.[7]

У канцы XIX ст. французскі гісторык, прафесар Школы Хартый А. Жыры стварыў абагульняючую працу па дыпламатыцы. Канцэпцыя А. Жыры мела вялікае значэнне для распрацоўкі методыкі крыніцазнаўства. Ён шырока вызначаў аб'ект даследавання, адносячы да яго такія віды крыніц, як дыпломы, граматы, акты, прававыя дакументы і г.д. Ён вылучыў этапы крытыкі актаў:

1. Вызначэнне часу стварэння.
2. Вызначэнне формы і спосабаў сведчання.
3. Вызначэнне сапраўднасці дакумента.

Па-сутнасці, гэта агульныя прынцыпы методыкі вывучэння дакументаў, што важна для наступных этапаў станаўлення крыніцазнаўства. Назапашаны дыпламатыкай вопыт практычных даследаванняў, такім чынам, заклаў падмурак для абагульнення метадаў крыніцазнаўства.[8]

Аднак, у крыніцазнаўстве неабходны быў вопыт тэарытычнага абагульнення. Першыя спробы разгледзіць агульныя метады гістарычнага пазнання ўяўляліся для тагачасных гісторыкаў справай бесперспектыўнай. Такой думкі, напрыклад, прытрымліваецца **І. Г. Дройзен**.[9] Ідэі Дройзена аб класіфікацыі гістарычных крыніц мелі ўплыў на крыніцазнаўства. Негатыўнымі былі адносіны з боку большасці даследчыкаў да кнігі англійкага гісторыка І. Фрымэна аб методыцы гістарычнага даследавання. Аднак, гэта была адна з першых спроб абагульнення выкладаемага універсітэцкага курса. Ставілася пытанне аб адрозненні гістарычных фактаў у гістарычнай навуцы ад фактаў прыродазнаўчых навук.

У **1898 г.** французскія вучоныя, выкладчыкі Сарбоны **Ш.-В. Ланглуа і Ш.Сеньабос** паставілі задачу напісаць працу аб методыцы гістарычнага даследавання. Іх кніга “Уводзіны ў вывучэнне гісторыі” павінна была падштурхнуць гісторыкаў да роздуму аб прыёмах даследавання гістарычнага матэрыялу, якія прымяняліся інтуітыўна. Яны паставілі перад гісторыкамі шэраг пытанняў: Як можна пазнаць мінулае? Што такое дакумент? Што такое гістарычны факт? На гэтыя пытанні адказвае і сучаснае гістарычнае крыніцазнаўства. Кніга “Уводзіны ў вывучэнне гісторыі” складалася з трох частак: папярэднія звесткі (даведачны матэрыял), аналітычныя працэсы (методыка працы з дакументамі), сінтэтычныя працэсы (аб'яд-

[7] Там жа, с. 71.
[8] Там жа, с. 72.
[9] Гл.: там жа, с.73.

нанне гісторыкам фактаў у агульную гістарычную мадэль). У кнізе разглядаюцца этапы крытыкі гістарычнай крыніцы, галоўная ўвага ў якой надаецца вызначэнню дакладнасці крыніцы, праўдзівасці аўтара крыніцы. Разглядаюцца прычыны недакладнасці фактаў у крыніцы. У апошнім раздзеле крытыкуецца пазітывісцкая метадалогія.[10]

Нямецкі гісторык **Э. Бернгейм** выдаў у **1889 г.** “Падручнік гістарычнага метада”. Кніга Бернгейма прысвечана характарыстыцы паняццяў гістарычнай навукі і яе сувязяў з філалогіяй, палітыкай, сацыялогіяй, філасофіяй, этнаграфіяй, антрапалогіяй і інш. навукамі, а таксама мастацтвам. Гісторык у кнізе разглядае методыку працы з гістарычнымі крыніцамі, класіфікацыю гістарычных крыніц, дапаможныя гістарычныя дысцыпліны, падзяляе гістарычную крытыку на знешнюю, унутраную, а таксама інтэрпрэтацыю гістарычнай крыніцы. Э. Бернгейм выкарыстаў некаторыя ідэі, выказаныя яшчэ І. Дройзенам. Напрыклад, яго ідэю аб падзеле крыніц на рэшткі, змешаныя крыніцы (напрыклад, рэч з надпісам), паданні. Э. Бернгейм вылучае два віды крыніц: гістарычныя рэшткі і гістарычную традыцыю. Гэты падзел у будучым шырока выкарыстоўваўся іншымі гісторыкамі. [11]

Даследаванні гістарычных крыніц былі пачаты ў Расійскай Імперыі з сяр. XVIII – першай пал. XIX стст. у працах рускіх гісторыкаў **В. М. Тацішчава, М. І. Карамзіна, С. М. Салаўёва, М. М. Шчарбатава, М. Т. Качаноўскага**, нямецкіх навукоўцаў **Г. Ф. Міллера**, **А.-Л. Шлёцара** і інш.[12] Для гэтага перыяду характэрны новыя гістарычныя праблемы, зварот да новых відаў крыніц: актаў, дакументальным матэрыялам, пісцовых кніг. З пач. XIX ст. прадметам спецыяльнага вывучэння сталі летапісы. П. М. Строеў упершыню прапануе меркаванне аб летапісе як аб зводзе. Рускае летапісанне вывучаюць П. Буткоў, І. Д. Бяляеў, М. І. Сухамлінаў, І. І. Сразнеўскі. Гісторыкі І. Г. Эверс, Э. С. Тобін, А. Н. Папоў, Н. І. Ланге вывучаюць заканадаўчыя помнікі, асабліва ўвага надаецца “Рускай Праўдзе”. Менавіта ў гэта перыяд у расійскім крыніцазнаўстве вылучаюцца дапаможныя гістарычныя дысцыпліны (геральдыка, нумізматыка і інш.). Асабліва гэтае дзяленне заўважна ў працах Е. Балхавіцінава. Як акадэмічная гістарычная дысцыпліна крыніцазнаўства сфарміравалася ў 90-я г. XIX ст. В. О. Ключэўскі пачаў чытаць курс “Крыніцазнаўства” ў Маскоўскім універсітэце ў 1894 г. Таксама В. О. Ключэўскі значную ўвагу надаваў аналізу праблем гістарыяграфіі ў Расіі. У незакончаным курсе лек-

[10] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 11; Бандзеликаў М.Ф., с. 6.
[11] Медушевская О.М., с. 73 – 74.
[12] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 12.

цый па гістарыяграфіі ён разгледзіў творчы метад М. М. Шчарбатава, І. Н. Болціна, А. Л. Шлёцара. Ён крытычна ацаніў працу С. М. Салаўёва, сваіх сучаснікаў – В. І. Семяноўскага, Н. Д. Чэчуліна, С. Ф. Платонава і інш.[13]

З'яўленне прац па методыцы крыніцазнаўства было новым у гістарычнай навуцы. Аднак, крыніцазнаўства гістарычнай навукі патрабавала сістэматызаванага вывучэння, што праўдзіва адзначыў у сваіх працах **А. С. Лапо-Данілеўскі.** У першым томе працы **"Метадалогія гісторыі,"** які выйшаў у **1910 г.** даследчык прапануе шырокі матэрыял аб развіцці метадалогіі ў працах старажытных і сучасных яму аўтараў.[14] Унёсак А. С. Лапо-Данілеўскага быў менавіта ў тым, што ён распрацаваў канцэпцыю метадалогіі крыніцазнаўства як цэльнага і сітэматызаванага вучэння. Метадалогію гісторыі А. С. Лапо-Данілеўскі лічыў складзенай з дзвюх частак: метадалогіі крыніцазнаўства і метадалогіі гістарычнай пабудовы. Задача метадалогіі крыніцазнаўства – вызначэнне крытэрыяў, на аснове якіх гісторык можа сцвярджаць, што факт, які вядомы яму з крыніц, сапраўды існаваў. А. С. Лапо-Данілеўскі ў кнізе "Метадалогія гісторыі" лагічна будуе сістэму крыніцазнаўства, якая складаецца з паняццяў: прырода гістарычнай крыніцы, класіфікацыя крыніц, гістарычная інтэрпрэтацыя, гістарычная крытыка, гістарычная крыніца. Праца насычана прыкладамі з практыкі гістарыяграфіі, археалогіі, крыніцазнаўства, літаратуразнаўства, крыміналістыкі, гісторыі псіхалогіі і г.д. Сваю канцэпцыю аўтар пабудаваў у межах пазванаваўчага працэса, у цэнтры якога знаходзіцца суб'ект – гісторык. Таксама аўтар вызначае значэнне гістарычнай крыніцы ў гістарычным пазнанні. Канцэпцыя А. С. Лапо-Данілеўскага тэарэтычна ахапіла ўсе крыніцы мінулага і сучасныя аўтару крыніцы.[15]

**Выданне крыніц і крыніцазнаўства Беларусі.**

Унёсак у падмурак практычнага беларускага крыніцазнаўства зрабіў **М. Кромер**, які склаў вопіс аўтэнтычных лістоў (знаходзіліся ў Метрыцы ВКЛ), складаючы вопісы па загаду Л. Сапегі. Вопісы рабілі паводле храналанічнага прынцыпу, спосабу захавання, тэматычныя. Ад XVII ст. вядомы вопісы прыватных бібліятэк і архіваў: рэестр кніг пінскага і тураўскага епіскапа Рыгора, складзены Сільвестарам Каглобам у 1631 г., каталаг рукапісаў бібліятэкі Радзівілаў (зараз у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, не апублікаваны). У 1793 г. пад кіраўніцтвам і з удзелам галоўнага архіварыуса літоўскай правінцыі базыліян Ф. Шакаль-

[13] Пронштейн А.П. Источниковедение в России. Эпоха феодализма. – Ростов, 1989, с. 301 – 308.
[14] Пронштейн А.П., с. 12.
[15] Медушевская О.М., с. 81.

скага складзены вопісы ўсіх манастырскіх архіваў. У Аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай Публічнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу знаходзіцца вопіс архіва мітрапалітаў кіеўскіх і галіцкіх, складзены ў 1780 г. Ф. Янкоўскім. Значным укладам у камеральную археаграфію сталі работы П. Гільтэнбранта "Рукапіснае аддзяленне Віленскай публічнай бібліятэкі" (1871 г.), Ф. Дабранскага "Апісанне рукапісаў Віленскай публічнай бібліятэкі, царкоўнаславянскіх і рускіх" (1882 г.). Пачаткам эдыцыйнай археаграфіі на Беларусі стаў 2-томны зборнік "Перэканальная лаціна, альбо збор рыторыкі, лістоў, статыстыкі, палітыкі, надпісаў, панегірыкаў, паэтыкі і гісторыі", складзены сакратаром пінскага дыстрыкта ордэна айцоў марыянаў Я. Д. Астроўскім. Мэтанакіраваны збор гістарычных крыніц пачаўся з арганізаванай пры РАН у 1809 г. Археаграфічнай экспедыцыі. У 1817 – 1818 гг. П. Румянцаў правёў экспедыцыю па даследаванню манастыроў і архіваў Маскоўскай і Новагародскай губерняў. У 1820 г. П. М. Строеў даследаваў манастыры Разанскай губерні. Былі выяўлены *Ізборнік Святаслава 1073 г., Судзебнік 1497 г., творы Кірылы Тураўскага* і інш. На Беларусі ў пач. XX ст. археаграфічныя экспедыцыі былі арганізаваны Віленскай археаграфічнай камісіяй, Віленскай археалагічнай камісіяй і Віленскай навучальнай акругай. Экспедыцыі праводзілі **М. К. Баброўскі, П. М. Бацюшкаў, І. І. Грыгаровіч, І. М. Даніловіч, А. І. Мілавідаў, А. П. Сапуноў.**[16]

У вывучэнні гістарычных крыніц Беларусі значнае месца займаюць выпускнікі Віленскага універсітэта: **Яўхім Лялевель, Ігнат Даніловіч, Язэп Ярашэвіч, Ігнат Анацэвіч, Іван Лабойка.** Я. Лялевель выдае курс крыніцазнаўства і дапаможных дысцыплін "Навукі, што дапамагаюць вывучаць гістарычныя крыніцы", дзе распрацоўвае метадалогію гісторыі. У Віленскім універсітэце дзейнічае гурток І. Даніловіча, удзельнікі якога займаліся пошукам і вывучэннем старажытных кніг і рукапісаў. І. Даніловіч адшукаў Судзебнік Казіміра IV (выдадзены ў 1826 г.), Супрасльскі летапіс. І. Анацэвіч вядомы як архівіст, крыніцазнавец і археограф. Ён сабраў багатыя калекцыі дакументаў, дзякуючы працы ў архівах Польшчы, Беларусі, Расіі і Літвы.[17]

Першай навуковай установай, якая займалася пошукам і выданнем гістарычных дакументаў на тэрыторыі Беларусі была "Археаграфічная камісія", створаная ў 1834 г. у Пецярбургу пры Міністэрстве народнай

---

[16] Гл.: Д. Караў Пачаткі беларускага крыніцазнаўства // Спадчына. – 1994. – № 1. – с. 4 – 14; Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 13.
[17] Там жа, с. 14.

асветы для выдання матэрыялаў, сабраных Археаграфічнай экспедыцыяй. Лічылася спачатку часовай, а з 1837 г. – сталай. Выдала зборнік "*Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею*" – складальнік і рэдактар І. І. Грыгаровіч. У зборнік уключана каля 2 тыс. дакументаў са сховішчаў Пецярбурга, Масквы, Полацка, Мсціслава на беларускай і ўкраінскай мовах. Матэрыялы размешчаны паводле храналагічна-тэматычнага прынцыпу. Прыярытэт аддаваўся царкоўнай і палітычнай тэматыцы. У т. 1. змешчаны дакументы XIV – пач. XVI стст. Пададзены помнікі феадальнага права: Статут Казіміра ІІІ 1347 г., Кракаўскі, Віленскі статуты, Судзебнік Казіміра 4-га 1468 г., земскія прывілеі вялікакняжацкага ўрада Полацкай і Віцебскай землям, прывілеі і пацвярджэнні Полацку, Навагрудку, Менску, Магілёву, Бярэсцю і інш., даравальныя граматы (фундушы) царкоўным установам. У т. 3. надрукаваны тэкст "Уставы на валокі" 1557 г., матэрыялы пра Лівонскую вайну 1558 – 1583, Дакументы пра становішча праваслаўных пасля Уніі 1596 г. (т. 4.), універсалы і граматы Б. Хмяльніцкага, звесткі пра ваенныя дзеянні супраць татар у XVII ст. (т. 5). Кожны том меў заўвагі, генеалагічныя табліцы, матэрыялы да радаводаў удзельных князёў і буйных магнацкіх родаў.

"*Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею*" – серыйнае шматтомнае выданне, з 1361 па 1678 гг. Выдаваліся пад рэдакцыяй М. І. Кастамарава і Г.Ф. Карпава. Змяшчалі актавыя і нарматыўныя крыніцы. Матэрыялы па гісторыі Беларусі змешчаны ў т. 1 – 3, 14. Ёсць звесткі пра паўстанне С. Налівайкі, войны сярэдзіны XVII ст. Асноўную масу складаюць дакументы эканамічнага характару. У т. 14 "Далучэнне Беларусі" змешчаны матэрыялы пра ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі, пра палітыку цара на захопленых землях. Археаграфічны ўзровень выдання невысокі, адсутнічаюць каментарыі. Большасць апублікаваных дакументаў напісаны на старабеларускай мове.

**Развіццё крыніцазнаўства ў найноўшы час.**

Перагляд метадалагічных канцэпцый гістарычнай навукі адбыўся ў 20 – 30 гг. XX ст. і датычыўся пазнавальных функцый гісторыі, яе прынцыпаў і метадаў даследавання. Перагляд пазіцый, перш за ўсё, ахапіў тыя бакі даследаванняў, што былі дрэнна прадстаўлены ў пазітывісцкай гістарыяграфіі (уяўленне аб аб'екце даследавання), тэматыку. Гісторыкі сталі імкнуцца звярнуцца ад апісання праблем палітычнай і ваеннай гісторыі да псіхалогіі гістарычных асоб, матывацыі іх дзеянняў. Найбольш яскрава

гэтае імкненне адлюстравана ў працах **М. Блока і Л. Феўра** – заснавальнікаў **школы Аналаў**, што атрымала сваю назву ад часопіса “Аналы эканамічнай і сацыяльнай гісторыі”.[18] Прадстаўнікі гэтай школы імкнуліся ажыццявіць цэласны падыход да гістарычнага даследавання, які мог быць увасоблены пры дапамозе іншых навук: геаграфіі, псіхалогіі, эканомікі, статыстыкі. Напрыклад, геаграфія павінна дапамагаць гісторыку вызначыць уплыў прыроднага асяроддзя на вобраз жыцця і гаспадарчую дзейнасць, псіхалогія – дапамагчы ў вывучэнні пачуццяў, вераванняў, эмоцый людзей, эканоміка – дапамагчы зразумець эканамічныя працэсы ў грамадстве і г.д. **Л. Феўр** прапаноўваў разглядаць гісторыю чалавецтва больш комплексна, поўна. У кнізе “Зямля і эвалюцыя чалавецтва” (1922 г.) ён звярнуўся да ўплыву геаграфічнага асяроддзя на характар працы людзей, размяшчэнне гарадоў і г.д. **М. Блок** даследаваў гісторыю французскага феадальнага грамадства ў сувязі з эканамічнымі і геаграфічнымі ўмовамі жыцця людзей. Вывучаў метадалогію гісторыі. [19]

Крытыка школы Аналаў была накіравана супраць пазітывісцкай метадалогіі гісторыі. Крытыкаваліся такія недахопы, як вузкасць гістарычнай базы, еўрапацэнтрызм гісторыі, пабудова гістарычных мадэляў толькі на пісьмовых крыніцах. Вылучэнне новых праблем гісторыі (напрыклад, сацыяльна-эканамічных) адкрыла новае кола гістарычных крыніц, а таксама дало штуршок развіццю новых гістарычных дапаможных дысцыплін. Л. Феўр выказваўся супраць вузкай спецыялізацыі гісторыка, супраць вобраза “кабінетнага” вучонага.

Крытыкай пазітывізма адзначаецца і пазіцыя англійскага гісторыка **Р. Дж. Коллінгвуда**. Яго праца “Ідэя гісторыі,” апублікаваная ў 1946 г., выклікала значную цікавасць. У працы аўтар робіць акцэнт на пазнаваўчай працы суб’екта – гісторыка. Для навуковай тэорыі не існуе крыніц, а толькі фактычныя дадзеныя, якія гісторык інтэрпрэтуе. Гісторык сам вызначае патрэбныя дадзеныя: адны інтэрпрэтуе, іншыя адхіляе, праводзіць крытыку крыніцы, адкідвае хлусню і дэзінфармацыю. Такім чынам, па меркаванню Коллінгвуда, гісторык сам для сябе галоўны аўтарытэт. Разам з тым, Коллінгвуд высока ацэньвае значэнне непісьмовых крыніц, пісьмовыя крыніцы па яго меркаванню – толькі зыходныя для наступнага аналіза. Аўтар падкрэслівае актыўную ролю гісторыка ў ходзе даследавання. Гісторыю кампілятыўнага тыпа называе “гісторыяй нажніц і клея”.[20]

---

[18] Медушевская О.М., с. 84.
[19] Гл.: Там жа, с. 85 – 86; М. Блок. Апология истории или ремесло историка. – М., 1973.
[20] Медушевская, с. 86.

У 40 – 50 гг. XX ст. у цэнтры ўвагі апынуліся пытанні метадалогіі гістарычнага пазнання. Многія прадстаўнікі заходняй навукі канстатавалі факт, што “гісторыя вярнулася да філасофіі”. Зварот гісторыкаў да метадалогіі і філасофіі гісторыі быў абумоўлены патрабаваннямі гістарычнай навукі (пашырэнне праблематыкі, кола крыніц).

Крытыка пазітывісцкіх канцэпцый вялася прадстаўнікамі “**крытычнай філасофіі гісторыі**”. Прадстаўнікі гэтага напрамку выкарысталі думку В. Дзільтэя аб тым, што задача гісторыка зводзіцца да ўзнаўлення хваляванняў людзей мінулага. Спецыфіку аб’екта даследавання прыхільнікі крытычнай філасофіі гісторыі імкнуліся падкрэсліць, апелюючы да факта, што аб’ект належыць мінуламу. Французскі гісторык **А. І. Марру** супрацьпастаўляе рацыянальным метадам працы з крыніцамі іх інтуітыўнае разуменне, пранікненне ў псіхалогію стваральніка крыніцы, суперажыванне даследчыка. З гэтых пазіцый ён крытыкуе Ланглуа і Сеньабоса, асабліва прапанаваныя імі прыёмы ўнутранай крытыкі. Ён перабольшвае значэнне інтуітыўнага метада авалодання гістарычнай ісцінай, супрацьпастаўляе яго рацыянальным метадам. Французскі гісторык **Ж. Лефеўр** палемізуе з А. Марру і падкрэслівае, што гісторыя – ёсць веды. Гісторыка нельга прыраўноўваць да паэта, які інтуітыўна ахоплівае непаўторныя рысы чалавечай індывідуальнасці. Ж. Лефеўр выказваецца супраць тэорыі інтуітыўнага разумення аб’екта даследавання.[21]

**П. Лебрэн і М. Ж. Крэбэк** паставілі новае пытанне – магчымасць выкарыстання гісторыкамі колькасных метадаў пры аналізе крыніц. Яны супрацьпаставілі колькасны метад “імпрэсіяніcцкім метадам” працы гісторыка. Прадстаўнікі дадзенага накірунку звяртаюць увагу на значныя магчымасці колькаснага метада ў эканоміцы, дэмаграфіі, сацыялогіі і інш. навуках. Яны лічаць, што пры дапамозе колькаснага метада можна апрацоўваць не толькі статыстычныя, але і іншыя групы масавых крыніц. Новыя магчымасці адкрыліся для апрацоўкі масавых крыніц у гісторыі са з’яўленнем ЭВМ.[22]

Напрыклад, пры дапамозе ЭВМ быў складзены каталаг датаваных лацінскіх рукапісаў (V – XV стст.) са сховішчаў Аўстрыі, Бельгіі, Галандыі, Італіі, Францыі, Швейцарыі і Швецыі. Колькасць такіх рукапісаў у Заходняй Еўропе складала больш мільёна. У Інстытуце даследавання і

[21] Там жа, с. 91 – 92.
[22] Там жа, с. 102.

гісторыі тэкстаў у Парыжы створана служба інфармацыі, у 1977 г. распрацавана інструкцыя па апісанню рукапісаў.[23]

У 70 – 80 г. XX ст. было пастаўлена пытанне аб неабходнасці выкарыстання вусных крыніц у гістарычных даследаваннях. Разам з тым, пастаўлена пытанне аб супрацоўніцтве гісторыі і іншых навук, дзе метады працы з вуснымі крыніцамі больш распрацаваны (этнаграфіі, філалогіі, сацыялогіі і інш.). Тэарытычныя і метадычныя праблемы працы з вуснымі крыніцамі разглядае даследчык Цэнтральнай Афрыкі **Дж. Вансін**. Звяртаючыся да вусных крыніц, ён вылучае аб’ект свайго даследавання, прапануе паняцце **“вуснай традыцыі”**. Даследчык вызначае галоўныя моманты ў аналізе вуснай крыніцы: вывучэнне мовы, культуры народа, гістарычнага мінулага; агульнае вывучэнне феномена традыцыі; вывучэнне розных тыпаў традыцыі і характарыстыка спосабаў іх трансляцыі; сістэматычнае збіранне ўсіх крыніц; прымяненне дапаможных методык аналіза сведчанняў; навуковая публікацыя тэкстаў, з тлумачэннем варыянтаў інтэрпрэтацыі сімволікі.[24]

Другі аспект вуснай традыцыі звязаны з папаўненнем вуснай базы найноўшага часа пры дапамозе ўспамінаў удзельнікаў падзей. Методыка такіх запісаў пачала распрацоўвацца ўпершыню ў краінах Заходняй Еўропы і была падобнай да методыкі канкрэтных сацыялагічных даследаванняў. Ствараліся калекцыі вусных успамінаў, створаных па адзінай праграме, запісваліся жыццяпісанні, бібліяграфічныя і аўтабіяграфічныя матэрыялы. Вусным крыніцам была прысвечана кніга англійскага вучонага **П. Томпсана** “Голас мінулага. Вусная гісторыя”. Аўтар падкрэслівае, што пісьмовыя крыніцы мала асвятляюць дзейнасць простых людзей эпохі, грамадскія настроі. Аўтар спыняецца на пытанні методыкі арганізацыі працы з вуснымі успамінамі, прапануе падрабязную анкету, што дазваляе атрымаць інфармацыю па пэўнай тэматыцы.[25]

Усё больш папулярнай у гэты час становіцца ідэя інтэграцыі розных навук у канкрэтных даследаваннях. Французскі гісторык **М. Перанэ** ў працы “Генеалогія і гісторыя”. Метадычныя аспекты” даказвае прымяняльнасць генеалогіі для вырашэння актуальных задач гістарычнай навукі. Па яго меркаванню генеалогія раскрывае невядомыя аспекты гістарычнай

[23] Там жа, с. 118 – 119.
[24] Медушевская О.М., с. 125.
[25] Там жа, с. 126.

дэмаграфіі, геаграфічнай і сацыяльнай мабільнасці розных слаёў.[26] Французскі гісторык А. Собуль адзначаў, што сацыяльная гісторыя патрабуе выкарыстання метадаў статыстыкі. **Ф. Брадэль** (дарэчы, адзін з прадстаўнікоў школы "Аналаў") актыўна выступаў за пашырэнне тэарэтычнай базы гістарыяграфіі і за збліжэнне гісторыі з іншымі навукамі. "Гісторыя новага тыпу ўважліва сочыць за ўсімі навукамі аб чалавеку. Менавіта гэта і робіць межы гісторыі такімі хісткімі, а інтарэсы гісторыка такімі шырокімі", – лічыў Ф. Брадэль.[27]

У замежнай гісторыі ўсё больш прызнаецца магчымасць метадалагічнага эклектызма, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў выкарыстанні метадаў іншых навук.

Значны ўнёсак у развіццё крыніцазнаўства зрабілі савецкія гісторыкі. У цэнтры іх увагі знаходзяцца пытанні аб сутнасці гістарычнай крыніцы, аб яе сацыяльнай прыродзе, аб суадносінах у ёй аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, аб адэкватнасці і паўнаце адлюстравання гістарычнай рэчаіснасці. У **1940 г**. выйшаў двухтомнік па "Крыніцазнаўству гісторыі СССР" **М. Н. Ціхамірава** і **С. А. Нікіціна**. Працягваючы традыцыі А. А.Шахматава, М. Д. Прыселкаў і Д. С. Ліхачоў вывучалі летапісы. М. Н. Ціхаміраў і С. В. Юшкоў даследавалі заканадаўчыя крыніцы (у першую чаргу Рускую Праўду). Працягваючы даследаванні А. С. Лапа-Данілеўскага, даследчыкі **С. Н. Валк, А. І. Андрэеў** вывучалі актавыя крыніцы. Пасля Вялікай Айчыннай вайны цэнтрамі развіцця крыніцазнаўства сталі Гісторыка-архіўны інстытут і Маскоўскі дзяржаўны універсітэт. У гісторыка-архіўным інстытуце працавалі такія вядомыя крыніцазнаўцы, як **А. А. Зімнін** і **С. О.Шмідт**, які распрацаваў у канцы 1969-х гг. уласную класіфікацыю гістарычных крыніц, **В. М. Медушэўская**, якая абагульніла вопыт вывучэння гістарычных крыніц XIX – XX стст. **С. М. Каштанаў** даследаваў актавыя крыніцы метадамі дыпламатыкі. Гэтай праблеме была прысвечана яго кніга "Руская дыпламатыка: вучэбны дапаможнік". У Маскоўскім дзяржаўным універсітэце **І. Д. Кавальчанка** і іншыя вучоныя значную ўвагу надавалі апрацоўцы масавых крыніц з дапамогай колькасных метадаў і новых інфармацыйных тэхналогій. Працы І. Д. Кавальчанка асвячалі такія аспекты колькасных метадаў у гістарычным даследаванні, як месца колькасных метадаў у гістарычных даследаваннях, фармалізацыя і вымярэнне гістарычных з'яў, мадэляванне гістарычных працэсаў і з'яў,

[26] Там жа, с. 127.
[27] Там жа, с. 129.

выкарыстанне шматмерных тыпалогій у гістарычных даследаваннях. І. Д. Кавальчанка распрацаваў у канцы 1970-х – пачатку 1980-х гг. вучэнне аб гістарычнай крыніцы ў свеце тэорыі інфармацыі, якое дазволіла зрабіць выснову аб невычарпальнасці інфармацыі крыніцы. Буйным дасягненнем у вобласці тэарэтычнага крыніцазнаўства стала распрацоўка ў 1970-я гг. **Л. Н. Пушкаровым** і **А. П. Праншэйнам** класіфікацыі пісьмовых крыніц.[28]

У 20-я гг. ХХ ст. пачалася распрацоўка праблем крыніцазнаўства гісторыі Беларусі як асобнай дысцыпліны. У сяр. 1920-х гг. на гістарычным факультэце БДУ былі адкрыты кароткатэрміновыя курсы па архіўнай і музейнай справе. На іх працавалі **В. І. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі, В. Ю. Ластоўскі**. У гэты перыяд у Беларускім дзяржаўным універстэце Дз. І. Даўгяла чытаў курс “Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі”, у якім вялікае значэнне надавалася заканадаўчым крыніцам (“Рускай Праўдзе”), актам Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, археалагічным крыніцам. Аднак, рэпрэсіі 1930-х – 1950-х гг. прывялі да знішчэння ці высылкі з Беларусі многіх даследчыкаў, што працавалі ў крыніцазнаўстве (**М. В. Доўнар-Запольскі, Д. І. Даўгяла, У. І. Пічэта** і інш.). У гэты перыяд вялікае значэнне надавалася вывучэнню “першакрыніц” – твораў класікаў марксізма-ленінізма, крыніц па гісторыі рэвалюцыйнага руху і Камуністычнай партыі (рашэнні з’ездаў, праграма партыі і г.д.). Толькі з пачатку 1960-х гг. даследаванні па крыніцазнаўству Беларусі актывізуюцца. Працуючы ў Маскве, **М. М. Улашчык** (01.02.1906 – 14.11.1986) даследаваў крыніцы па гісторыі Беларусі ХІХ ст.: справаздачы губернатараў, рэвізіі, інвентары, “Мінскія губернскія ведамасці” і інш. Ён з’яўляецца аўтарам манаграфіі “Нарысы па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі феадальнага перыяду” (1973 г.), дзе прааналізаваў актавы матэрыял па гісторыі Беларусі, часткова Літвы і Украіны паводле археалагічных публікацый за 1824 – 1940 гг., паказаў дзейнасць даследчыкаў І. Грыгаровіча, І. Лабойкі, І. Даніловіча, С. Пташыцкага, П. Бяссонава, Я. Галавацкага, Дз. Даўгялы, М. Доўнар-Запольскага, У. Пічэты і інш. Пасмяротна выйшла яго кніга “Працы па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі”, прысвечаная крытычнаму разгляду зборнікаў дакументаў па гісторыі Беларусі XVII – 1-й пал. XIX стст.

Даследаваннем беларуска-літоўкіх летапісаў займаўся **В. А. Чамярыцкі**, які распрацаваў класіфікацыю ўсіх летапісаў па летапісным зводам.

---

[28] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 13.

Мытныя кнігі беларускіх зямель вывучаў В. І. Мялешка. У 1960-я – 1970-я гг. П. Г. Казлоўскі і З. Ю. Капыскі даследавалі гаспадарчыя апісанні, рэестры. Мемуары, запісы падарожнікаў даследавалі А. Ф. Коршунаў, А. І. Мальдзіс, В. П. Грыцкевіч. З 1970-х гг. у БДУ спецкурс па крыніцазнаўству гісторыі БССР пачаў чытаць А. П. Ігнаценка.[29]

Новая хваля цікавасці да крыніцазнаўства ўзнікла ў 2-й пал. 1980-х – пач. 1990-х гг. у сувязі з павышэннем цікавасці да гісторыі Беларусі ў цэлым. У 1992 г. у БДУ было адкрыта аддзяленне архівазнаўства і музеязнаўства з дзённай і завочнай формамі навучання. У 2001 г. на гістарычным факультэце арганізавана аддзяленне дакументазнаўства. Прадугледжваецца падрыхтоўка бакалаўраў, спецыялістаў на базе пяцігадовага навучання і магістраў. 30 чэрвеня 2001 г. кафедра крыніцазнаўства і музеязнаўства была рэарганізавана ў кафедру крыніцазнаўства, яе ўзначаліў С. М. Ходзін. Распрацоўкай розных праблем крыніцазнаўства, музеязнаўства, архівазнаўства займаюцца: **В. М. Сідарцоў, В. М. Шутава, С. Б. Каун, В. Л. Ліпніцкая, М. Ф. Шумейка, К. І. Козак, А. Е. Рыбакоў, А. А. Гужалоўскі** і інш. Дзейнічае магістратура і аспірантура па спецыяльнасці "Крыніцазнаўства, гістарыяграфія і метады гістарычнага даследавання". Ва ўсіх універсітэтах Беларусі курсы "крыніцазнаўства", "крыніцазнаўства гісторыі Беларусі" з'яўляюцца абавязковымі для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей.

Сучасныя беларускія навукоўцы даследуюць розныя аспекты крыніцазнаўства: **С. Марозава** даследавала пісьмовыя крыніцы па гісторыі Беларусі да XVIII ст., **С. М. Ходзін** выкарыстаў гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне крыніц па гісторыі Беларусі, заканадаўчыя крыніцы па гісторыі Беларусі даследавалі **І. А. Юхо і Т. І. Доўнар**, кнігі Літоўскай метрыкі – **В. Мянжынскі**, беларуска-літоўскія летапісы – **А. А. Семянчук**, літаратурныя творы – **А. А. Мельнікава**, дакументальныя крыніцы па гісторыі Беларусі – **В. Т. Пашута**, **А. Л. Харашкевіч** і інш.[30]

Такім чынам, сучаснае крыніцазнаўства – гэта гістарычная навука, якая ўключае ў свой склад тэорыю, методыку, практыку працы з гістарычным матэрыялам. На фарміраванне такога ўяўлення аб крыніцазнаўстве аказалі ўплыў усе папярэднія этапы развіцця дадзенай навукі.

---

[29] Там жа, с. 14.

[30] Кафедра источниковедения: 10 лет творчества // Крыніцазнаўства і спец. гіст. дысцыпліны. Вып. 1. – Мн., 2002. – с. 5 – 12.

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Элементы гістарычнай крытыкі ў працах антычных і сярэднявечных аўтараў.

2. Станаўленне рацыяналістычнай крытыкі гістарычных крыніц у эпоху Адраджэння.

3. Зараджэнне і развіццё расійскай школы крыніцазнаўства.

4. Распрацоўка методыкі гістарычнага даследавання: Ш.-В. Ланглуа і Ш. Сеньабос, Э. Бернгейм і інш.

5. Крыніцазнаўства як цэласнае і сістэматызаванае вучэнне ў канцэпцыі А. С. Лапа-Данілеўскага.

6. Погляды прадстаўнікоў школы «Аналаў» М. Блока і Л. Феўра на метады гістарычнага даследавання.

7. Распрацоўка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі: С. О. Шміт, В. М. Медушэўская і інш.

8. Колькасныя метады вывучэння крыніц І. Д. Кавальчанка.

9. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі: Дз. І. Даўгяла, У. І. Пічэта, М. М. Улашчык і інш.

10. Сучасны стан развіцця крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.

### Тэмы рэфератаў:

1. Уплыў пазітывізма на развіццё крыніцазнаўства.

2. «Школа крытычнай філасофіі гісторыі».

3. Погляды І. Лялевеля на крыніцазнаўства і дапаможныя гістарычныя дысцыпліны.

4. Унёсак В. О. Ключэўскага ў тэорыю і методыку крыніцазнаўства.

5. Крыніцазнаўчая праца Віленскай археаграфічнай камісіяй.

6. Унёсак у крыніцазнаўства М. Доўнар-Запольскага.

## Кантрольныя заданні да практычнага занятка “Гісторыя крыніцазнаўства”

### Заданне 1

**Які аналаг тэрміна “*капітулярый*” існаваў на тэрыторыі:**

а) Расійскай дзяржавы;

б) Вялікага княства Літоўскага.

**Заданне 2**

**Якім чынам даследчыкі даказалі несапраўднасць “Канстанцінавага дара”?**

**Заданне 3**

**Каго з пералічаных людзей лічаць заснавальнікамі дыпламатыкі?**

а) Г. Конрінга;
б) Ж. Мабільёна;
в) Дж. Віттані;
г) А. Жыры;
д) І. Дройзена.

**Заданне 4**

**Суаднясіце працы і іх аўтараў:**

| Аўтары: | Працы: |
|---|---|
| 1. Ш.-В. Ланглуа, Ш. Сеньабос | а) “Падручнік гістарычнага метада” |
| 2. Э. Бернгейм | б) “Зямля і эвалюцыя чалавецтва” |
| 3. А. С. Лапо-Данілеўскі | в) “Уводзіны ў вывучэнне гісторыі” |
| 4. Л. Феўр | г) “Ідэя гісторыі” |
| 5. М. Перанэ | д) “Метады гістарычнага даследавання” |
| 6. А. Марру | е) “Генеалогія і гісторыя” |
| 7. І. Кавальчанка | ё) “Аб прафесіі гісторыка” |
| 8. Р.Дж. Коллінгвуда | ж) “Метадалогія гісторыі” |

**Заданне 5**

**Да якіх напрамкаў у крыніцазнаўстве** (вусная гісторыя, пазітывізм, школа “Аналаў,” постструктуралізм і г.д.) **адносяцца наступныя выказванні**:

1. “Гісторыя ствараецца па дакументах – няма іх, няма і гісторыі...”

2. “Седзячы на вялікай кучы грамат з бычынай скуры, якія вы называеце сваімі дакументамі, вы абвяшчаеце: гісторыю дзесяці вякоў немагчыма пазнаць? Прабачце! Менавіта яе магчыма пазнаць. Усё, што выпрацавана вучонымі, занятымі не толькі тэкстамі, але і ўзнаўленнем мінулага пры дапамозе канвергентных дысцыплін, гісторык абавязаны выкарыстаць і напісаць гэтую гісторыю, а не мармытаць спужана, што нічога нельга зрабіць... ”

3. “Гісторыя новага тыпу ўважліва сочыць за ўсімі навукамі аб чалавеку...”

4. “Паміж Шарлем Ланглуа і Шарлем Сеньябосам, з аднога боку, і Маркам Блокам, з іншага, ляжыць агромністы прамежак, але і пасля Марка Блока кола гісторыі не прыпынілася...”

5. “...Гэта гісторыя, пабудаваная вакол людзей. Яна робіць герояў не толькі з правадыроў, але і з невядомай большасці. Яна дапамагае найменш абароненым, асабліва старым людзям, атрымаць упэўненасць і гонар...”

### Заданне 6

**Што называў *асновамі “гісторыкі”* вядомы нямецкі вучоны І. Дройзен?**

а) класіфікацыю гістарычных крыніц;

б) метады гістарычнага даследавання;

в) самі гістарычныя крыніцы.

### Заданне 7

**Якія два віды крыніц вылучае нямецкі гісторык Э. Бернгейм у кнізе *“Падручнік гістарычнага метада*?”**

а) пісьмовыя і рэчавыя;

б) гістарычныя і негістарычныя;

в) гістарычныя рэшткі і гістарычную традыцыю;

г) старажытныя і сучасныя;

д) інфарматыўныя і неінфарматыўныя.

### Заданне 8

**Хто першым пачаў чытаць курс “Крыніцазнаўства” у Маскоўскім універсітэце (1894 г.)?**

а) В. М. Тацішчаў;

б) А. С. Лапа-Данілеўскі;

в) М. І. Карамзін;

г) В. О. Ключэўскі;

д) Г. Ф. Міллер.

### Заданне 9

**Які твор паклаў пачатак эдыцыйнай археаграфіі на тэрыторыі Беларусі?**

а) “Рукапіснае аддзяленне Віленскай бібліятэкі”;

б) “Апісанне рукапісаў Віленскай публічнай бібліятэкі, царкоўнаславянскіх і рускіх”;

в) “Пераканальная лаціна, альбо збор рыторыкі, лістоў, статыстыкі, палітыкі, надпісаў, панегірыкаў, паэтыкі і гісторыі”;

г) “Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею.”

**Заданне 10**

**Хто з'яўляецца аўтарам кнігі “Зямля і эвалюцыя чалавецтва” *(1922 г.)*?**

а) Ч. Дарвін;

б) Л. Феўр;

в) М. Блок;

г) І. Анацэвіч;

д) П. Румянцаў.

**Заданне 11**

**Якой была галоўная думка прадстаўнікоў школы “*крытычнай філасофіі гісторыі*”?**

а) задача гісторыка зводзіцца да выказвання свайго погляду на гісторыю;

б) задача гісторыка – у ўзнаўленні перажыванняў людзей мінулага;

в) задача гісторыка – у аднаўленні аб'ектыўнай карціны мінулага.

**Заданне 12**

**Хто аўтары працы “Крыніцазнаўства гісторыі СССР”?**

а) Д. С. Ліхачоў і М. Д. Прыселкаў;

б) М. Н. Ціхаміраў і С. А. Нікіцін;

в) Д. І. Даўгяла і У. І. Пічэта;

г) В. М. Сідарцоў і В. М. Шутава;

д) М. Н. Ціхаміраў і С. В. Юшкоў.

**Заданне 13**

**Хто з'яўляецца складальнікам і рэдактарам зборніка** *“Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею”?*

а) Я. Лялевель;

б) І. Грыгаровіч;

в) М. Баброўскі;

г) П. Бацюшкаў;

д) У. Пічэта.

**Заданне 14**

**Якое перыядычнае выданне дало назву знакамітай школе Аналаў?**

а) “Аналы палітыкі і экановікі”;

б) “Аналы эканамічнай і палітычнай гісторыі”;

в) “Аналы эканамічнай і сацыяльнай гісторыі”;

г) “Аналы палітыкі і права”.

## Рэкамендаваная па модулю літаратура:


1. Блок М. Апология истории, или Ремесло историка / под ред. А. Я. Гуревича, перевод Е. М. Лысенко. – М., 1973.

2. Добиаш-Рождественская, О. А. История письма в средние века: руководство к изучению латинской палеографии / О. А. Добиаш-Рождественская. – М., 1987.

3. Каштанов, С. М. Русская дипломатика: учеб. пособие для вузов по спец. «История» / С. М. Каштанов. – М., 1988.

4. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., доп. – М., 2003.

5. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларуская палеаграфія: навуч. дапам. / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Гродна, 1996.

6. Ланглуа, Ш.-В., Сенъобос, Ш. Введение в изучение истории / Ш.-В. Ланглуа, Ш. Сенъобос. – М., 1898.

7. Медушевская, О. М. Источниковедение социалистических стран: учеб. пособие / О. М. Медушевская. – М., 1985.

8. Медушевская, О. М. Современная буржуазная историография и вопросы источниковедении: учеб. пособие / О. М. Медушевская. – М., 1979.

9. Медушевская, О. М. Современное зарубежное источниковедение: учеб. пособие для студентов ист. факультетов вузов / О. М. Медушевская. – М., 1983.

10. Пронштейн, А. П. Источниковедение в России. Эпоха феодализма / А. П. Пронштейн. – Ростов, 1989.

11. Тихомиров, М. Н., Муравьев, А. В. Русская палеография. – М., 1982.

12. Улашчык, М. М. Выбранае / М. М. Улашчык; Уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка; навук. рэд. Г. Кісялёў і В. Скалабан; прадм. і камент. А. Каўкі. – Мн., 2001.

13. Фарсобин, В. В. О предмете дипломатики и ее соотношении с источниковедением // Вопр. истории. – 1978. – № 1.

# МОДУЛЬ 4
# КЛАСІФІКАЦЫЯ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ КРЫНІЦ

## Змест праграмы:

**Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты.** Крытэрыі класіфікацыі. Класіфікацыя і сістэматызацыя. Віды сістэматызацыі. Паняцці «тып» і «від» у класіфікацыі, іх суадносіны. Спробы класіфікацыі гістарычных крыніц на «рэшткі» і «паданні».

**Фіксаваная і нефіксаваная сацыяльная інфармацыя.** Падзел крыніц паводле спосабу фіксавання інфармацыі на рэчавыя, пісьмовыя, вусныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, фотакінадакументы, фонадакументы. Адлюстраванне ў крыніцы фіксаванай інфармацыі. Класіфікацыя крыніц, іх паходжанне і віды.

**Падзел крыніц паводле форм адлюстравання рэчаіснасці.** Рэчавыя, пісьмовыя, фанічныя, выяўленчыя (выяўленча-графічныя, выяўленча-мастацкія, выяўленча-натуральныя) крыніцы. «Вусная гісторыя» і яе крыніцы.

**Тыпалагічныя класіфікацыі ў залежнасці ад знешніх прыкмет крыніц.** Класіфікацыя С. О. Шмідта. Падзел крыніц на рэчавыя, выяўленчыя, моўныя, канвенцыянальныя, крыніцы паводзін і гукавыя (аўдыяльныя).

## Вучэбны матэрыял

Гістарычныя крыніцы вельмі разнастайныя. Яны адрозніваюцца формай, зместам, суадносінамі аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, асабістага і грамадскага, прыродай выкарыстаных знакава-сэнсавых сістэм. Таму, для зручнасці ў працы, неабходна іх класіфікаваць.

**Класіфікацыя** – гэта дзяленне неаднароднай сукупнасці прадметаў на аднародныя групы па якой-небудзь сутнаснай, унутранай прыкмеце.[1]

Выкарыстаная для класіфікацыі прыкмета называецца **крытэрыем** класіфікацыі.

Разам з класіфікацыяй у навуцы выкарыстоўваецца **сістэматызацыя** – дзяленне неаднароднай сукупнасці крыніц у адпаведнасці з задачамі даследчыка.

---

[1] Никулин П.Ф., с. 17.

Могуць выкарыстоўвацца наступныя ***віды сістэматызацыі:***

1. Храналагічны (напрыклад, антычныя, сярэднявечныя крыніцы, крыніцы новай і найноўшай гісторыі).

2. Рэгіянальны (крыніцы Заходняй Еўропы, Амерыкі і г.д.).

3. Этнічны (крыніцы па гісторыі беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў і г.д.).

4. Персанальны (крыніцы перыяду праўлення Ягайлы, па дзейнасці Ф. Скарыны і г.д.). Сустракаюцца і іншыя прынцыпы сістэматызацыі крыніц.[2]

Класіфікацыі разнастайныя. Іх падзяляюць на тыпалагічныя і відавыя. *Тыпалагічная* класіфікацыя заснавана на ўліку асноўных уласцівасцяў дакументаў: іх сацыяльных функцый і інфармацыйна-знакавых сістэм. *Відавая* класіфікацыя праводзіцца ўнутры тыпа.

Пытанням класіфікацыі ў крыніцазнаўстве надаецца значная ўвага. Першыя спробы падзяляць крыніцы адносяцца да 30-х г. XIX ст.[3] Інтуітыўна даследчыкамі былі вылучаны групы летапісаў, заканадаўчыя дакументы, акты і апавядальныя крыніцы. Аднак, у XIX ст. навуковая класіфікацыя не была створана. Дзяленне крыніц адбывалася на *рэшткі* і *традыцыю (паданні)*. За аснову класіфікацыі ўзялі ступень блізкасці крыніцы да тых фактаў, якія ў ёй адлюстраваны. Лічылася, што **рэшткі** – гэта самі прадметы (факты) мінулага, якія непасрэдна вывучае гісторык. Крытычны аналіз у такім выпадку зводзіўся да вызначэння сапраўднасці. Пад **традыцыяй** (**паданнем**) разумеўся аповед аб гістарычным факце, што перададзены ў крыніцы. У гэтым выпадку для вывучэння факта праводзілася папярэдняя крытыка дакладнасці, бо факт гісторыку быў прадстаўлены не непасрэдна, а праз крыніцу. Трэба было вызначыць, у якой ступені апавяданне адпавядае сапраўднасці, наколькі яно праўдзіва. Напрыклад, грамата гандлёвай дамовы – *рэштка* факта заключэння дамовы, а аповед летапісу аб той жа дамове – *традыцыя (паданне)*. Аднак, такое дзяленне супярэчыць разуменню гістарычнай крыніцы як з’явы свайго часу. Не існуе крыніц, якія з’яўляюцца толькі паданнямі, і ў той жа час кожная рэштка нясе ў сабе складаную прамую і ўскосную інфармацыю. Кожная рэч з’яўляецца і сведчаннем аб фактах і, адначасова, самім фактам.[4]

Першым, хто здзейсніў непасрэдна навуковую класіфікацыю ў пач. XX ст. быў А. С. Лапа-Данілеўскі. Ён пачаў з пытання аб навуковай аснове класіфікацыі. У якасці асновы абраў *ступень блізкасці крыніцы да*

---

[2] Грицкевич, В.П., Каун, С.Б., Ходин, С.Н. Теория и история источниковедения: пособие для студентов гуманитарных факультетов. – Мн., 2000. – с.7.
[3] Никулин, П.Ф. с. 18.
[4] Каун, С.Б., Липницкая, О.Л., Ходин, С.Н., с. 15.

*адлюстраваных у ёй падзей.* Згодна з ёй, усе гістарычныя сведчанні ён падзяліў на *крыніцы, што прадстаўляюць факты* і *крыніцы, што абазначаюць факт.* Першыя ён назваў ***рэшткамі культуры***, другія – ***гістарычнымі паданнямі.*** *Рэшткі культуры* – гэта рэшткі саміх падзей. Да іх **А. С. Лапа-Данілеўскі** адносіў рэчавыя помнікі і юрыдычныя акты. *Гістарычныя паданні* пераказваюць падзею. Да паданняў даследчык адносіў усе вусныя і пісьмовыя сведчанні. Ён лічыў, што гістарычныя паданні неабходна правяраць на дакладнасць, а рэшткі культуры праўдзівыя. Галоўнае дасягненне класіфікацыі А. С. Лапа-Данілеўскага ў параўнанні з папярэднікамі – прызнанне суб'ектыўнасці звестак крыніц. Класіфікацыя А. С. Лапа-Данілеўскага адказвала патрэбам канкрэтна-гістарычнага даследавання, таму яе выкарыстоўвалі да сяр. 50-х гг. XX ст.[5]

У адносінах да пісьмовых крыніц доўгі час у крыніцазнаўстве выкарыстоўвалася класіфікацыя, прапанаваная І. Л. Шэрманам. У яе аснове знаходзіцца ўжо знаёмае (гл. модуль 1) дзяленне крыніц на рэшткі і паданні. Шэрман лічыў дакументальныя матэрыялы **рэшткамі**, а ўсе наратыўныя крыніцы **паданнямі**. Аднак, пошук больш удалай класіфікацыі працягваўся.

У выніку дыскусій пачалося стварэнне новых клысіфікацый крыніц. У 1975 г. прызнанне атрымала класіфікацыя **Л. М. Пушкарова**. Ён падзяліў усе гістарычныя крыніцы на 7 відаў:

1. Рэчавыя (археалагічныя).
2. Пісьмовыя.
3. Вусныя (фальклорныя).
4. Этнаграфічныя.
5. Лінгвістычныя.
6. Фота-кінадакументы.
7. Фонадакументы.[6] (падрабязней гл. модуль 5).

Кожны тып па дадзенай класіфікацыі падзяляўся яшчэ на віды. **Від** – гэта гістарычна склаўшаяся група крыніц, якія маюць устойлівыя прыкметы формы і зместу, што ўзніклі і замацаваліся па прычыне іх агульных сацыяльных функцый.

Напрыклад, пісьмовыя крыніцы падзяляюцца на: летапісы, заканадаўчыя акты, справаводчыя матэрыялы, актавыя матэрыялы, статыстычныя матэрыялы, перыядычны друк, дакументы асабістага паходжання (мемуары, дзённікі), літаратурныя помнікі, публіцыстычныя і палітычныя творы, навуковыя працы. У якасці асновы класіфікацыі пакладзены спосаб кадзі-

---

[5] Никулин П.Ф., с.18.

[6] Источниковедение истории СССР: учебник / под. ред. И.Д. Ковальченко. – М., 1981, с. 11.

равання інфармацыі і належнасць крыніцы да сферы той ці іншай гуманітарнай навукі. Істотным недахопам класіфікацыі **Л. М. Пушкарова** з'яўляецца тое, што адна і тая ж крыніца можа належыць да двух тыпаў адначасова.

У 1981 г. **І. Д. Кавальчанка** прапанаваў свой варыянт тыпалагічнай групоўкі крыніц з улікам спосаба кадзіравання інфармацыі. Уся сукупнасць гістарычных крыніц падзелена ім на 4 тыпы:

1. Рэчавыя.
2. Пісьмовыя.
3. Выяўленчыя.
4. Фанетычныя.[7]

**І. Д. Кавальчанка** прапанаваў дзяленне пісьмовых сведчанняў на масавыя і індывідуальныя крыніцы. Масавымі называюць крыніцы, якія адлюстроўваюць масавыя грамадскія з'явы: статыстычныя матэрыялы, матэрыялы справаводства і інш. Індывідуальныя крыніцы адлюстроўваюць індывідуальныя, непаўторныя падзеі. Гэта літаратурныя помнікі, крыніцы асабістага паходжання (лісты, дзённікі) і інш. Некаторыя віды крыніц утрымліваюць масавую і індывідуальную інфармацыю (перыядычны друк, навуковыя працы) і ўваходзяць у абедзве групы. Унутры відаў крыніцы падзяляюць па неабходнасці на групы. Так, крыніцы асабістага паходжання падзяляюць на мемуары, дзённікі і перапіску. [8]

Усе гістарычныя крыніцы эвалюцыяніравалі. У мінулым розныя пісьмовыя матэрыялы з'яўляліся сродкам сацыяльна-інфармацыйнага абмена. З іншага боку, яны былі праявай функцыянавання самой сацыякультурнай сістэмы. Таму можна лічыць, што працэс пераходу пісьмовага сведчання ў будучыню і пераўтварэнне яго ў гістарычную крыніцу абумоўлена інфармацыйнай і сацыякультурнай функцыяй дакумента. Частка пісьмовых сведчанняў захоўвалася з намерам перадаць іх будучым пакаленням. Да такіх адносяцца, напрыклад, летапісы, навуковыя творы, сямейныя акты і г.д. Аднак, асноўная маса пісьмовых крыніц захоўвалася для забеспячэння жыццядзейнасці дзяржаўных і інш. установ. Пасля заканчэння тэрміна іх дзеяння, дакументы захоўваліся ў сховішчах установ, а затым траплялі ў дзяржаўныя архівы, бібліятэкі, музеі і прыватныя калекцыі.

Прэтэндуе ахапіць усе віды крыніц класіфікацыя **С. О. Шмідта.**[9] Яна вельмі зручная для крыязнаўчай і музейнай дзейнасці, добра

[7] Никулин П.Ф., с. 19.
[8] Гл.: Источниковедение истории СССР, с. 12.
[9] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 9.

ўспрымаецца. У аснове класіфікацыі знаходзіцца знешняя “матэрыяльная” форма крыніцы. Паводле класіфікацыі вылучаюцца наступныя **тыпы** і падтыпы:

**Рэчавыя крыніцы** ва ўсёй іх разнастайнасці (уключаючы прадметы археалогіі, сучасныя машыны). Да гэтага тыпа адносяцца і прыродныя прадметы, што былі зменены чалавечай дзейнасцю. Да гэтага тыпа адносяцца гербарыі, муляжы пладоў, пудзелы жывёл і г.д.

**Выяўленчыя крыніцы** ўключаюць:

а) *мастацка-выяўленчыя* (творы мастацтва, кіно і г.д.);

б) *выяўленча-графічныя* (крыніцы, якія ўтрымліваюць інфармацыю, што перададзена пры дапамозе графічных выяў);

в) *выяўленча-натуральныя* (фотаздымкі, дакументальныя кінакадры).

**Славесныя крыніцы** ўключаюць:

а) *размову* (і запісы, што яе фіксуюць);

б) *помнікі вуснай творчасці* (фальклор);

в) *пісьмовыя помнікі* (у тым ліку эпіграфічныя).

**Канвенцыянальныя крыніцы** (лац. conventionalis – умоўны). Да іх адносяцца нотныя запісы, знакі матэматычнай і іншай сімволікі, інфармацыя, што закадзіравана на машынных носьбітах і г.д.

**Паводзінавыя крыніцы** – гэта візуальна назіраемыя звычаі і рытуалы, абрады, калектыўныя і індывідуальныя паводзіны (працоўныя, сямейныя, святочныя, спартовыя і г.д.). Тэрмін “этнаграфічныя крыніцы” С. О. Шмідт не лічыць удалым, бо этнографы карыстаюцца і рэчавымі крыніцамі, і пісьмовымі запісамі і інш.

**Гукавыя і аўдыяльныя крыніцы** – гэта гукі ў шырокім сэнсе. Гэта: шумы, выражэнне чалавечых эмоцый (“ах,” “вой” і г.д.), запісы галасоў птушак і звяроў, песні, музычныя творы і г.д.[10]

Недахоп класіфікацыі С. О. Шмідта заключаецца ў тым, што некаторыя віды крыніц нельга дакладна аднесці да аднаго з пэўных тыпаў (напрыклад, грошы). Да таго ж любая класіфікацыя – рэч умоўная. З’ява і яе сутнасць не заўсёды супадаюць. Практычныя патрэбы асобных дысцыплін (археалогіі, гістарычнай інфарматыкі, біліяграфіі і г.д.) вызначаюць з’яўленне і іншых класіфікацый, што зручныя для гэтых дысцыплін.

Такім чынам, ідэальнай класіфікацыі гістарычнах крыніц няма. Улічваючы вялікую разнастайнасць і разнапланавасць крыніц, пытанне іх класіфікацыі застаецца спрэчным да сучаснасці.

[10] Бандзелікаў М.Ф., с. 13 – 14.

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Класіфікацыя, яе сутнасць і мэты.
2. Класіфікацыя крыніц паводле іх паходжання і віда.
3. Класіфікацыя С. О. Шмідта.
4. Класіфікацыя пісьмовых крыніц.

### Тэмы рэфератаў:

1. Творчасць С. О. Шмідта.
2. Творчасць Л. Н. Пушкарова.

### Кантрольныя заданні да практычнага занятка “Класіфікацыя і сістэматызацыя.”

### Заданне 1
### Суаднясіце аўтара класіфікацыі і тыпы гістарычных крыніц.

| | |
|---|---|
| а) І. Д. Кавальчанка | 1. Рэчавыя крыніцы<br>2. Выяўленчыя крыніцы<br>3. Славесныя крыніцы<br>4. Канвенцыянальныя крыніцы |
| б) С. О. Шмідт | 1. Рэчавыя<br>2. Пісьмовыя<br>3. Выяўленчыя<br>4. Фанетычныя |
| в) Л. М. Пушкароў | 1. Рэшткі культуры<br>2. Гістарычныя паданні |
| г) А. С. Лапа-Данілеўскі | 1. Рэчавыя (археалагічныя)<br>2. Пісьмовыя<br>3. Вусныя (фальклорныя)<br>4. Этнаграфічныя<br>5. Лінгвістычныя<br>6. Фота-кінадакументы<br>7. Фонадакументы |

### Заданне 2

**Што такое “рэшткі”?**

а) гэта аповед пра гістарычныя факты;

б) гэта знешняя “матэрыяльная” форма прадметаў, якія вывучае гісторык;

в) гэта самі прадметы (факты) мінулага, якія непасрэдна вывучае гісторык;

г) гэта прадметы, што знаходзяцца ў музейных калекцыях.

### Заданне 3

**Хто першым ажыццявіў навуковую класіфікацыю гістарычных крыніц?**

а) І. Д. Кавальчанка;

б) Л. М. Пушкароў;

в) А. С. Лапа-Данілеўскі;

г) І. Л. Шэрман.

### Заданне 4

**Класіфікуйце наступныя гістарычныя крыніцы з улікам спосаба кадзіравання інфармацыі па 4-х тыпах: *рэчавыя, пісьмовыя, выяўленчыя, фанетычныя*** (па класіфікацыі І. Д. Кавальчанка):

а) пісьмовы запіс аповеда аб Вялікай Айчаннай вайне;

б) камп'ютэрная дыскета з фотаздымкамі старажытных цэркваў;

в) вусная размова аб святкаванні Купалля;

г) факсімільнае выданне кнігі М. Багдановіча.

### Заданне 5

**Суаднясіце крыніцы і іх тып:**

| | |
|---|---|
| а) масавыя | 1. Слова пра паход Ігараў |
| | 2. Справаздачы аб працы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за 2000 – 2005 гг. |
| б) індывідуальныя | 3. Часопіс “Полымя” за 1994 г. |
| | 4. Асабістыя справы выпускнікоў УА “ПДУ” за 2001 г. |

### Заданне 6

**Пазначце тыя крыніцы, якія не адносяцца да канвенцыянальных:**

а) нотныя запісы фальклорнага гурта “Вясёлка”;

б) матэматычныя формулы з прац Ньютана;

в) калядныя спевы, што захоўваюцца на камп'ютэрным дыску;

г) дакументальныя кінакадры вызвалення г. Мінска савецкімі войскамі ў 1944 г.

### Заданне 7

**Назавіце, да якога віда крыніц адносяцца па класіфікацыі С. О. Шмідта наступныя крыніцы?**

а) творы мастацтва, кіно;

б) графічныя малюнкі;

в) дакументальныя кінакадры;

г) фотаздымкі.

### Заданне 8

**Выкрэсліце падтыпы, якіх няма сярод *славесных крыніц* па класіфкацыі С. О. Шмідта:**

а) размова;

б) фальклор;

в) пісьмовыя помнікі;

г) галасы жывёл.

### Рэкамендаваная па модулю літаратура:


1. Грицкевич, В. П., Каун, С. Б., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. – Мн., 2000.

2. Евграфов, Е. М. Кинофотодокументы как исторический источник / Е. М. Евграфов. – М., 1973.

3. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учеб. пособие // И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. – М., 1998.

4. Каштанов, С. М. Русская дипломатика / С. М. Каштанов. – М., 1988.

5. Каун, С. Б., Липницкая, О. Л., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения: учеб.-метод. комплекс / С. Б. Каун, О. Л. Липницкая, С. Н. Ходин. – Мн., 2001.

6. Лаппо-Данилевский, А. С. Методология истории / А. С. Лаппо-Данилевский. – СПб., 1910 – 1913.

7. Пронштейн, А. П., Задера, А. Г. Методика работы над историческими источниками: учеб.-метод. пособие / А. П. Пронштейн, А. Г. Задера. – М., 1977.

8. Пронштейн, А. П. Методика исторического источниковедения / А. П. Пронштейн. – Ростов н/Д, 1976.

9. Пушкарев, Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории / Л. Н. Пушкарев. – М., 1975.

10. Шмидт, С. О. Путь историка: избр. тр. по источниковедению и историографии / С. О. Шмидт. – М., 1997.

11. Черноморский, М. Н. Источниковедение истории СССР. Советский период / М. Н. Черноморский. – М., 1976.

# МОДУЛЬ 5
# ПІСЬМОВЫЯ КРЫНІЦЫ

## Змест праграмы:

**Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі.** Класіфікацыя пісьмовых крыніц. Дакументальныя і апавядальныя крыніцы, іх асноўныя віды.

**Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы.** Зараджэнне і станаўленне заканадаўства. Заканадаўства новага часу (XVI – пачатак XX ст.). Заканадаўства навейшага часу. Аналіз заканадаўчых дакументаў.

**Акты як гістарычныя крыніцы.** Вызначэнне. Асноўныя віды. Методыка вывучэння актаў.

**Справаводчыя матэрыялы як гістарычная крыніца.** Вызначэнне. Асноўныя рысы статыстычных крыніц і прынцыпы выкарыстання. Асноўныя стадыі фарміравання статыстычных крыніц.

**Апавядальныя крыніцы.** Агульная характарыстыка.

**Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы.** Тэрміналогія летапісання. Асноўныя асаблівасці вывучэння і этапы развіцця летапісання.

**Мемуары.** Вызначэнне. Асноўныя віды мемуарнай літаратуры і іх вывучэнне.

**Эпісталярныя крыніцы.** Агульная характарыстыка. Вывучэнне эпісталярнага комплексу.

**Літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.** Вызначэнне, асноўныя этапы. Асаблівасці жанру мастацкай літаратуры.

**Перыядычны друк як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц.**

## Вучэбны матэрыял

Так склалася гістарычна, што крыніцазнаўства перш за ўсё вывучае пісьмовыя крыніцы. Пісьмовыя крыніцы з’яўляюцца важнай часткай гістарычных крыніц. Класіфікацыя пісьмовых крыніц дазваляе вылучыць унутрывідавыя методыкі атрымання з крыніц дакладнай інфармацыі. Адным з першых у крыніцазнаўстве прапанаваў такую класіфікацыю **І. Л. Шэрман**. У аснове яго схемы знаходзіцца дзяленне крыніц на “рэшткі” і “паданні”. Па яго тэрміналогіі дакументальныя матэрыялы гэта «рэшткі», а апавядальныя сведчанні (наратыўныя крыніцы) – “паданні”. У сучаснасці найбольшую папулярнасць сярод спецыялістаў набыла відавая класіфікацыя, прапанаваная **Л. М. Пушкаровым**. Пад **відам** у ёй разумеецца гістарычна склаўшаяся група крыніц, якія маюць устойлівыя пры-

кметы формы і зместу, што ўзніклі і замацаваны па прычыне іх агульных сацыяльных функцый. Сама класіфікацыя ўключае наступныя віды: 1) летапісы; 2) заканадаўчыя акты; 3) справаводчыя матэрыялы; 4) актавыя матэрыялы (граматы); 5) статыстыку; 6) перыядычны друк; 7) дакументы асабістага характару (мемуары, дзённікі); 8) літаратурныя помнікі; 9) публіцыстычныя матэрыялы; 10) навуковыя працы. Спробу класіфікацыі пісьмовых крыніц зрабіў таксама **І. Д. Кавальчанка** (гл. модуль 4).

Цікавай групай крыніц з’яўляюцца заканадаўчыя акты. **Заканадаўчыя акты** – гэта прававыя нарматыўныя дакументы, якія выдаваліся вярхоўнай дзяржаўнай уладай і мелі вышэйшую юрыдычную сілу ў межах якой-небудзь тэрыторыі ці дзяржавы. З дапамогай заканадаўчых актаў дзяржава рэгулявала сацыяльныя адносіны і кіравала сваёй дзейнасцю. Заканадаўчыя дакумены з’явіліся ў сярэдзіне XI ст.[1] Актавыя матэрыялы (граматы, запісы) ў юрыдычнай форме фіксавалі дамовы паміж асобамі. Паводле суб’ектаў дамоў матэрыялы падзяляюць на прыватна-прававыя і публічна-прававыя. Першыя замацоўвалі дамову паміж прыватнымі асобамі і суб’ектамі публічнай улады. З дапамогай актаў у асноўным рэгуляваліся сацыяльна-эканамічныя адносіны ўнутры правячага класа і адносіны дзяржавы і грамадства. Акты існавалі на працягу X – XVIII стст.

**Справаводчыя матэрыялы –** гэты дакументацыя, што выдавалася рознымі дзяржаўнымі, судовымі, эканамічнымі, палітычнымі і грамадскімі арганізацыямі (установамі) з мэтай кіравання дзейнасцю. У XIII – XIV стст. аформіўся спецыяльны апарат пісцоў, якія займаліся дзяржаўным справаводствам: складаннем, разглядам і падрыхтоўкай дакументаў. У гэты час распаўсюджваюцца устаўныя, судовыя, даравальныя і інш. граматы. У XV – XVIII стст. у цэнтральным апараце ВКЛ асноўныя справаводчыя функцыі выконвала дзяржаўная канцылярыя, у склад якой уваходзілі канцлер, падканцлер, сакратары, пісары і інш.; значнае развіццё атрымала судовая дакументацыя. У XV ст. утвораны цэнтральны архіў, аснову якога склалі капійныя кнігі канцэлярыі (Метрыка Вялікага княства Літоўскага), з сяр. XVI ст. наладжана архіўная справа на месцах. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай Імперыі на яе тэрыторыю была пашырана сістэма т.зв. “выканаўчага справаводства”, што было звязана з увядзеннем у 1802 г. новых органаў цэнтральнага кіравання – міністэрстваў. Арганізацыя справаводства ў гэты час вызначалася дэталёвай рэгламентацыяй усіх яго працэсаў. З 2-й пал. XIX ст. пачалося шырокае выкарыстанне механізацыі справаводчых працэсаў, з’явіліся новыя віды дакументаў – тэлеграмы, тэ-

[1] Никулин П.Ф., с. 19.

лефанаграмы. У савецкі час змяніўся склад дакументаў справаводства: з'явіліся новыя віды (заява, загад), старыя зніклі (прашэнне, рэскрыпт), адбылася ўніфікацыя і стандартызацыя справаводчых матэрыялаў. Сёння ў Рэспубліцы Беларусь існуюць спецыяльныя заканадаўчыя акты, стандарты, якія рэгламентуюць справаводства.[2]

**Статыстычныя матэрыялы –** гэта матэрыялы, якія характарызуюць колькасныя заканамернасці жыцця грамадства. Гісторыя назапашвання статыстычных звестак бярэ пачатак у глыбіні стагоддзяў. У старажытным Кітаі, Індыі, Егіпце, Рыме праводзіліся перапісы насельніцтва і зямельных уладанняў. Помнікамі сярэднявечча ў Еўропе з'яўляюцца апісанні абацтваў, графстваў, біскупстваў, складзеныя паводле ўказаў франкскага караля Карла Вялікага, а таксама апісанні каралеўскіх маёнткаў. У XVI ст. у Францыі пачала складвацца гандлёвая статыстыка, хутка ў Заходняй Еўропе з'явілася дэмаграфічная статыстыка. У ВКЛ праводзіліся попісы войска (першы з захаваўшыхся адносіцца да 1528 г.). У Рэчы Паспалітай да статыстычных крыніц адносяцца інвентары маёнткаў, тарыфы падымнага падатку. У Расіі большасць статыстычных звестак сканцэнтравана ў пісцовых кнігах. У XVIII – 1-й пал. XIX стст. у Расійскай Імперыі праведзена 10 рэвізій (перапісаў) падатковага і часткова непадатковага насельніцтва, якія даюць даследчыкам каштоўны дэмаграфічны матэрыял. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі рэвізіі распаўсюдзіліся і на іх. Зборам і апрацоўкай статыстычных звестак займаліся праместныя прыказы (да XVIII ст. ), бліжэйшая канцылярыя, камер-калегія (у XVIII ст.), іншыя ўстановы. У 1811 г. пры Міністэрстве паліцыі створана статыстычнае аддзяленне. У 1820 – 1840-х гг. яно выдае шэраг статыстычных табліц аб стане гарадоў у Расійскай Імперыі. **У 1852 г. створаны статыстычныя камітэты**, у тым ліку і Цэнтральны статыстычны камітэт. Галоўнымі выданнямі статыстычных камітэтаў былі *памятныя кніжкі губерняў* за пэўны год. Розныя статыстычныя матэрыялы друкаваліся ў перыядычным друку, пераважна ў губернскіх ведамасцях. У кан. 1850-х сабраны багаты статыстычны матэрыял афіцэрамі генштаба, ён выдадзены пад назвай "Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі Генеральнага штаба". Па Беларусі такія звесткі ёсць па Віленскай (1861), Гродзенскай (1863), Мінскай (1864) губернях. Збору статыстычных матэрыялаў спрыяла ўвядзенне на Беларусі *земскай статыстыкі*. У 1920 г. на тэрыторыі БССР было створана ***Цэнтральнае статыстычнае бюро***, якое ў 1924 г. рэарганізавана ў Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне, якое выдавала спецыяльныя выданні з дадзенымі. Важнейшымі мерапры-

[2] Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1, с. 392 – 393.

емствамі статыстычных органаў, што дазволілі назапашваць інфармацыю былі перапісы насельніцтва ў 1926, 1939, 1959, 1970, 1979, 1989, 1999 гадах. Іх матэрыялы апублікаваны ў спецыяльных зборніках. З 1992 г. у Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца праграма пераходу на міжнародную статыстычную сістэму. Навукай выпрацаваны прыёмы працы са статыстычнымі матэрыяламі. Існуе напрамак, які разумее гісторыю як заканамерны працэс масавых з'яў з іх колькаснымі і якаснымі параметрамі. Гісторыкі ў межах гэтага напрамку пераходзяць ад апісання адзінкавых гістарычных падзей да колькаснага аналізу масавых з'яў і працэсаў, выкарыстоўваючы пры гэтым статыстычныя метады. Лічбавы матэрыял шырока выкарыстоўвалі ў сваіх працах В. В. Ключэўскі, С. М. Салаўёў і інш. Пастаноўка праблем сацыяльнай гісторыі на грунт дакладных навукова-статыстычных даследаванняў пачала ажыццяўляцца ў 1920 – 30-я гг. у заходнееўрапейскай і амерыканскай гістарыяграфіі. З 1950-х гг. шырока сталі ўжывацца для апрацоўкі статыстычных дадзеных метады матэматычнай статыстыкі. З дапамогай матэматыка-статыстычнах метадаў І. Д. Кавальчанка, Л. І. Бародкін, Л. В. Мілоў даследавалі сялянскую гаспадарку XIX ст.; А. Р. Бухавец – грамадскую свядомасць сялян у час рэвалюцыі 1905 – 1907 гг.; Б. М. Міронаў – горад і сацыяльную гісторыю Расіі XVII – XIX стст. Выкарыстанне гісторыкамі статыстычных метадаў аналізу непазбежна ў галінах гісторыі, дзе масавы (колькасны) бок аб'екта вывучэння прадстаўлены непасрэдна (археалогія, гістарычная дэмаграфія, гістарычная інфарматыка, эканамічная і сацыяльная гісторыя).[3]

**Летапіс –** гэта гістарычнае апавяданне, у якім звесткі размяшчаюцца пад пэўнымі гадамі. У розных народаў у самой назве такой формы гісторыка-літаратурнага твора знаходзіцца ўяўленне аб пагадовым асвятленні падзей: усходнеславянская (руская) – «летописание» (па гадах); польская – «рочнік» (ад слова «рок» – год); у рымлян і раманскіх народаў – «анналы» (ад «annus» – год). Прыкладна з XIV ст. на усходнеславянскіх землях пры захаванні ў цэлым пагадовай сеткі ўсё большае значэнне пачаў набываць сюжэт гістарычнага апавядання. Гэта часам вымушала летапісца адступаць ад запісу па гадах, што прыводзіла да пераўтварэння летапісу ў **хроніку**.

Першыя летапісы не захаваліся да нашага часу, і, па сутнасці, гісторыкі сёння маюць справу не з летапісамі, а з летапіснымі зводамі – гісторыка-літаратурнымі творамі, складзенымі на аснове папярэдніх летапісных запісаў (у далейшым, аднак, дзеля скарачэння будзем называць іх летапісамі). Летапісныя зводы дайшлі да нас дзякуючы таму, што яны шмат разоў перапісваліся (спісваліся – адсюль і **«спісы»**). Пры гэтым

[3] Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1, с. 417 – 420.

больш познія летапісныя зводы не толькі з'яўляюцца спісамі папярэдніх, але і ўтрымліваюць дадатковыя гістарычныя звесткі. Супастаўленне розных спісаў дазваляе вызначыць пратограф – першапачатковы арыгінал, з якога яны спісваліся. Падчас працы з летапісамі пісцы часам рабілі памылкі. Калі тэкст перапісваўся ў пэўнай мясцовасці ці шмат разоў, то ўзнікалі спісы з недакладнасцямі і скажэннямі – **ізводы** (напрыклад, існуе Наўгародскі першы летапіс малодшага і старэйшага ізводаў). У асобных выпадках пад уплывам змяненняў палітычных ці іншых абставін летапіс свядома перапраўляўся. Так узніклі новыя ***рэдакцыі*** летапісных зводаў. *Рэдакцыя* ўключае некалькі спісаў, блізкіх, але не ідэнтычных па тэксце. Калі ж у асобны летапісны звод злучаны розныя рэдакцыі, то даследчык будзе мець справу ўжо з іншым летапісным помнікам.[4]

Тэкст, ад якога пайшлі астатнія тэксты спісаў дадзенай *рэдакцыі*, прынята называць ***архетыпам*** рэдакцыі. Архетып можа быць у спісаў не толькі якойсьці рэдакцыі, але і спісаў цэлага зводу. Паняцце архетыпа выкарыстоўваецца рэдка. Больш часта выкарыстоўваецца іншы тэрмін – ***пратограф***. Пад пратографам разумеецца бліжэйшы па тэксце арыгінал аднаго ці некалькіх спісаў. Архетып можа стаяць далёка ад сваіх спісаў, пратограф жа блізкі па тэксце да спісу. Вельмі рэдка бывае, што архетып і пратограф супадаюць.

Першыя звесткі аб беларуска-літоўскіх летапісах з’явіліся ў польскіх аўтараў. Найбольш поўныя дадзеныя аб іх прыведзены ў ***М. Стрыйкоўскага***. Расказваючы пра гісторыю Вялікага княства Літоўскага, аўтар зрабіў каля 300 спасылак на летапісы, якія ён называў летапісамі рускімі, літоўскімі, старадаўнімі рускімі і г.д. Храніст адзначыў, што ўсе яны “па-руску пісаны”, і паведаміў, што адзін з самых змястоўных летапісаў ён атрымаў ад князёў Заслаўскіх, астатнія 12 – 14 здабыў сам “з вялікімі стратамі працы і сродкаў”. Аднак, аб ілюстраваным Радзівілаўскім летапісе яму, верагодна, не было вядома.[5]

Развіццё летапісання на Беларусі даследчыкі дзеляць на ўмоўныя перыяды:

1. XII – XIV стст. – зараджэнне мясцовага летапісання. Перыяд феадальнай раздробленасці абумовіў тое, што інтарэсы асобных феадальных цэнтраў абмяжоўвалі кругагляд летапісца. Летапісы XII – XIV стст. – гэта гісторыя пэўнага ўдзельнага княства. Выразна мясцовы характар мае

[4] Ходзін С.М. Летапісанне на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – с. 81 – 82.
[5] Улашчык М.М. Выбранае / уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка. – Мн., 2001, с. 169 – 170.

Полацкі летапіс XII ст. (калі прызнаць рэальным яго існаванне) і Навагародскі XIII ст. Такі ж падыход захаваўся і ў летапісанні ў Смаленску (XIV ст.).

2. XV – XVI стст. – этап росквіту летапісання на Беларусі (і ў Вялікім княстве Літоўскім наогул). На развіццё летапісання гэтага перыяду накладала адбітак барацьба ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы. У адпаведнасці з ходам азначанай барацьбы другі этап летапісання можна падзяліць на два перыяды: 1) з пачатку і да 80-х гг. XV ст.; 2) з канца XV ст. і да канца XVI ст. На працягу першага перыяду ВКЛ валодае ініцыятывай, яго князі праводзяць “агульнарускую” палітыку – адсюль імкненне вывесці гісторыю Русі Літоўскай ад Русі Кіеўскай (як і Маскоўскай). З канца XV ст. палітычную ініцыятыву перахоплівае Маскоўская дзяржава і характар летапісання паступова змяняецца. Дынастыя князёў літоўскіх (а разам з тым і гісторыя дзяржавы) вядзецца з захаду, з Рыма.

3. XVII – пачатак XIX стст. – этап заняпаду летапісання. Ужо з другой паловы XVI ст., калі ВКЛ пачынае губляць сваю самастойнасць, можна заўважыць паступовую трансфармацыю старых жанраў і замену іх новымі. З’яўляецца “Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсёй Русі” Мацея Стрыйкоўскага – першая гісторыя Вялікага княства Літоўскага элементарна-крытычнага характару, а таксама Баркулабаўскі летапіс. Для апошняга характэрна спалучэнне летапісання і мемуарнай літаратуры. У XVIII ст. былі спробы аднавіць старую летапісную форму апісання мінулага (гарадскія хронікі), але гэтыя спробы сталіся апошнімі.[6]

З усяго вялікага корпусу ўсходнеславянскіх летапісаў нас цікавяць так званыя беларуска-літоўскія летапісы, у якіх выкладаецца гісторыя Вялікага княства Літоўскага і якія напісаны на тэрыторыі гэтай дзяржавы. Назву *беларуска-літоўскія летапісы* прапанаваў **М. М. Улашчык**.[7]

Летапісы, якія ствараліся на тэрыторыі Беларусі ў XII – XIV стст. мелі мясцовы характар. У іх апісваліся падзеі, што датычыліся пераважна гісторыі асобнага ўдзельнага княства і яго сталіцы. Паводле жанравай формы яны, як і іншыя старажытныя летапісы, не былі цэльнымі творамі, сюжэтна закончанымі гістарычнымі аповесцямі, а мелі фрагментарны характар, падзяляліся на асобныя, нярэдка слаба звязаныя паміж сабой часткі – пагадовыя запісы, аб’яднаныя толькі агульнасцю тэмы і формы гістарычнага апавядання. На беларускіх землях у эпоху сярэднявечча бытавалі таксама гістарычныя зборнікі наўгародскага, маскоўскага, цвярскога, пскоўскага паходжання (напрыклад, летапісы Фоція, Аўраамкі) і інш.

---

[6] Ходзін С.М. Летапісанне на Беларусі, с. 82.
[7] Улашчык М.М., с. 169.

Найбольш старажытнымі з’яўлюцца **Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі летапісы** “Аповесці мінулых гадоў”. Лаўрэнцьеўскі летапіс захаваўся ў адзіным спісе, зроблены групай пісцоў пад кіраўніцтвам манаха Лаўрэнція ў 1377 г. для суздальска-ніжагародскага князя Дзмітрыя Канстанцінавіча. Яго тэкст заканчваецца на 1305 г. Акрамя “Аповесці мінулых гадоў” Лаўрэнцьеўскі летапіс утрымлівае апавяданне аб паўднёва-рускіх і суздальскіх падзеях, потым ідуць агульнарускія падзеі. У Лаўрэнцьеўскім летапісе ўтрымліваецца інфармацыя аб Полацкім княстве. Напрыклад, пад 1128 г. знаходзіцца вялікае апавяданне аб Усяславічах полацкіх. Тут жа апісваецца і драматычная гісторыя Рагнеды. Некаторыя гісторыкі лічаць, што гэтыя звесткі трапілі ў Лаўрэнцьеўскі летапіс з загінуўшага Полацкага летапісу. [8]

У Іпацьеўскім летапісе даследчыкі вылучаюць дзве галоўныя часткі. Першая пачынаецца “Аповесцю мінулых гадоў” і даведзена да 1198 г.; другая апісвае падзеі ў паўднёва-заходняй Русі пасля смерці вялікага князя Рамана Мсціслававіча. Асабліва цікавая інфармацыя Галіцка-Валынскага летапісу пра ўтварэнне Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

Агульнадзяржаўнае беларуска-літоўскае летапісанне, выкліканае да жыцця надзённымі патрэбамі часу, было адлюстраваннем агульнай палітычнай і культурнай гісторыі беларусаў і літоўцаў XIV – XVI стст., іх сумеснай барацьбой за нацыянальную і палітычную незалежнасць. Яно скончыла сваё існаванне разам са стратай у другой палове XVI ст. дзяржаўнай самастойнасці. Заняпад летапісання быў абумоўлены дзвюма галоўнымі прычынамі:

1) зменамі ў сацыяльным, палітычным і нацыянальным становішчы беларускага народа ў складзе Рэчы Паспалітай і звязаным з гэтым заняпадам беларускай культуры;

2) трансфармацыяй самога летапіснага жанру. Традыцыйныя летапіс, хроніка на працягу гісторыі не маглі не змяняцца. Выцясненне традыцыйных жанраў новымі гісторыка-літаратурнымі жанрамі пачалося ў другой палове XVI ст., калі з’явілася “Хроніка” Мацея Стрыйкоўскага, якая мела крытычны характар, а не проста ўтрымлівала пагадовыя запісы.[9]

У другой палове XV ст. быў складзены **першы агульнадзяржаўны летапісны звод** Вялікага княства Літоўскага, які часта даследчыкі называюць беларуска-літоўскім летапісам 1446 г. Да гэтага зводу адносяцца на-

---

[8] Семянчук А.А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі: вучэб. дапаможнік. – Гродна, 2000, с. 17.
[9] Там жа, с. 18.

ступныя спісы: Нікіфараўскі, Супрасльскі, Слуцкі, Акадэмічны, Віленскі, «Origo regius...». Усе яны складаюцца з трох частак:

1) “агульнарускай”,

2) смаленскай,

3) “Летапісца вялікіх князёў літоўскіх”.

У Слуцкім летапісе парадак змяшчэння частак адваротны. Частка першая змяшчае перыяд з 854 да 1446 г., у ёй не пазначаны гады з 1430 па 1445. Частка другая (смаленская) змяшчае падзеі 1430 – 1445 гг. Трэцяя частка мае падзагаловак “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” і ўключае два не вельмі звязаных паміж сабой апавяданні, якія храналагічна ахопліваюць час ад 70-х гг. XIV ст. да 30-х гг. XV ст.

Першая частка вызначае Вялікае княства Літоўскае як цэнтр збірання рускіх зямель. У “агульнарускай” частцы прапушчаны ці перапрацаваны ўсе звесткі, якія паказвалі вялікіх князёў у непрывабным святле. Крыніцамі для складання часткі былі летапісныя зводы, складзеныя пры ўдзеле мітрапалітаў Кіпрыяна і Фоція. “Агульнаруская” частка заканчваецца падзеямі 1420-х гг., звестка пра 1446 г. мае характар пазнейшай прыпіскі.

Другая частка не з’яўляецца цэласнай, а складаецца з трох раздзелаў: Смаленскай хронікі, пахвалы Вітаўту і кароткіх запісаў за 1432 – 1445 гг. У яе аснове – Смаленскі летапіс, які пачаў весціся з кан. XIV ст.; у 1430 – 1440 гг. быў перапынены, а з 1440 – адноўлены (запісаны падзеі за 1432 – 1440 гг. і 1441 – 1445 гг.).

Частка трэцяя складаецца з асобных апавяданняў – “Летапісца...” і “Аповесці пра Падолле”. У “Летапісцы” выкладаецца палітычная гісторыя Вялікага княства Літоўскага амаль за стагоддзе: ад смерці Гедыміна (1341) да смерці князя Вітаўта (1430). На думку В.А. Чамярыцкага «Летапісцу вялікіх князёў літоўскіх» папярэднічаў нейкі іншы помнік. Першая частка летапісца была напісана ў перыяд паміж 1382 – 1392 гг. Праз пэўны перыяд наступны аўтар дапоўніў першапачатковую частку «Летапісца» апавяданнем пра пазнейшыя падзеі. Тэкст гэтага помніка складаўся паступова, паэтапна. “Аповесць пра Падолле” мела на мэце акрэсліць правы княства на гэтую частку сучаснай Украіны падчас яе захопу палякамі.[10]

**Другі беларускі летапісны звод** уключае летапісы: Красінскі, Патрыяршыя А і Б, Альшэўскі, Археалагічнага таварыства, Румянцаўскі, Ціханравава, Познаньскі, Еўраінаўскі. Для ўсіх іх характэрна злучэнне двух асобных летапісных помнікаў: легендарнай гісторыі аб паходжанні

[10] Ходзін С.М. Летапісанне на Беларусі, с. 87 – 88.

князёў і шляхты ВКЛ ад знатных рымлян (“Хронікі”), і “Летапісца вялікіх князёў літоўскіх”. З’яўленне легендарнай часткі было выклікана імкненнем паказаць шляхту ВКЛ не менш радавітай, чым шляхта Кароны, а таксама адказаць на распаўсюджаную ў Еўропе легенду аб паходжанні дынастыі вялікіх князёў літоўскіх ад конюха. Першая частка II беларускага зводу мае поўную назву “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”. Слова “рускага” тут адсутнічае не выпадкова. Найбольш верагодна яна ўзнікла ў 20-я гг. XVI ст. у асяроддзі князёў Гаштольдаў і Гальшанскіх, паходжанне якіх выводзіцца непасрэдна ад нашчадкаў рымскай знаці, а “гасударом усіх рускіх” называў сябе маскоўскі вялікі князь, таму слова “руская” і было выкінута. Паказальна, што “агульнаруская” частка ў II беларускім зводзе зусім адсутнічае.

**В. Чамярыцкі** вызначае ў складзе II беларускага зводу *3 рэдакцыі*: кароткую (летапіс Красінскага і блізкі да яго Патрыяршы А), пашыраную (Патрыяршы Б, Румянцаўскі, Альшэўскі, Археалагічнага таварыства, Ціханравава) і поўную (Познаньскі і Рачынскага). Узнікненне поўнай рэдакцыі ён датуе першай пал. 50-х гг. XVI ст.[11]

**Трэці беларускі летапісны звод** больш вядомы пад назвай **“Хроніка Быхаўца”,** якую ён атрымаў ад адзінага вядомага даследчыкам спіса, які выяўлены ў бібліятэцы памешчыка Быхаўца (маёнтак Магілёўцы Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні) у 1820 годзе. Хроніка ахоплівае гісторыю ВКЛ ад легендарных часоў да 1506 г. Каштоўнасць яе ў тым, што яна ўтрымлівае арыгінальныя звесткі за 2-ю пал. XV ст. – пач. XVI ст. Яна з’явілася ў выніку перапрацоўкі трох летапісных помнікаў: Слуцкай рэдакцыі і беларускага зводу, Іпацьеўскага летапісу, поўнай рэдакцыі “Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”. Прычынай узнікнення дакумента стаў пачатак Лівонскай вайны і неабходнасць нагадаць ліцвінам пра іх слаўнае мінулае ў барацьбе з Маскоўскай дзяржавай. Па меркаванню **М. М. Улашчыка**, “Хроніка” была пачата праваслаўным, а працягнута католікам. Месцам узнікнення, верагодна, быў Навагрcraдак. [12]

Аслабленне ВКЛ, наступ каталіцызму, працэсы апалячвання прыводзяць да таго, што летапісанне губляе свой агульнадзяржаўны характар. Павялічваецца ўвага да мясцовых падзей. Летапісы набываюць пераважна мемуарны характар. У якасці прыклада можна прывесці **Баркулабаўскі летапіс**. Летапіс напісаны ў канцы 1580 – 1608 гг., найбольш верагодна, святаром **Фёдарам Філіповічам**, а запіс 1633 г. зроблены паз-

[11] Там жа, с. 89 – 91.
[12] Там жа, с. 91.

ней. Летапіс насычаны ўласнымі ўражаннямі аўтара. У ім утрымліваюцца звесткі пра дзеянні рускіх войск пад Магілёвам у апошні перыд Лівонскай вайны, аб паходзе казакаў С. Налівайкі на Беларусь, аб Ілжэдмітрыі II і інш.[13]

Спробы аднавіць летапісанне ў першай пал. XVIII ст. прывялі да ўзнікнення гарадскіх хронік. Найбольш вядомая **“Магілёўская хроніка” Т. Р. Сурты і Трубніцкіх**, якая напісана на працягу жыцця некалькіх пакаленняў жыхароў, хроніка адлюстроўвае не толькі падзеі, але і забабоны, міфы таго часу. Магілёўскую хроніку пачаў пісаць Т. Р. Сурта і давёў яе ад легендарных часоў да 1701 г. З лета гэтага года па люты 1746 запісы вёў Юры Трубніцкі, з 1747 па 1787 гг. – яго сын Аляксандр; у 1788 – 1810 гг. яе працягвалі некалькі чалавек, імёны якіх невядомы; з 1812 па 1856 гг. хроніку вёў сын Аляксандра Міхал; апошні запіс Івана Міхайлавіча Трубніцкага пазначаны 1867 г. У рукапісе адсутнічае тэкст ад лютага 1709 г. да 1744 г., страта яго адбылася ў кан. XVIII ст. ці пач. XIX ст. У 1887 г. хроніка была надрукавана ў перакладзе на рускую мову, зробленым Н. Гартынскім. Пераклад быў са скарачэннямі і недастаткова якасным.

Другая вядомая хроніка – **“Запіскі ігумена Арэста”** ахоплівае падзеі больш чым за пяцьсот год (ад 1578 да 1847 гг.). Аўтар выкарыстаў “Магілёўскую хроніку” і асабістыя назіранні. Твор напісаны на польскай мове. Вядомы два спісы “Запісак” – кароткі і поўны. У поўным змешчана ананімная хроніка XVIII ст., якая з’яўляецца самастойным творам.

Да гарадскіх хронік адносяцца таксама *віцебскія хронікі* **(Панцырнага і Аверкаў)** і ананімная **Слуцкая**. Віцебская хроніка меншая аб’ёмам і больш бедная па змесце ў параўнанні з магілёўскімі. Яе аўтарамі былі мяшчане М. Панцырны, бацька і сын Аверкі, Я. Чарноўскі. Напісана яна па-польску. У 1883 г. хроніка ў перакладзе на рускую мову надрукавана А. П. Сапуновым. У 1888 г. яна выдадзена ў арыгінале.[14]

Гісторыя публікацый летапісаў складаная. У XIX ст. О. М. Бадзянскі апублікаваў частку крыніцы, атрымаўшую назву летапіса Рачынскага ці Познаньскага летапісу. Яна ўваходзіла ў склад рукапіснага зборніка XVI ст., у якім змешчаны літаратурныя творы.

У 1854 г. А. Н. Папоў апублікаваў большую частку Увараўскага ці Слуцкага летапісу. У пачатку 1860-х гг. І. П. Карнілаў арганізаваў экспедыцыю, вынікам якой была знаходка Тураўскага евангелля і летапісу Аўраамкі. Апошні быў знойдзены ў 1864 г. у Полацку. Зараз летапіс Аўра-

[13] Там жа, с. 92.
[14] Улашчык М.М., с. 181 – 184.

амкі захоўваецца ў Літве, частка рукапісу, што датычыцца Літвы называецца Віленскім летапісам.

У 1888 г. польскі вучоны А. Прахаска апублікаваў знойдзены ім у матэрыялах Кароннай метрыкі ўрывак беларуска-літоўскага летапісу, перакладзены на лацінскую мову. У 1902 г. Б. А. Вахеровіч надрукаваў летапіс, названы ім Румянцаўскім (бо знаходзіўся ў Румянцаўскім музеі). У 1877 г. П. А. Куліш апублікаваў Баркулабаўскі летапіс.

Найбольшая колькасць беларуска-літоўскіх летапісаў змешчана ў апублікаваным ***Поўным зборы рускіх летапісаў*** (т. XVII). У т. XXXII ПЗРЛ змясцілі Хроніку Літоўскую і Жамойцкую, Хроніку Быхаўца, віцебскі летапіс Панцырнага і Аверкаў, Баркулабаўскі летапіс, урыўкі з “Летапісца”. Том XXXV уключаў летапісы: Нікіфараўскі, Супрасльскі, Слуцкі (Увараўскі), Віленскі, Археалагічнага таварыства, Акадэмічны, Валынскі кароткі, Красінскага, Рачынскага, Альшэўскі, Румянцаўскі, Еўрыінаўскі, у дадатку да тома змешчана Магілёўская хроніка Т. Р. Сурты і Ю. Трубніцкага, урывак з летапісу, надрукавага ў 1836 г. П. А. Муханавым, радаслоўная кн. Адзіцэвічаў, па замове якіх быў перапісаны Супрасльскі летапіс.[15]

Такім чынам, летапісанне на Беларусі мае шматвякавую гісторыю. Летапісы і хронікі з’яўляюцца багатай крыніцай гістарычнай інфармацыі.

Дакументы асабістага паходжання фіксавалі ўражанні асоб, сучаснікаў падзей. Гэта самыя суб'ектыўныя сведчанні мінулага. Звычайна вылучаюць наступныя іх віды:

***Мемуары*** (успаміны) відавочцаў падзей. На гэтых творах адбілася тая сацыяльна-палітычная атмасфера, у якой яны пісаліся.

Наступны від – ***дзённікі*** – рэгулярныя запісы ўражанняў, назіранняў, думак наконт найбольш важных падзей свайго і грамадскага жыцця. Іх асаблівасць у перадачы настрояў і дэталяў жыцця эпохі. Успаміны і дзённікі часам аб'ядноўваюць пад назвай ***занатоўкі.***

Трэці від – ***перапіска*** – пісьмовы абмен уражаннямі і думкамі аб найбольш значных падзеях свайго і грамадскага жыцця.

**Мемуары** (ад лац. *memoria* – памяць) – успаміны пра мінулае, напісаныя ўдзельнікамі, альбо сведкамі якіх-небудзь падзей. Да мемуараў належаць дзённікі, творы аўтабіяграфічнага жанру, дакументальная літаратура. Цікавасць даследчыкаў да мемуараў найбольш адчувальна з 2-й пал. XIX ст. Іх вылучаюць у асобную групу ў аглядах крыніц па гісторыі Расіі К. Бястужаў-Румін, В. Ключэўскі, В. Іконнікаў. Выходзяць буйныя выданні

[15] Там жа, с. 174 – 177.

мемуараў. Прадмовы да іх пісалі А. Афанасьеў, П. Барценяў, А. Пыпін, А. Строеў, Н. Чэчулін і інш. Н. Д. Чэчулін у 1891 г. пачаў чытаць студэнтам курс "Рускія мемуары XVIII ст." Асноўнае прызначэнне мемуараў для гісторыка ён бачыў у тым, што яны "дазваляюць зразумець логіку мінулых пакаленняў".

На Беларусі мемуары з'явіліся ў кан. XVI ст. – 1-й пал. XVII ст. Як дакументы свайго часу мемуары маюць вялікую каштоўнасць. У "Дзённіку" Ф. Еўлашоўскага, "Дыярыушы" А. Філіповіча традыцыі беларускага летапісання спалучыліся з асабістымі запісамі, што дало магчымасць стварыць шырокую панараму тагачаснага грамадска-палітычнага жыцця, ахарактарызаваць многіх гістарычных асоб, паказаць жыццё розных слаёў грамадства. У мове твораў шмат паланізмаў (Еўлашоўскі) альбо царкоўнаславянізмаў (Філіповіч). На працягу XVII ст. на Беларусі мемуары ствараліся на польскай мове (Б. Бжастоўскі, А. Каменскі-Длужык, С. Незабітоўскі, Я. Храпавіцкі і інш.) У XVIII ст. гэта творы "Успаміны" К. Завішы, М. Залескага, Ю. Нямцэвіча, "Успаміны пра жыццё" Л. Галамбёўскага, "Дыярыушы" У. Лапацінскага, М. Радзівіла і г.д. Аднак з'явіліся творы на мяшанай беларуска-украінскай мове ("Жыццё і пакуты" І. Турчыноўскага), у кан. XVIII ст. – на рускай мове ("Запіскі" А. Луніна, С. Тучкова, Л. Энгельгарта, "Сапраўднае апавяданне" Г. Дабрыніна, "Жыццё" А. Пішчэвіча і інш.). У XIX ст. мемуары на Беларусі шматмоўныя, значную іх частку складаюць мемуары на рускай мове. Напісаны яны пераважна прадстаўнікамі рускай інтэлігенцыі, чыноўнікамі, якія жылі на тэрыторыі Беларусі (М. Багамолаў, М. Бярэзін, Ф. Глыбоўскі, А. Ламачэўскі, Ф. Мірковіч, І. Нікоцін, М. Палявы і інш.). На рускай мове напісаны "Успаміны" Ф. Булгарына, "Дзённік" М. Вежбаловіча, успаміны З. Даленгі-Хадакоўскага і інш. Развівалася і польскамоўная мемуарыстыка, да якой адносяцца "Успаміны з мінулага" А. Адынца, "У даўнейшыя гады" С. Акуліча, "Вандроўка па малых дарогах" К. Буйніцкага і інш. Толькі ў канцы XIX ст. адбыўся зварот да беларускай мовы. Найбольш цікавым з такіх твораў з'яўляюцца мемуары Абуховіча. Гэты твор адлюстраваў агульную тэндэнцыю – набліжэнне да мастацкай літаратуры. З'яўляюцца мемуары аўтараў недваранскага паходжання: сялян (Л. Корхаў, А. Крылоў), разначыннай інтэлігенцыі (Сініцкі), рабочых (Я. Гурвіч, М. Макарэвіч і інш.). Мемуарыстыка XX ст. адлюстроўвае рэвалюцыйныя пераўтварэнні пачатку стагоддзя, войны. Выходзяць серыі – "Ваенныя мемуары," "Літаратурныя мемуары". Мемуарныя творы належаць перш за ўсё знакамітым людзям. Выдавецтва "Беларусь" з 1971 г. выпускае серыю "Мемуары".

Шырока вядомы успаміны беларускіх пісьменнікаў “Вачыма часу” М. Лужаніна, “Некалькі хвілін чужога жыцця” Я. Скрыгана, “Споведзь” Л. Геніюш, “Дзённік” Я. Драздовіча і інш. Характэрнай рысай мемуараў XX ст. з’яўляецца адыход на другі план жыцця аўтара, якое разглядаецца праз прызму грамадскіх і палітычных падзей.[16]

**Літаратурныя і публіцыстычныя творы** таксама могуць выкарыстоўвацца ў якасці крыніц. У ***літаратурных творах*** мастацкая форма не менш значная чым сам змест твора. Літаратурныя творы разнастайныя па змесце, жанрах, напрамках і г.д. Напрыклад, для сярэднявечнай літаратуры характэрны наступныя напрамкі: клерыкальная літаратура, народны эпас, рыцарская літаратура, гарадская літаратура і інш. Тую ж сярэднявечную літаратуру падзяляюць па жанрах на: гістарычную прозу (летапісы, хронікі), творы прыродазнаўчага характару (“Шастаднёвы”, “Фізіялогіі” і інш.), паломніцкую літаратуру (“Хаджэнне Багародзіцы па пакутах”), літаратуразнаўчыя працы (трактат Георгія Хірабоска “О образех”) і г.д.[17] (*гл. Г. Я. Адамовіч З крыніц сусветнай літаратуры, С. 96 – 100*). Асаблівасцю літаратуры з’яўляецца тое, што яна скіравана не столькі на фіксаванне падзей, колькі на раскрыццё літаратурнага вобраза.

***У публіцыстычных творах*** пераважаюць палемічныя функцыі, яны не толькі фіксуюць падзеі, але і адлюстроўваюць адчуванні, пачуцці, роздумы аўтараў аб пэўных падзеях. Злабадзённыя праблемы прызначана адлюстроўваць **публіцыстыка**. Гэта такі від гістарычных крыніц, які ўзнік пераважна ў грамадкай сферы. Яна прызначана выказваць меркаванне якой-небудзь сацыяльнай групы аб сацыяльна значнай праблеме.[18]

**Перыядычны друк** – гэта выданні, якія выходзілі з пэўнай перыядычнасцю (раз ў тыдзень, штодзённа, раз у месяц і г.д.) і мелі мэтай публікаванне інфармацыйных і аналітычных матэрыялаў па праблемах эканамічнага, палітычнага, культурнага жыцця. Перыядычныя выданні адлюстроўваюць інтарэсы і пазіцыі розных сацыяльных груп, часцей за ўсё, правячых колаў. Перыядычныя выданні часта выкарыстоўваліся як сродак маніпуляцыі масамі, як сродак барацьбы за ўладу і грамадскі ўплыў. Перыёдыка падзяляецца на газеты, часопісы, бюлетэні, штогадовыя выданні, альманахі і г.д. Перыёдыка таксама магла падзяляцца на дзяржаўныя, грамадскія і прыватныя выданні. Сярод разнастайных жанраў перыёдыкі вылучаюць асноўныя групы: аналітычныя матэрыялы, інфармацыйныя матэрыялы і мастацка-публіцыстычныя. Па зместу выданні падзя-

---

[16] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5., с. 114 – 115.
[17] Адамовіч Г.Я. З крыніц сусветнай літаратуры, с. 96 – 100
[18] Никулин П.Ф., с. 21.

ляюцца на: навуковыя, публіцыстычныя, галіновыя, сатырычныя і г.д. У Заходняй Еўропе перыядычны друк узнік у XVI ст., у Беларусі і Расіі ў XVIII ст.[19] Перыядычны друк дастаткова складаны для вывучэння. Складанасці аналіза вынікаюць з асаблівасцяў яго развіцця, існавання цэнзуры, разнастайнасці форм выкладання матэрыяла.

**Навуковыя працы –** гэта група крыніц, якія адлюстроўваюць навуковыя ўяўленні мінулага, новыя тэарэтычныя і практычныя навуковыя распрацоўкі. Асаблівую цікавасць для гісторыкаў уяўляюць працы па гісторыі. Яны з’яўляюцца прадметам асобнай навуковай дысцыпліны – гістарыяграфіі.[20]

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы.
2. Справаводчыя матэрыялы як гістарычная крыніца
3. Апавядальныя крыніцы.
4. Мемуарныя і эпісталярныя крыніцы.
5. Літаратурныя і публіцыстычныя творы як гістарычныя крыніцы.
6. Летапісы і хронікі як гістарычныя крыніцы.

### Тэмы рэфератаў:

1. “Аповесць мінулых гадоў” як крыніца па гісторыі Беларусі.
2. Гістарычныя падзеі ў “Хроніцы Быхаўца”.
3. Гісторыя публікацый беларуска-літоўскіх летапісаў.
4. Гістарычныя звесткі ў лістах аршанскага старасты Ф. Кміты-Чарнабыльскага.
5. “Гістарычныя запіскі” навагародскага падсудка Ф. Еўлашоўскага як гістарычная крыніца.
6. “Дзённік” Я. Драздовіча як крыніца.
7. “Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і нападобнейшай Еўфрасінні...” як крыніца па гісторыі Полацка.

[19] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 15.
[20] Никулин П.Ф., с. 21.

**Кантрольныя заданні да практычнага занятка “Пісьмовыя крыніцы”**

**Заданне 1**

Пры вывучэнні асаблівасцяў летапісання ўсходніх славян многія даследчыкі (М. Прыселкаў, Б. Рыбакоў, А. Шахматаў) адзначалі, што летапісцы для пэўных выпадкаў выкарыстоўвалі асаблівыя формы. Напрыклад, успамін імя дзеда ўваходзіў у склад урачыстых формул некралогаў, калі памерлага князя называлі па імені, па прозвішчу і імені дзеда, вызначаючы тым самым прыналежнасць да той ці іншай княжацкай галіны. Напрыклад, некралог князя Давыда Расціслававіча:

*«…Преставися благоверный князь Смоленский Давыд, сын Растислава, внук же великого князя Мстислава…» (1197, игумен Моисей).*

Падумайце, чаму летапісец у апавяданні пра паход князя Ігара ў 1185 г. піша: *«…В то же время Святославичь Игорь, внук Олгов поеха из Новгорода…»*

Для праверкі сваёй версіі, раім звярнуцца да кнігі Б. А. Рыбакова Рускія летапісцы і аўтар “Слова пра паход Ігараў”. – М.: “Навука”, 1972. – С. 18 – 26.

**Заданне 2**

Хто падзяліў крыніцы на *рэшткі культуры* і *гістарычныя паданні*?

а) А. С. Лапо-Данілеўскі;

б) І. Л. Шэрман;

в) Л. М. Пушкароў;

г) І. Д. Кавальчанка.

**Заданне 3**

Супастаўце назву крыніцы і яе тып:

| | |
|---|---|
| 1. Заканадаўчы акт | а) “Хаджэнне Багародзіцы па пакутах” |
| 2. Статэстычны матэрыял | б) “Споведзь” Л. Геніюш |
| 3. Летапіс | в) “Статыстычная справаздача Магілёўскай гуерні да 1914 г.” |
| 4. Мемуар | г) “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” |
| 5. Літаратурны твор | д) Устава дзяржаўцам 1529 г. |

**Заданне 4**

Якой дзяржаўнай установай у ВКЛ у розны час кіравалі наступныя асобы: М. Малдрык, Ф. Казлоўскі, А. Судзімонтавіч, М. Радзівіл, А. Валовіч, М. Вішнявецкі, І. Храптовіч?

**Заданне 5**

Галоўнымі выданнямі статыстычных камітэтаў былі:

а) зборнікі дакументаў;

б) памятныя кніжкі губерняў;

в) справаздачы губернатараў;

г) рэестры.

**Заданне 6**

Якія даследчыкі ў савецкі час вывучалі пры дапамозе матэматыка-статыстычных матэрыялаў сялянскую гаспадарку XIX ст.?

а) Б. М. Міронаў, С. М. Салаўёў, В. В. Ключэўскі;

б) А. Н. Папоў, П. А. Куліш, Б. А. Вахеровіч;

в) І. Д. Кавальчанка, Л. І. Бародкін, Л. В. Мілоў;

г) П. А. Муханаў, І. Турчыноўскі, М. Вежбаловіч.

**Заданне 7**

Супастаўце назву дзённіка і яго аўтара:

| | |
|---|---|
| 1. “Дарога жыцця і смерці” | а) Я. Колас |
| 2. “Гістарычныя запіскі” | б) П. Глебка |
| 3. “На схіле дзён” | в) М. Танк |
| 4. “Лісткі календара” | г) М. Гарэцкі |
| 5. “На імперыялістычнай вайне” | д) І. Мележ |
| 6. “Гаворыць Клязьма” | е) Ф. Еўлашоўскага |

**Заданне 8**

У якім выдавецтве выйшла серыя “Мемуары”?

а) “Мастацкая літаратура”;

б) “Беларуская энцыклапедыя”;

в) “Беларусь”;

г) “Асвета”.

**Заданне 9**

Сярод разнастайных жанраў перыёдыкі вылучаюць асноўныя групы: аналітычныя матэрыялы, інфармацыйныя матэрыялы, мастацка-публіцыстычныя і г.д. Да якой групы належаць наступныя артыкулы?

а) Зводкі Саўінфармбюро // Звязда. – 1943. – 15 сакавіка.

б) Міхайлаў В. В. Аналіз дзейнасці банкаўскіх устаноў за 2000 г. // Новая эканамічная газета. – 2001. – 20 студзеня.

в) Мае родныя мясціны: краязнаўчы нарыс // Сцяг перамогі. – 2003 – 18 лістапада.

г) Федуковіч В. Г. Райпрамкамбінат не спраўляецца з сваімі задачамі // Новае жыцце. – 1946. – № 20.

**Заданне 10**

Выключыце з пераліку назвы, пад якімі *не выходзіла* ў Вільне штодзённая грамадска-палітычная газета на польскай мове, орган Польскай нацынальна-дэмакратычнай партыі ў Літве?

а) Віленскі дзённік;

б) Віленская праўда;

в) Віленскі кур'ер;

г) Віленскія навіны.

**Заданне 11**

Вызначце ніжэйшую мяжу стварэння "Слова аб паходзе Ігаравым", у якім утрымліваюцца звесткі аб бітве на Нямізе і дзейнасці полацкага князя Усяслава Чарадзея. Пры гэтым улічвайце, што гэты літаратурны твор напісаны не раней самога пахода Ігара, які датуецца па сонечнаму зацменню. Таксама неабходна прыняць у разлік звесткі аб сваяку князя Ігара – галіцкім князе Яраславе Асмомысле.

**Заданне 12**

Сярод зборнікаў дакументаў пазначце той, у якім змешчана найбольшая колькасць апублікаваных беларуска-літоўскіх летапісаў?

а) у "Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах";

б) у "Дакументах па гісторыі Заходнярускага краю";

в) у "Дакументах Маскоўскага архіва Міністэрства юстыцыі";

г) у "Поўным зборы рускіх летапісаў".

## Рэкамендаваная па модулю літаратура:


1. Адамовіч, Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: дапаможнік для настаўнікаў / Г. Я. Адамовіч. – Мн., 1998.

2. Галенчанка Г. Крыніцы гісторыі // Вялікае княства літоўскае: Энцыклапедыя. У 2-х. т. Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. З. Э. Герасімовіч. – Мн., 2005. – С. 152 – 166.

3. Грицкевич, В. П., Каун, С. Б., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. –Мн., 2000.

4. Грыцкевіч, В., Мальдзіс, А. Шляхі праз Беларусь: Нарыс / В. Грыцкевіч, А. Мальдзіс. – Мн., 1980.

5. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учеб. пособие // И. Н. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. – М., 1998.

6. Каун, С. Б., Липницкая, О. Л., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения: учеб.-метод. комплекс / С. Б. Каун, О. Л. Липницкая, С. Н. Ходин. – Мн., 2001.

7. Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя / А. Мальдзіс. – Мн., 1982.

8. Метрыка Вялікага Кнства Літоўскага: Кн. 43 (1523 – 1560): Кн. запісаў 43 (Коп. канца XVI ст.) / падрыхт. В. С. Мянжынскі; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мн., 2003.

9. Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559 – 1566) / падрыхт. А. І. Груша. – Мн., 2001.

10. Никулин, П. Ф. Теория и методика источниковедения в отечественной истории X – начала XX вв.: учеб. пособие / П. Ф. Никулин. – Томск, 2000.

11. Пронштейн, А. П., Задера, А. Г. Методика работы над историческими источниками: учеб.-метод. пособие / А. П. Пронштейн, А. Г. Задера. – М., 1977.

12. Пронштейн, А. П. Методика исторического источниковедения / А. П. Пронштейн. – Ростов н/Д, 1976.

13. Семянчук, А. А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі: вучэб. дапаможнік / А. А. Семянчук. – Гродна, 2000.

14. Свяжынскі, У. М. “Гістарычныя запіскі” Ф. Еўлашоўскага / У. М. Свяжынскі. – Мн., 1990.

15. Тартаковский, А. Г. Русская мемуаристика XVIII – первой половины XIX в.: От рукописи к книге / А. Г. Тартаковский. – М., 1991.

16. Улашчик, Н. По страницам отечественного летописания. Белоруско-литовское летописание // М. Улашчык Выбранае / уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка; прадм. і камент. А. Каўкі. – Мн., 2001.

17. Ходзін С. Летапісанне на Беларусі. Летапісы як гістарычная крыніца // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 81 – 93.

# МОДУЛЬ 6
# КРЫНІЦАЗНАЎЧАЯ ЭЎРЫСТЫКА

**Змест праграмы:**

**Пошук гістарычных крыніц.** Задачы эўрыстыкі. Выяўленне і адбор крыніц.

**Пошук апублікаваных крыніц.** Звесткі аб публікацыях гістарычных крыніц. Перавагі і недахопы публікацыі. Гістарычная бібліяграфія.

**Выяўленне крыніц у архівах.** Элементы выпадковасці ў іх пошуку. Падрыхтоўчая работа да наведвання архіваў. Складанне спісаў архіваў, фондаў, фондаўтваральнікаў. Вывучэнне навукова-даведачнага апарату архіваў, вопісаў фондаў. Вывучэнне спраў. Пошук і сістэматызацыя крыніц. Складанне і збор рабочых матэрыялаў для афармлення работы.

## Вучэбны матэрыял

Незалежна ад таго, у якой вобласці працуе даследчык, ён павінен перш за ўсё мець той матэрыял, з якога можа здабыць карысную інфармацыю. Археолага, этнографа, гісторыка, які працуе ў архіве аб'ядноўвае адна акалічнасць – усе яны спярша шукаюць крыніцы. Перш чым вывучаць крыніцу, даследчык павінен яе знайсці. Дапамагчы ў пошуку крыніц прызначана ***крыніцазнаўчая эўрыстыка.*** Яна выпрацоўвае спецыяльныя метады выяўлення крыніц.[1]

Яшчэ на этапе ***пошукавай дзейнасці*** даследчык *удакладняе пастаўленую мэту і задачы*, а таксама *тэму сваёй працы*. Пры гэтым, даследчык павінен абмяжоўваць пошук не колькасцю крыніц, а тэмай. Задачай даследчыка павінна стаць вырашэнне навуковай праблемы. Адрозніваюць паняцці даследчай задачы і навуковай праблемы.

Навуковая праблема – гэта пытанне ці комплекс пытанняў, якія ўзнікаюць у працэсе навуковага пазнання і вырашэнне якіх мае практычнае ці навукова-пазнаваўчае значэнне. Даследчая задача – гэта кола з'яў рэальнасці, якое належыць вывучэнню, а таксама канкрэтныя аспекты і мэты гэтага вывучэння.[2]

Наступным крокам з'яўляецца *крытыка гістарычнай крыніцы*. Даследчык павінен вызначыць, што ён працуе з сапраўднай (а не падробнай)

---

[1] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н. Теория и история источниковедения. Источниковедение истории Беларуси, с. 19.

[2] Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования, с. 221.

крыніцай, пазначыць *месца і час* яе *стварэння*, яе *аўтарства*. Таксама ўдакладняецца *ступень праўдзівасці звестак крыніцы*. Успрыманенне інфармацыі залежыць ад пазіцыі аўтара крыніцы і ад пазіцыі даследчыка. Таму наступным этапам з'яўляецца *інтэрпрэтацыя крыніцы*. Завяршае працу гісторыка *сінтэз гістарычнай інфармацыі*. На гэтым этапе гісторык сінтэзуе інфармацыю, якая здабыта ў выніку папярэдніх этапаў крытыкі крыніцы, параўноўвае інфармацыю гэтай крыніцы са звесткамі іншых крыніц, удакладняе рэпрэзентатыўнасць (прадстаўнічасць) кожнай крыніцы адносна тэмы.

Такім чынам, першым з этапаў з'яўляецца *пошук і адбор крыніц*. Гэты этап скіраваны на фарміраванне комплексу крыніц, неабходных для атрымання сукупнасці навуковых фактаў. Пушук можна падзяліць на: *1) выяўленне крыніц; 2) адбор крыніц.*[3]

*Выяўленне крыніц* – гэта выяўленне з найбольшай дакладнасцю таго, дзе і якія існуюць крыніцы, якія з іх адносяцца да тэмы даследавання, а таксама ўлік гэтых крыніц. *Адборам крыніц* называецца вызначэнне таго, што варта вывучаць каб атрымаць аптымальны аб'ём гістарычнай інфармацыі. Спосабы, методыкі выяўлення і адбору неабходных для гісторыка крыніц і складаюць раздзел крыніцазнаўства – **крыніцазнаўчую эўрыстыку** (ад грэч. "знаходжу"). Задачамі крыніцазнаўчай эўрыстыкі з'яўляюцца:

а) вызначэнне тыпаў і відаў крыніц, якія адносяцца да тэмы даследавання;

б) выяўленне ўстаноў (архіваў, музеяў, бібліятэк) ці месцаў (пры археалагічных раскопках), дзе гэтыя крыніцы варта шукаць;

в) распрацоўка праграмы і метадаў пошука раней не вызначаных тыпаў крыніц у гэтай установе ці мясцовасці, а таксама выкарыстанне сродкаў навігацыі (каталагі, архіўныя вопісы, дадзеныя аэрафотаздымак, візуальныя прыкметы і г.д.).[4]

У крыніцазнаўчай эўрыстыцы вылучаюць бібліяграфічную і архіўную эўрыстыку. Біліяграфічная эўрыстыка – гэта тэорыя і методыка бібліяграфічных пошукаў, сукупнасць тэарэтычных і практычных ведаў, якія адносяцца да прыёмаў пошуку якога-небудзь тыражыраванага кніжнага матэрыялу ці асобных яго элементаў.

Архіўная эўрыстыка – гэта тэорыя і методыка пошуку неапублікаваных матэрыялаў па тэме. Крыніцазнаўчая эўрыстыка ў такім выпадку прадстаўляецца як асобны раздзел крыніцазнаўства, які прысвечаны

---

[3] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н. Теория и история источниковедения. Пособие для студентов гуманитарных факультетов, с. 15.
[4] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 15.

тэорыі і методыцы пошуку і збора апублікаваных і неапублікаваных матэрыялаў з улікам заканамернасцяў іх узнікнення, існавання і захоўвання.

Пошук крыніц павінен быць падрыхтаваны. Паняцце падрыхтаванасці да пошуку ўключае наступныя элементы:

– дакладнае ўяўленне аб сістэме навуковай інфармацыі і аб тых магчымасцях, якія дае даследчыку выкарыстанне інфармацыйных магчымасцяў крыніц;

– веданне ўсіх магчымых месцаў знаходжання крыніцазнаўчай інфармацыі;

– уменне вылучаць найбольш рацыянальную схему пошука суадносна з задачамі і ўмовамі;

– наяўнасць навыкаў у выкарыстанні бібліяграфічных і архіўных матэрыялаў.[5]

Пры выяўленні крыніц ведаць наперад, якія крыніцы спатрэбяцца немагчыма. Таму неабходна улічваць усе факты, якія могуць адносіцца да тэмы. Таксама асобная група крыніц можа аказацца недасяжнай для даследчыка ці даследчык можа не ведаць аб іх існаванні. Іншы раз гэта вельмі моцна ўплывае на высновы навуковай працы (бо новыя крыніцы адкрывалі б новыя аспекты праблемы).

Новыя дадзеныя, якія намагаецца атрымаць даследчык, заўжды абапіраюцца на ўжо назапашаныя веды. Таму правільны выбар накірункаў пошуку крыніц магчымы пасля таго, як даследчык засвоіць назапашаныя гістарычный навукай веды па тэме. На практыцы гэта азначае, што да пошуку крыніц можна прыступаць толькі пасля вывучэння літаратуры па тэме. Засвоіўшы назапашаныя веды, даследчык адшуквае перш-наперш надрукаваныя матэрыялы – зборнікі дакументаў, мемуары, іншыя выданні, складае іх бібліяграфію. Пры гэтым ён карыстаецца прыёмамі *бібліяграфічнай эўрыстыкі*. Затым ідзе пошук дакументаў у архівах. *Архіўная эўрыстыка* абапіраецца на веды аб заканамернасцях утварэння і прынцыпах захавання архіўных дакументаў. Заканамернасці ўтварэння пазначаюцца шляхам вывучэння гісторыі фондаўтваральнікаў – установаў, арганізацый, асоб, чые матэрыялы захоўваюцца ў архівах. Гэта вывучэнне мае на мэце:

– па-першае, высвятленне часу іх існавання, функцый, унутранай структуры фондаўтваральнікаў, іх папярэднікаў і пераймальнікаў, якія з’явіліся ў выніку рэарганізацый;

---

[5] Там жа, с. 15 – 16.

– па-другое, пазначэнне заканамернасцяў накаплення архіўных дакументаў можа быць дасягнута шляхам вывучэння сістэмы справаводства ва ўстановах і арганізацыях, парадка вядзення і захавання дакументацыі асобнымі гістарычнымі дзеячамі, установамі, што вызначыла асаблівасці архіўных дакументаў і іх накаплення. Наступным крокам з'яўляецца адбор крыніц. Падыходы да адбору залежаць ад тэмы даследавання, характару і складу наяўных крыніц. У тым выпадку, калі тэма абапіраецца на крыніцы, кожная з якіх мае новую, асаблівую інфармацыю, паведамляе аб істотных фактах, то, якой бы вялікай не была іх колькасць, усе яны павінны быць вывучаны. Калі гаворка ідзе аб масавых крыніцах, якія маюць аднатыпную інфармацыю, немэтазгодна павяргаць іх усе вывучэнню. Даследчык павінен правесці працу па аптымізацыі аб'ёму крыніц. У той жа час, вызначаны комплекс крыніц павінен быць рэпрэзентатыўным, гэта значыць, што на яго падставе можна атрымаць сукупнасць навуковых фактаў, якая аб'ектыўна характарызуе з'яву. [6]

Такім чынам, як бачым, першым ідзе пошук апублікаваных крыніц. Гэты пошук неабходны для таго, каб не "ўводзіць" у зварот ужо вядомыя крыніцы. Па правілах бібліяграфічнай эўрыстыкі, на першым этапе неабходна пазнаёміцца з бібліяграфічнымі паказальнікамі і энцыклапедычнымі выданнямі, што дазволіць зрабіць першапачатковы спіс крыніц па тэме. Затым звяртаюцца да бібліятэчных каталагаў. У сістэматычным каталагу ўсе публікацыі размешчаны па тэмах ці галінах ведаў, у алфавітным – па прозвішчах ці імёнах аўтараў, а пры адсутнасці іх, па назвах кніг. У апошнія гады ў бібліятэках з'явіліся электронныя каталагі, якія дазваляюць ажыццявіць пошук па прозвішчах аўтараў, назвах публікацый, ключавых словах, іншых паказчыках.

Выданні крыніц разнастайныя, таму каб арыентавацца ў іх трэба ведаць, што існуюць першасныя і другасныя выданні крыніц. Першасныя выданні ўтрымліваюць самі крыніцы, а другасныя – інфармацыю аб іх.

Да першасных выданняў адносяцца:

– неперыядычныя публікацыі крыніц (напрыклад, "Беларускі архіў старажытных грамат (1507 – 1768 гг.)", 1824 г. выд.);

– перыядычныя публікацыі крыніц;

– публікацыі крыніц, якія працягваюцца на дадзены момант.

У другасных выданнях утрымліваюцца вынікі аналітычна-сінтэтычнай і лагічнай перапрацоўкі першасных выданняў. Сярод іх вылучаюць:

– інфармацыйныя выданні;

---

[6] Гл.: Бандзелікаў М.Ф. Асновы тэорыі і методыкі крыніцазнаўства, с. 34 – 35.

– рэфератыўныя часопісы дзе змяшчаюцца рэфераты крыніц, звесткі аб публікацыях крыніц, крыніцазнаўчыя агляды;

– даведачная літаратура.

У бібліяграфічнай эўрыстыцы важна карыстацца бібліяграфічнымі дапаможнікамі. Бібліяграфічным дапаможнікам называюць упарадкаванае мноства бібліяграфічных апісанняў, што аб'яднаныя па якой-небудзь прыкмеце. Вылучаюць наступныя бібліяграфічныя дапаможнікі:

– бібліяграфічны спіс (дадатак да кнігі ці артыкула ў выглядзе бібліяграфічнага апісання);

– бібліяграфічны паказальнік (дапаможнік з паказальнікам імёнаў, пасляслоўем, зместам, нярэдка ў выглядзе асобнага выдання);

– бібліяграфічны агляд (паведамленне аб крыніцах па пэўнай тэме).

Па свайму прызначэнню біліяграфічныя дапаможнікі могуць насіць улікова-рэгістрацыйны характар. Паказальнікі звычайна ўключаюць кнігі і артыкулы з улікам ступені падрыхтаванасці чытача. Таму, звычайна, такія дапаможнікі рэкамендуюцца студэнтам, якія толькі пасля іх вывучэння пераходзяць да навуковых кніг.

У працы з публікацыямі важна ўлічваць іх магчымую тэндэнцыйнасць. Яна характэрна, напрыклад, для публікацый перыяда Расійскай Імперыі ў адносінах да Беларусі, ці для савецкага перыяда ў адносінах паказа класавай барацьбы працоўных.[7]

Пры пошуку крыніц даследчыку спатрэбяцца прыёмы *гістарычнай бібліяграфіі*. Гэта дапаможная навуковая дысцыпліна, якая займаецца прыёмамі і метадамі пошука, бібліяграфічнага апісання, мэтавага адбору, навуковай сістэматызацыі крыніц і перадачы іх інфармацыі даследчыку. Ёсць два метады бібліяграфічнага пошуку – суцэльны і выбарачны пошук. Суцэльны пошук прадугледжвае прагляд усіх выданняў, у якіх могуць быць звесткі па тэме, ён вельмі працаёмкі. Выбарачны пошук прадугледжвае прагляд акрэсленага кола літаратуры. Гэтага можна дасягнуць шляхам прагляду бібліяграфіі кніг і артыкулаў (гэта спісы крыніц, якія выкарыстоўваліся аўтарамі кніг і артыкулаў). Звычайна ў навуковых выданнях такія спісы з'яўляюцца абавязковымі. Такія спісы даюць больш аператыўныя звесткі аб аб'ёме літаратуры па тэме, чым бібліяграфічныя паказальнікі. Важным момантам у пошуку крыніц з'яўляецца пошук у каталагах і картатэках. [8]

---

[7] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 16 – 17.

[8] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 17 – 18.

Каталаг – гэта пералік крыніц і даследаванняў, што знаходзяцца ў фондах дадзенай бібліятэкі. Картатэка – гэта нанесены на асобныя карткі пералік выданняў, выяўленых па асобнай тэматыцы ці іншаму прынцыпу. Паслядоўнасць размяшчэння картак сістэматычнага каталага адпавядае Універсальнай дзесяцічнай класіфікацыі (УДК) ці Бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі (ББК). У аснову УДК пакладзены дзесяцічны прынцып. Па ім уся сукупнасць ведаў падзелена на дзесяць раздзелаў, кожны з якіх мае дзесяць пададдзелаў і г.д. Напрыклад, гісторыя, геаграфія, бібліяграфічныя матэрыялы маюць лічбу "9".

Даследчыку даводзіцца працаваць не толькі з каталагамі і картатэкамі, але і з бібліяграфічнымі паказальнікамі, даведачнай літаратурай, энцыклапедыямі, бібліяграфічнымі, геаграфічнымі, тэрміналагічнымі і тлумачальнымі слоўнікамі і г.д.[9]

У 90-я гады ХХ ст. папулярным стаў пошук крыніц у глабальнай сетцы Internet. На шматлікіх Internet-старонках, сайтах размешчаны калекцыі архіўных дакументаў, выявы музейных прадметаў, апублікаваны пісьмовыя крыніцы і г.д. Глабальная сетка аб'яднала мільёны карыстальнікаў, што дае магчымасць даследчыку доступу да крыніц за межамі яго краіны. Пошук у сетцы Internet можа ажыццяўляцца пры дапамозе:

– гіперспасылак;

– тэматычных каталагаў (індэксаў – Yahoo, Weblist і інш.);

– пошуковых сістэм (робатаў – Altaviasta, Excite інш.);

– метапошукавых сістэм (робатаў робатаў – напрыклад, MetaCrawler і інш.);

– праграм паскоранага пошуку (Subjecct Search Spidder і інш.).

Агульным недахопам пошука з дапамогай "машын пошука" з'яўляецца атрыманне вялікай колькасці выпадковай інфармацыі. Перавагамі карыстання Internet з'яўляюцца:

1. Даступнасць электронных выданняў дакументаў (нават замежных).

2. Магчымасць вывучаць дакументы архіваў розных краін не пакідаючы сваёй краіны.

3. Магчымасць атрымаць электронныя версіі кніг (у тым ліку і старадаўніх, дрэнна захаваўшыхся, калі ёсць іх электронныя копіі).

4. Атрыманне звестак па гісторыі розных краін і народаў.

5. Магчымасць абмена інфармацыяй з калегамі з розных краін (удзел у канферэнцыях, чатах і г.д.).[10]

[9] Там жа, с. 19 – 20.
[10] Там жа, с. 27 – 28.

У некаторых краінах Internet зрабіўся важнай складаючай творчай працы спецыялістаў гуманітарнага профіля. Беларускія гісторыкі таксама выкарыстоўваюць магчымасці пошука крыніц праз Internet.

Важнай часткай працы гісторыка застаецца праца ў архівах. Пошук неапублікаваных крыніц па праблеме можа быць пачаты толькі тады, калі інфармацыя друкаваных крыніц вычарпана. Архіўныя крыніцы адрозніваюцца ад апублікаваных, яны не прыстасаваны спецыяльна для даследчыка. Пошук архіўных крыніц вельмі працаёмкі, даследчык павінен весці яго ў многіх месцах захавання. Арыентавацца ў архівах дазваляюць агульныя зводныя даведнікі аб архівах краіны. Большасць цэнтральных архіваў маюць таксама свае ўнутраныя даведнікі, пералікі фондаў. Для паспяховага пошуку трэба ведаць гісторыю стварэння і камплектавання архіваў.[11]

Першым цэнтралізаваным архівам на тэрыторыі сучаснай Беларусі быў Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актавых кніг, які пачаў працу ў 1863 г. Ён быў створаны для захавання актавых кніг судовых установ былой Рэчы Паспалітай за перыяд з XVI да канца XVIII стст. з тэрыторый у межах Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай губерняў Расійскай Імперыі. Актавыя кнігі па Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях захоўваліся ў Віленскім цэнтральным архіве старажытных актаў (на тэрыторыі сучаснай Літвы). У 1963 г. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў пераведзены з Магілёва ў Мінск. У 1964 г. у яго ўвайшлі дакументы з архіва Радзівілаў, некаторыя іншыя фонды дарэвалюцыйных архіваў. У красавіку 1992 г. былы Цэнтральны партыйны архіў КПБ і Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у Мінску былі аб’яднаны ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Абласныя партыйныя архівы Брэсцкай і Віцескай вобласцей далучаны да дзяржаўных архіваў, а партыйныя архівы Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай вобласцей пераратвораны ў філіялы дзяржаўных архіваў.

У траўні 1993 г. ЦДАОР быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны архіў, а Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у Гродна – у Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў.

У 1994 г. прыняты закон “Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспуліцы Беларусь”, у 1998 г. у яго ўнесены змены.

У 1995 г. Нацыянальны архіў быў расфарміраваны. Дакументы былога Цэнтральнага партыйнага архіва перададзены ў Беларускі дзяржаўны

[11] Там жа, с. 30.

архіў, які пераўтвораны ў Нацыянальны архіў Рэспулікі Беларусь. Дакументы былога партыйнага архіва Мінскай вобласці перададзены ў дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, а на базе былога Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Мінску ўтвораны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Беларускі дзяржаўны архіў быў перайменаваны ў Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна.

У 1996 г. філіялы абласных архіваўператвораны ў занальныя дзяржаўныя архівы, а былыя партыйныя архівы Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай вобласцяў – у дзяржаўныя архівы грамадскіх аб'яднанняў. У 1997 г. Белкамархіўператвораны ў Дзяржаўны камітэт па архівах і справаводству.[12]

Фонды архіваў можна ўмоўна падзяліць на дзве групы – фонды дзяржаўных устаноў і арганізацый і асабістыя фонды. Каб паспяхова працаваць у архіве трэба азнаёміцца з навукова-даведачным апаратам архіва. Усе дакументы ў архівах размяшчаюцца па фондах, калекцыях, адзінках захавання, справах. Асноўным даведнікам па ўліку дакументаў у архіве з'яўляецца вопіс.

Інвентарны вопіс – гэта ўліковыя дакументы і даведнікі па апісанню дакументаў, яны ўтрымліваюць пералікі загалоўкаў і іншых звестак аб складзе і змесце спраў пэўнага комплекса з самастойнай парадкавай нумарацыяй.

Зводным даведнікам, які аб'ядноўвае звесткі па ўсіх вопісах фонда, з'яўляецца спіс і лісты фондаў. У архівах існуюць і інфармацыйныя даведнікі – каталагі і агляды, даведнікі.

Архіўны каталаг – гэта тып архіўнага даведніка, у якім другасная дакументальная інфармацыя размешчана па прадметах, тэмах, галінах. Каталаг падзяляецца на раздзелы, тэмы. Даследчык можа карыстацца і архіўнымі аглядамі – даведнікамі з сістэматызаванымі звесткамі аб складзе і змесце асобных комплексаў крыніц, іх крыніцазнаўчым аналізам. Па вопісу даследчык вылучае тыя справы, якія яму неабходны для распрацоўкі тэмы. Ён знаёміцца з дакументамі справы, выпісвае назву і змест канкрэтнай крыніцы. У многіх архівах апрацаваны не ўсе фонды. Нярэдка значная колькасць дакументаў пазначаецца па назве першай справы, а пад тым жа пераплётам знаходзяцца і іншыя справы. Звычайна даследчык знаходзіць значна больш крыніц, чым яму патрэбна. Ён вылучае толькі патрэб-

[12] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 20 – 21.

ныя. Пасля выяўлення крыніц ідзе іх атрыбуцыя, г.зн. вызначэнне віда і сапраўднасці крыніц, іх датаванне, вызначэнне аўтарства і г.д. Для даследчыка маюць значэнне характар напісання тэкста, асаблівасці мовы, колер паперы, час стварэння крыніцы. У некаторых выпадках даследчык сутыкаецца з адсутнасцю неабходных яму крыніц. Тады ён павінен высветліць прычыны іх знікнення. [13]

Пры выкарыстанні архіўных дадзеных ёсць пэўныя правілы:

1. У навуковай працы нельга спасылацца на архіўныя крыніцы па чужых звестках, без узгадвання першага даследчыка крыніцы. Калі ж крыніца прыведзена ў працы папярэдніка, трэба спасылацца не на яе, а на працу.

2. Пры цытаванні крыніцы неабходна вельмі асцярожна адносіцца да тэкста, цытаваць не выкідваючы слоў і сказаў, бо гэта можа змяніць сэнс крыніцы. Калі зроблены пропуск, ён адзначаецца шматкроп’ем у скобках.

3. Калі ў тэксце крыніцы выпадкова прапушчаны ці скарочаны словы, даследчык пры цытаванні ўстаўляе іх у квадратных скобках. Старажытныя канчаткі слоў дапушчаецца замяняць на сучасныя. Часта здараецца так, што даследчык знайшоў матэрыял, які можа змяніць ужо існуючы ў навуцы погляд на праблему. Ён можа выступаць са сваімі новымі высновамі толькі, калі ўпэўнены, што вывучыў усё магчымае кола крыніц.[14]

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Задачы гістарычнай эўрыстыкі.
2. Пошук апублікаваных крыніц.
3. Выяўленне крыніц у архівах.

### Тэмы рэфератаў:

1. Магчымасці крыніцазнаўчага пошуку ў Полацкім архіве.
2. Магчымасці бібліяграфічнага пошуку ў бібліятэцы УА “ПДУ.”
3. Сучасныя магчымасці Internet-пошуку па праблемах гісторыі Беларусі.
4. Гісторыя станаўлення архіваў і архіўнай справы ў Беларусі.

---

[13] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 31 – 32.
[14] Гл.: там жа, с. 33.

## Кантрольныя заданні да практычнага занятка
## “Крыніцазнаўчая эўрыстыка”

### Заданне 1

**Які раздзел у крыніцазнаўстве вывучае спосабы, метады выяўлення і адбору неабходных для гісторыка крыніц?**

а) тэарэтычнае крыніцазнаўства;

б) прыкладное крыніцазнаўства;

в) дыпламатыка;

г) крыніцазнаўчая эўрыстыка.

### Заданне 2

**Гістарычнае даследаванне – гэта твор, у якім:**

а) прафесійны гісторык выкладае свае высновы, заснаваныя на вывучэнні гістарычных крыніц;

б) утрымліваюцца фрагменты гістарычных крыніц;

в) аўтар па-мастацку апісвае падзеі мінулага;

г) аўтар апавядае пра гістарычныя падзеі і працэсы.

### Заданне 3

**Гістарычны дапаможнік гэта:**

а) мадэль на падставе якой можна скласці агульнае ўяўленне аб гістарычнай крыніцы;

б) копія гістарычнай крыніцы;

в) зборнік дакументаў, які прызначаны для вывучэння крыніцазнаўчых метадаў;

г) гістарычны твор у якім утрымліваюцца фрагменты гістарычнай крыніцы.

### Заданне 4

**Якія два напрамкі вылучаюць у крыніцазнаўчай эўрыстыцы?**

а) архіўную і бібліяграфічную эўрыстыку;

б) адбор і апісанне крыніц;

в) тэарэтычную і прыкладную эўрыстыку;

г) геральдыку і фалерыстыку.

**Заданне 5**

**Які прынцып размяшчэння выданняў дзейнічае ў бібліятэчным сістэматычным каталагу?**

а) па імёнах, прозвішчах аўтараў;

б) па тэмах ці галінах ведаў;

в) па індэксах УДК;

г) па гадах выданняў.

**Заданне 6**

**Дакументы з якіх губерняў Расійскай Імперыі ўтрымліваў Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актавых кніг, створаны ў 1863 г.?**

а) Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў;

б) Віцескай, Магілёўскай, Смаленскай губерняў;

в) Віцескай, Магілёўскай, Мінскай губерняў;

г) Віленскай, Гродзенскай, Смаленскай губерняў.

**Заданне 7**

**Які даведачны дакумент з’яўляецца асноўным даведнікам па ўліку дакументаў у архіве?**

а) ліст фондаў;

б) вопіс;

в) даведнік;

г) калекцыя.

**Заданне 8**

**Адзначце лічбамі, па якіх крытэрыях ажыццяўляецца падзел усёй сукупнасці крыніц пры:**

| | |
|---|---|
| 1. Класіфікацыі гістарычных крыніц | а) унутраных прыкметах, |
| | б) па часе стварэння, |
| 2. Сістэматызацыі гістарычных крыніц | в) па назвах, |
| | г) па знешніх прыкметах. |

**Заданне 9**

**Выкрэсліце з пераліку тое, што не з’яўляецца задачай крыніцазнаўчай эўрыстыкі:**

а) вызначэнне тыпаў і відаў крыніц, якія адносяцца да тэмы даследавання;

б) апісанне прадметаў, знойдзеных у выніку археалагічных раскопаў, інфармацыя аб культурным прызначэнні якіх страчана;

в) выяўленне ўстаноў (архіваў, музеяў, бібліятэк) ці месцаў (пры археалагічных раскопках), дзе гэтыя крыніцы варта шукаць;

г) распрацоўка праграмы і метадаў пошука раней не вызначаных тыпаў крыніц у гэтай установе ці мясцовасці, а таксама выкарыстанне сродкаў навігацыі (каталагі, архіўныя вопісы, дадзеныя аэрафотаздымак, візуальныя прыкметы і г.д.).

### Заданне 10

Што такое метралогія?

а) раздзел сфрагістыкі;

б) навука, што вывучае адзінкі вымярэння плошчы;

в) навука, што вывучае адзінкі даўжыні;

г) навука, што вывучае адзінкі вымярэння.

### Рэкамендаваная па модулю літаратура:

1. Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм. – Мн., 1969.

2. Воронин, Ю. А. Введение в теорию классификации / Ю. А. Воронин. – Новосибирск, 1982.

3. Глобальная сеть Internet в информационном обеспечении исторических исследований и образования // Е. Б. Белова, Л. И. Бородкин, И. М. Гарскова и др. Ист. информатика. – М., 1996.

4. Государственные архивы СССР: справ.: В 2 ч. – М., 1989.

5. Грицкевич, В. П., Каун, С. Б., Ходин, С. Н. Теория и история источниковедения: пособие для студентов гуманитарных факультетов. – Мн., 2000.

6. Дакументы па гісторыі Беларусі, якія зберагаюцца ў Цэнтральных архівах СССР. – Мн., 1991.

7. Доорн, П. Электронный лабиринт: возможности и «ловушки» компьютерной системы INTERNET для историков // Круг идей: развитие исторической информатики. Тр. II конф. Ассоциации «История и компьютер». – М., 1995. – С. 122 – 135.

8. Каралёў, Г. І. Польскія публікацыі царкоўна-гістарычных крыніц у XIX—XX ст. // Наш радавод. Гродна, 1992. – Кн. 4. ,Ч. 3. – С. 184 – 190.

9. Каталог сборников документов, изданных архивными учреждениями СССР. 1917 – 1960. – М., 1961.

10. Леонтьева, Т. Е. Документальные материалы фонда князей Радзивиллов как исторический источник // Вопр. архивоведения и источниковедения в БССР. – Мн., 1971. – С. 320 – 328.

11. Сокольчик, А. А. Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768 – 1917 гг.): Библиогр. указатель. – Мн., 1976.

12. Правила издания исторических документов. – М., 1969.

13. Пушкин, В. Н. Эвристика – наука о творческом мышлении / В. Н. Пушкин. – М., 1967.

14. Суслова, Е. Н. Поиск архивных документов / Е. Н. Суслова. – Л., 1987.

15. Улащик, Н. Н. Очерки по источниковедению и археографии истории Беларуси феодального периода / Н. Н. Улащик. – Мн., 1973.

16. Федотов, В. В. Техника и организация умственного труда / В. В. Федотов. – Мн., 1983.

17. Ходаковский, И. И. Организация поиска источников и литературы в источниковедческом исследовании: учеб. пособие / И. И. Ходаковский. – М., 1976.

18. Центральный государственный исторический архив Белорусской ССР в г. Гродно: путеводитель. – Мн., 1956.

19. Центральный государственный исторический архив БССР в г. Минске: путеводитель. – Мн., 1974.

# МОДУЛЬ 7
# ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫТЫКА КРЫНІЦ

**Змест праграмы:**

**Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі.** Агульная характарыстыка.

**Устанаўленне тэксту.** Прачытанне і асэнсаванне зместу тэксту. Значэнне кантэксту для разумення граматычных норм і лексічнага зместу крыніцы. Гісторыя тэксту, задачы яе вывучэння. Паняцце рэдакцыі, спісу, ізводу. Інтэрпаляцыі і глосы. Этапы стварэння дакументаў: чарнавікі, белавікі, копіі. Аднаўленне арыгінала паводле тэксту ў некалькіх спісах, ізводах, рэдакцыях. Рэканструкцыя тэкстаў.

**Вывучэнне паходжання тэксту.** Агульная характарыстыка.

**Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы.** Паняцці «каляндар», «эра». Аналіз непасрэднай і ўскоснай інфармацыі аб часе. Сінтэз інфармацыі аб часе. Адлік часу ад вядомай падзеі. Вывучэнне формы дакумента. Дапасаванне звестак з іншых крыніц.

**Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.** Выкарыстанне дадзеных гістарычнай геаграфіі. Спалучэнне звестак графічных і пісьмовых помнікаў. Аналіз непасрэднай і ўскоснай прасторавай інфармацыі, яе сінтэз. Тапонімы і мікратапонімы, этнонімы і інш.

**Атрыбуцыя.** Улік непасрэдных звестак. Прозвішча, імя, мянушка. Раскрыццё крыптонімаў, псеўданімаў. Ананімныя крыніцы і іх атрыбуцыя. Новыя метады ўстанаўлення аўтарства з выкарыстаннем колькасных метадаў і інфармацыйных тэхналогій.

**Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы, яе адрозненне ад граматычнага прачытання тэксту.** Гістарызмы, архаізмы, тлумачэнне паняццяў. Тэрміналагічны аналіз. Вытлумачэнне заканадаўчых крыніц. Выкарыстанне юрыдычнай тэрміналогіі. Вытлумачэнне актаў. Склад актавага фармуляра. Вытлумачэнне апавядальных крыніц. Вывучэнне непасрэднага зместу тэксту, алегорый, іншаказанняў. Веданне канкрэтных гістарычных абставін стварэння крыніцы.

**Выяўленне падложных і падробных крыніц.** Магчымыя мэты іх стварэння. Спосабы выяўлення інтэлектуальнага падлогу.

**Асаблівасці вывучэння рэчавых крыніц.** Прымяненне метадаў іншых навук.

**Вывучэнне інфармацыі гістарычнай крыніцы.** Мэты і задачы ўнутра-

най крытыкі крыніц. Паняцце аб верагоднасці. Паўната і дакладнасць інфармацыі.
Метады выяўлення навуковай каштоўнасці розных відаў пісьмовых крыніц. Крыніца і гістарычны кантэкст.
**Вывучэнне ўплыву ўмоў, у якіх узнікае інфармацыя, на яе паўнату і дакладнасць.** Аналіз сведчанняў, што заснаваны на асабістым назіранні. Крытыка звестак, якія атрыманы з іншых крыніц і абагульненняў. Вызначэнне сацыяльных, палітычных і групавых пазіцый аўтара, іх уплыў на змешчаную ў крыніцы інфармацыю. Метады канчатковага ўстанаўлення каштоўнасці інфармацыі: праверка паўнаты, верагоднасці і дакладнасці інфармацыі адпаведнай крыніцы.
**Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы.** Сінтэз гістарычнай інфармацыі, яго сутнасць і мэты. Супастаўленне звестак, атрыманых на этапе ўнутранай і знешняй крытыкі. Вызначэнне ўзаемасувязі і ўзаемаўплываў. Пабудова генеалагічнага раду крыніц. Паняцце рэпрэзентатыўнасці.

## Вучэбны матэрыял

Гістарычная крыніца, з аднаго боку, уяўляе сабой факт гістарычнага мінулага, а з другога – утрымлівае інфармацыю аб тым ці іншым факце мінулага (гл. модуль 2). ***Гістарычная крытыка крыніцы*** павінна дапамагаць даследчыку пазбавіцца суб'ектыўнасці крыніцы. Гістарычная крытыка крыніц падзяляецца на ***крытыку знешнюю і крытыку ўнутраную***. Асноўным зместам **знешняй крытыкі** з'яўляецца вывучэнне гістарычнай крыніцы як носьбіта інфармацыі аб мінулым (месца, умоў стварэння, аўтарства), а мэтай – вызначэнне сапраўднасці крыніцы. Сапраўднай лічаць такую крыніцу, якая створана ў тым месцы, у той час і тым аўтарам, якія пазначаны ў крыніцы.

Сутнасць **знешняй крытыкі** – у вывучэнні дадзеных крыніцы аб гістарычным факце. З дапамогай такіх катэгорый як паўната і дакладнасць крыніцы вызначаецца ступень дакладнасці інфармацыі, што ўтрымліваецца ў крыніцы. Важнае значэнне мае вытлумачэнне ***прадстаўнічасці*** (***рэпрэзентатыўнасці***) крыніцы адносна самой гістарычнай рэальнасці і ў параўнанні з іншымі крыніцамі. [1]

[1] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 33 – 34.

*Мэтай* **унутранай крытыкі** крыніцы з'яўляецца вазначэнне ступені *адпаведнасці інфармацыі крыніцы* сапраўдным *гістарычным падзеям. Задачамі* ўнутранай *крытыкі* з'яўляецца аналіз інфармацыі крыніцы для вызначэння яе *сапраўднасці, паўнаты, дакладнасці.*

Апошнім этапам крытыкі гістарычнай крыніцы з'яўляецца **сінтэз гістарычнай інфармацыі крыніцы.** На дадзеным этапе даследчык параўноўвае дадзеныя розных крыніц аб гістарычных фактах і мадэлюе гістарычную сітуацыю. Пры гэтым даследчык вызначае ступень рэпрэзентатыўнасці крыніцы, г.зн. наколькі поўна і дакладна ў крыніцы адлюстраваны гістарычны працэс ці з'ява. Таксама робіцца *выснова аб навуковай каштоўнасці інфармацыі* крыніцы, г.зн. вызначаецца, якая частка звестак крыніцы і якім чынам можа быць выкарыстана ў гістарычным даследаванні. [2]

Аналіз пісьмовай крыніцы пачынаецца з вывучэння *тэкста*. Тэкстам называюць сістэматычна арганізаваную паслядоўнасць знакаў. Тэкстам можна назваць пісьмовы ці музычны твор, набор матэматычных формул, вусны аповед і г.д. *Першым этапам* працы з тэкстам з'яўляецца яго *прачытанне*. Звычайна яно ажыццяўляецца з дапамогай метадаў **палеаграфіі.** У працэсе прачытання тэкста даследчык ажыццяўляе першасную інтэрпрэтацыю тэкста, каб зразумець яго сэнс. *На другім этапе* даследчык *вывучае граматыку і лексіку тэкста*, выкарыстоўваючы дыялектычныя і тлумачальныя слоўнікі і даведнікі, параўноўвае тэкст са створанымі ў той жа час такімі ж крыніцамі. *На трэцім этапе* даследчык *вызначае,* якую *форму крыніцы* ён вывучае (*арыгінал, спіс, рэдакцыю*). Затым вызначаецца складаны характар тэкста (*інтэрпаляцыі, глосы, кантамінацыі, кампіляцыі*).

Існуюць выпадкі, калі аўтар недакладна перадае сэнс падзеі ў тэксце. Асабліва часта *недакладнасці (скажэнні)* сустракаюцца пры тыражыраванні тэкста. Найбольш складана выявіць скажэнні ў тэкстах, якія доўгі час існавалі толькі ў вуснай форме. Пры выяўленні недакладнасцяў важна выявіць ці былі гэтыя недакладнасці характэрны для арыгінала, ці яны ўзніклі пры тыражыраванні тэкста. Таксама павінны быць вызначаны памеры і прычыны скажэнняў. Войны, неспрыяльныя ўмовы захоўвання тэкстаў і інш. падзеі маглі стаць прычынамі поўнай ці частковай страты тэкста. Таму задачай даследчыка з'яўляецца *ўзнаўленне тэкста,* поўная ці частковая *рэканструкцыя крыніцы*.

[2] Гл.: Бандзелікаў М.Ф., с. 37 – 38.

Пачатковы этап працы – *вызначэнне памераў* страчанага *тэкста*. Гэта праца праводзіцца на падставе захаваўшыхся фрагментаў. Больш складаныя тыя выпадкі, калі даследчык не мае захаваных фрагментаў. Тады кожная з дапаможных дысцыплін, якія вывучаюць канкрэтныя крыніцы, выкарыстоўвае свае спецыфічныя метады. Аднак існуе і агульны падыход да праблемы, які заключаецца ў супастаўленні крыніцы і яе апісанняў у іншых крыніцах. Таксама часта выкарыстоўваецца *метад параўнання крыніц* роднаснага паходжання. Напрыклад, тэксты шмат якіх помнікаў узнаўляюцца з дапамогай фармуляра (пэўнай строгай паслядоўнасці частак тэкста). У найбольшай ступені гэты спосаб развіты ў *дыпламатыцы*. Цэлы шэраг падыходаў распрацаваны ў *тэксталогіі* – навуцы аб тэкстах. Задачай гэтай навукі з'яўляецца не толькі і не столькі ўдакладненне скажэнняў тэкста, колькі вызначэнне этапаў развіцця тэкста. [3]

Змены ў стыле, несупадзенне стыля тэкста зафіксаванаму перыяду яго стварэння, розніца ў стыле розных частак можа сведчыць аб падробцы крыніцы ці аб яе неаднародным складзе. На інтэрпаляцыі (устаўкі) ці пропускі тэкста могуць паказваць:

– недакладнасці выражэння думак у асобнай частцы крыніцы;

– вяртанне да прарванай аповедам іншага факта думцы, калі факт не звязаны з характарам тэкста;

– паўтор адной і той жа думкі ў розных выразах, які з'яўляецца нечаканым у аповедзе;

– раптоўнае перапыненне аповеда аб чым-небудзь і пераход да новага прадмета, што робіць уражанне недасказанасці.

Зразумела, што найбольш каштоўным для даследчыка з'яўляецца **арыгінал** – крыніца, напісаная рукой аўтара. Рукапісныя крыніцы ў працэсе тыражыравання часта перапісваліся. Крыніца, з якой перапісваўся тэкстназваецца **пратографам** (ад грэч. напісаны першым). Крыніца, якая ўзнікла ў выніку перапісвання называецца **спісам**. Калі тэкст перапісваўся не механічна, і ў яго ўносіліся змены ці дапаўненні, то гэта з'яўляецца **рэдакцыяй**. Рэдакцыі рабіліся па наступных прычынах: а) стылістычных, калі рэдактар змяняў стыль, граматыку тэкста, не змяняючы зместу; б) палітычным, калі рэдактар імкнуўся праславіць альбо прынізіць палітычнага дзеяча, партыю, краіну і г.д. (Напрыклад, другая рэдакцыя "Аповесці міну-

[3] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 36 – 37; Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 22 – 23.

лых гадоў” манаха Сільвестра 1116 г. праслаўляла новага кіеўскага князя (з 1113 г.) Уладзіміра Манамаха і яго бацьку Усевалада); в) рэлігійным, калі пасля з’яўлення новых рэлігій рэдагаваліся тэксты старажытных аўтараў (напрыклад, згодна адной з уніяцкіх рэдакцый жыцця Еўфрасінні Полацкай, яна памерла не ў Ерусаліме, а ў Рыме, у чым праявілася імкненне наблізіць святую да папскага прастолу).

У працэсе перапісвання крыніц накопліваліся аднатыпныя памылкі. Групу крыніц з аднатыпнымі механічнымі памылкамі называюць **ізводам**. Спісы аднаго ізвода ўзыходзяць да аднаго **пратографа**. Даследчык у працы з крыніцамі павінен таксама знайсці ў тэксце **кантамінацыі** – механічнае аб’яднанне розных частак пратографа перапісчыкам, **кампіляцыі** – устаўкі і дапаўненні ў тэксце, зробленыя перапісчыкам. Значную ролю адыгрываюць у тэксце **глосы** – прыпіскі на палях, якія паказваюць на тое, каму належала крыніца, хто яе чытаў ці перапісваў, тлумачаць незразумелыя словы.

Каб атрымаць з крыніцы максімум інфармацыі, даследчык павінен добра ўяўляць ***этапы стварэння дакументаў***. На першым этапе стварэння складаецца **чарнавік** – першапачатковы тэкст, у які аўтар можа ўнесці змены, дапаўненні. На другім этапе чарнавік перапісваўся і ствараўся **белавік** – гатовы дакумент, не завераны подпісамі і пячаткамі. Пасля завярэння дакумент ператвараўся ў **арыгінал**. Пры заключэнні дамоў, часам, адзін бок атрымліваў **рэверсальны дакумент**, на якім стаялі подпісы і пячаткі другога боку. Ён меў такую ж юрыдычную сілу, што і арыгінал. Калі патрабавалася некалькі экзэмпляраў дакумента, то з арыгінала рабіліся **копіі.** На іх пазначалася, што гэта копія (напрыклад, літарай “К”). У выпадку страты дакумента маглі стварацца **дублікаты** дакумента, яны мелі такую ж юрыдычную сілу, што і сам дакумент. У Вялікім княстве Літоўскім дакументы перапісваліся ў спецыяльныя ***актавыя кнігі*** (Кнігі метрыкі, актавыя кнігі судоў). Сустракаюцца ***акты-пераказы*** – якія каротка пераказвалі сутнасць (змест) арыгінала, і мелі юрыдычную моц у выпадку яго адсутнасці.[4]

**Рэканструкцыю тэкста** дследчык можа ажыццявіць на падставе захаваўшыхся спісаў і копій шляхам іх параўнання. Калі тэкст адноўлены

[4] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 38.

на падставе толькі аднаго спіса, то гэта *кан'ектура*. Датуль, пакуль не знойдзены іншыя спісы крыніцы, *кан'енктура* лічыцца недаказанай.[5]

**Вывучэнне паходжання тэксту.** Крыніца з'яўляецца феноменам культуры, яна ўзнікае ў канкрэтных умовах і па-за імі не можа быць зразумета ці інтэрпрэтавана. Яна ствараецца ў пэўнай гістарычнай рэчаіснасці і функцыянуе ў гэтай рэчаіснасці ў адпаведнасці з тымі ўмовамі, якія створаны. Дадзены этап даследавання мае мэтай:

1) вызначыць, ці меў месца гістарычны факт які апісвае крыніца ў сапраўднасці, ці створана крыніца у той час, тым аўтарам і ў тым месцы, што пазначаны ў ёй;

2) удакладніць, што прадстаўляла сабой гістарычная рэальнасць, у якой ўзнікла крыніца.

**Вызначэнне часу стварэння крыніцы.** Важным элементам працэса працы з гістарычнай крыніцай з'яўляецца вызначэнне часу яе стварэння. Дацiроўка крыніцы надзвычай патрэбна, бо па ёй можна высветліць, калі адбываліся падзеі, апісаныя ў крыніцы. Пры вызначэнні даты стварэння крыніцы трэба грунтоўна вывучыць усе магчымыя звесткі аб ёй. Гісторык павінен не толькі вызначыць час узнікнення крыніцы, але і вылучыць з крыніцы максімум часавай інфармацыі. Чым больш такіх звестак будзе, тым верагодней будзе дата, вызначаная на іх аснове. Важна таксама ведаць, адкуль аўтар атрымаў гэтыя звесткі, на якім этапе яны трапілі ў тэкст.

Інфармацыя аб часе стварэння крыніцы бывае ***прамой і ўскоснай***. **Прамая** інфармацыя адлюстроўвае рэальны гістарычны час праз тую сістэму ліку гадоў, якая выкарыстоўвалася аўтарам крыніцы. **Ускосная** інфармацыя аб часе – гэта звесткі аб падзеях, дацiроўка якіх можа быць карысна для дацiроўкі крыніцы. Таксама ў крыніцы можа змяшчацца наўмысная і ненаўмысная інфармацыя. **Ненаўмысная інфармацыя** – гэта тыя звесткі, якія аб'ектыўна адлюстроўваюць гістарычны час, але ў мінулым не выкарыстоўваліся як часавыя вехі. **Наўмысная інфармацыя** – гэта дадзеныя, якія разглядаліся аўтарамі як часавыя арыентыры. Прамую інфармацыю гісторык атрымоўвае ў якасці *абсалютных дат*. Іх вывучае дапаможная гістарычная дысцыпліна – **гістарычная храналогія.** Задачы храналогіі ў вывучэнні сістэм уліку часу ў гістарычным развіцці,

[5] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 24.

выпрацоўцы метадаў перакладу адной сістэмы ліку ў іншыя, пераклад дат у сучасную сістэму летазлічэння.[6]

Найбольш распаўсюджанай сістэмай летазлічэння значных прамежкаў часу быў каляндар, заснаваны на руху Сонца і Месяца. Вылучаюць сонечны, месяцовы, месяцова-сонечны каляндары. Назва “каляндар” паходзіць ад “*календы*” – назвы першага дня месяца ў Старажытным Рыме, калі даўжнік абавязаны быў плаціць працэнты. Першай адзінкай адліку часу, якую вылучылі людзі яшчэ ў старажытныя часы, былі *суткі*. Больш буйнай адзінкай уліку часу з’яўляецца *месяц*. Па фазах месяца быў вылучаны *сямідзённы тыдзень*. Неабходнасць сачыць за зменай пораў года прывяло да ўзнікнення *сонечнага года*. Зыходны момант летазлічэння называецца **эрай.** Напрыклад, грэкі прымянялі летазлічэнне ад першай Алімпіяды (з 776 г. да н.э.), рымляне – “ад заснавання Рыма” (з 753 г. да н.э.). Сярод яўрэяў і хрысціян выкарыстоўвалася летазлічэнне “ад стварэння свету”. Першым з распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі каляндароў быў **юліянскі** – які вядзе адлік з рэформы Юлія Цэзара (46 г. да н.э.). Канчатковы выгляд ён прыняў пры Актавіяне Аўгусце. За працягласць года прымалася 365 + ¼ сутак, адсюль тры гады па 365 сутак, а кожны чацвёрты год лічыўся 366 сутак. Год быў падзелены на 12 месяцаў. Сем месяцаў складаліся з 31 дня, чатыры з 30, адзін з 28 (ці 29 дзён). На Нікейскім саборы 325 г. юліянскі каляндар быў прыняты як абавязковы для ўсяго хрысціянскага свету. На гэтым жа саборы замацоўваўся **індыкт** – сістэма разліку гадоў, якая вызначала месца года ў 15-ці гадовым цыкле летазлічэння. Недахопам Юліянскага каляндара было тое, што за 128 гадоў накопліваўся адзін “няўлічаны” дзень з-за розніцы паміж каляндарным і рэальным сонечным годам. Гэта прывяло ў XVI ст. да з’яўлення “розніцы” у 10 дзён паміж каляндарным і сонечным днямі сонцастаяння, што было вельмі істотным пры падліку рэлігійных святаў. Таму рымскі папа Рыгор XIII, узяўшы за аснову разлікі матэматыка Луіджы дэ Ліліо, перасунуў каляндар на 10 “страчаных” дзён з 5 на 15 кастрычніка 1582 г.

На тэрыторыі Беларусі сістэма летазлічэння ***“ад Нараджэння Хрыстова”*** сустракаецца ў дамове Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 г., затым у дамове полацкага князя Гердзеня 1263 г. з Лівонскім Ордэнам і Рыгай. Яе далейшае выкарыстанне было звязана з узмацненнем каталіцтва на землях Беларусі пасля Крэўскай уніі 1385 г.

[6] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 39 – 40.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай Імперыі ў канцы XVIII ст. афіцыйным зноў зрабіўся юліянскі каляндар, а католікі выкарыстоўвалі *грыгарыянскі*. Дэкрэтам Саўнаркама РСФСР ад 31 студзеня 1918 г. канчаткова быў уведзены грыгарыянскі каляндар і наступным днём лічыўся 14 лютага 1918 г., аднак, праваслаўная царква да гэтага часу карыстаецца *юліянскім* каляндаром.[7]

Трэба ўлічваць, што па-рознаму адлічваўся ў розных краінах і пачатак года. У Візантыі год пачынаўся з 1 верасня. Усходнеславянскія народы, якія прынялі хрысціянства з Візантыі, сталі выкарыстоўваць адлік гадоў ад стварэння свету, аднак, захавалі свой адлік года з 1 сакавіка (па-руску "март," адсюль назва – "мартаўскі год"). З'яўляюцца два спосабы вылічэння гадоў – "мартаўскі" (які пачынаўся шэсць месяцаў пазней візантыйскага года) і "ультрамартаўскі" (пачынаўся на шэсць месяцаў раней вераснёўскага года). Ультрамартаўскія даціроўкі з'яўляюцца з XII ст. (Лаўрэнцьеўкі летапіс), беручы звесткі з візантыйскіх летапісаў, усходнеславянскія летапісцы не заўсёды ўлічвалі разыходжанне ў шэсць месяцаў. Даследчыку пры датаванні падзей гэта важна ўлічваць. Агульна прынятым адрозненнем сістэм ад Стварэння свету і Нараджэння Хрыстова лічыцца 5508 гадоў. З улікам пачатку года гэта можа быць для розных месяцаў:

1. "Вераснёўскі" год: 5508 для датаў з 1 студзеня да 31 жніўня, з 1 верасня да 31 снежня – 5509.
2. "Мартаўскі" год: 5507 з 1 студзеня да 28 (29) лютага і 5508 з 1 сакавіка да 31 снежня.
3. "Ультрамартаўскі" год: 5508 з 1 студзеня да 28 (29) лютага і 5508 з 1 сакавіка да 31 снежня.

Трэба таксама памятаць, што вылучэнне *прамой часавай інфармацыі* – складаная праблема, і такую інфармацыю неабходна падцвярджаць пры дапамозе *ўскосных дадзеных*.[8]

**Прамая даціроўка** можа прадстаўляцца ў апавядальных крыніцах у выглядзе прыпісак (напрыклад, у летапісах – прыпіска ігумена Сільвестра аб напісанні ім "Аповесці мінулых гадоў" у 1116 г., ці манаха Лаўрэнція аб напісанні ім Лаўрэнцьеўскага летапісу ў 1377 г.). У дакументах існуе спецыяльная формула – **датум**, дзе фіксуецца час стварэння дакумента. Напрыклад, абласны прывілей вялікага князя Аляксандра Віцебску "*Писан у*

---

[7] Гл.: Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 25.
[8] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 40 – 42.

*Вильни, в лето 7011, месяца июля в 16-й день индикта 6”*, г.зн. 16 ліпеня 1503 года. Пры аналізе прамой інфармацыі неабходна ўлічваць паказанне на індыкт і год, каб паміж імі не было разыходжанняў. Лічбы ў дакументах, часам, пісаліся па старадаўняй традыцыі ў выглядзе літар славянскага алфавіта. Напрыклад, такі выпадак сустракаецца ў дамове полацкага князя Гердзеня з Лівонскім Ордэнам і Рыгай. Часам, даціроўка прывязвалася да нейкага рэлігійнага свята. Напрыклад, дамова князя Скіргайлы з Лівонскім магістрам Робінам фон Эльтцам была датавана *“у трэці дзень пасля васьмі гадзін святых апосталаў Пятра і Паўла.”* Свята Пятра і Паўла прыходзілася ў 1387 г. на 6 ліпеня, а *“трэці дзень”* – на 9 ліпеня 1387 г. На падставе **ўскоснай інфармацыі** можна ўдакладніць даціроўку крыніцы. Напрыклад, у “Слове аб паходзе Ігаравым” узгадваецца галіцкі князь Яраслаў Асмамысл як жывы, у 1187 г. ён памірае, таму твор не можа быць датаваны пазней 1187 г.[9]

**Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.** Лакалізацыя – гэта устанаўленне месца стварэння крыніцы. Устанаўленнем месца знаходжання геаграфічных аб’ектаў мінулага займаецца спецыяльная гістарычная дысцыпліна – ***гістарычная геаграфія***. На падставе аналіза звестак пісьмовых крыніц і археалагічных знаходак ствараюцца *гістарычныя мапы*. Напрыклад на гістарычных мапах XI – XIII стст. ёсць горад Друцк, які зараз не існуе. Такія мапы дапамагаюць удакладніць месца стварэння крыніцы.

Пры лакалізацыі крыніц значную ролю маюць дадзеныя тапанімікі – спецыяльнай гістарычнай навукі аб паходжанні назваў геаграфічных аб’ектаў.

Лакалізаваць крыніцу можна пры дапамозе дадзеных гістарычнай лінгвістыкі, выкарыстоўваючы дыялектычныя асаблівасці тэкста. Напрыклад, дадзеныя лінгвістыкі дапамаглі высветліць, што для мовы “Праўды Яраслава” характэрны выразы Наўгародскай зямлі, а вось “Праўда Яраслававічаў” напісана ў раёне Кіева і Чарнігава. [10]

Усё ж для пазначэння месца стварэння крыніцы спачатку аналізуюць ***прамую інфармацыю*** (назву населеных пунктаў, адміністрацыйных адзінак, дзяржаў і г.д.). У апавядальных крыніцах (летапісах, мемуарах і г.д.) месца стварэння часта пазначалася ў ***глосах.*** (*Увага! Звярніцеся да **модуля 5** і ўзгадайце, што такое **глосы**).* У дакументальных крыніцах месца ства-

[9] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 26.
[10] Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 27.

рэння пазначалася ў **датуме**. Напрыклад, жалованы ліст княгіні Ульяны 4 ліпеня 1461 г. "*Писан во Мстиславли*". На другім этапе лакалізацыі вывучаецца ***ўскосная інфармацыя*** аб месцы стварэння крыніцы. Гэта *знешнія прыкметы* – асаблівасці почырка, пячаткі, вадзяныя знакі, матэрыял пераплёта, а таксама ўнутраныя прыкметы – дадзеныя тапанімікі, дыялектныя словы, назвы адзінак вымярэння, пасады, тытулы асоб, што ўзгадваюцца ў крыніцы і г.д. **Сінтэз** звестак аб часе стварэння крыніцы складаецца з *параўнання прамой і ўскоснай інфармацыі* і вызначэнні дакладнага месца стварэння крыніцы.

**Атрыбуцыя.** Спецыфіка гуманітарнага пазнання заключаецца ў тым, што ў "працэсе крыніцазнаўчага аналіза сустракаюцца дзве індывідуальнасці – творцы і даследчыка", – казаў М. М. Бахцін. Таму надзвычай важна для крыніцазнаўства вызначэнне аўтарства крыніцы (атрыбуцыя). **Атрыбуцыя** вырашае дзве задачы:

1) вызначае, ці належыць дадзеная крыніца таму аўтару, які пазначаны ў ёй;

2) удакладняе фактары, што паўплывалі на ступень супадзення інфармацыі крыніцы рэальным фактам гістарычнай рэчаіснасці; вызначае формы і метады інтэрпрэтацыі крыніцы.

Для вызначэння асобы аўтара выкарыстоўваюцца дадзеныя генеалогіі. Часта сустракаюцца выпадкі, калі некалькі чалавек насілі аднолькавыя імёны, прозвішчы, тады і выкарыстоўваюцца генеалагічныя табліцы. На другім этапе атрыбуцыі аналізуецца ўскосная інфармацыя аб аўтары. У яе ўваходзяць: тытул, пасада, мянушка, сацыяльны статус, інфармацыя аб месцы нараджэння аўтара, яго веды аб мясцовасці, якую ён апісвае.

Важным з'яўляецца аналіз аўтарскага стыля – паслядоўнасці слоў у сказе, выкарыстанне аўтарам асобных выразаў, слоў. Для атрыбуцыі ананімных твораў вельмі істотны фармальныя асаблівасці стыля. Для апрацоўкі стылістычных асаблівасцяў могуць быць выкарыстаны камп'ютэрныя метады. Стыль ананімнага аўтара звычайна параўноўваецца са стылем сучаснікаў, такім чынам можа быць вызначана асоба, што напісала твор. [11]

**Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.** Інфармацыя аб мінулым не адлюстроўваецца ў крыніцы дакладна, можа адрозніваецца ад рэчаіснасці. Яе адлюстраванне залежыць ад культурных традыцый эпохі, пазіцыі аўтара, прыналежнасці аўтара да той ці іншай сацыяльнай групы і г.д.

---

[11] Там жа, с. 28.

Асноўная задача інтэрпрэтацыі крыніцы – вызначыць з улікам часавай, культурнай дыстанцыі сэнс, які аўтар уносіў у твор. На этапе інтэрпрэтацыі даследчык як бы “рухаецца” ў плыні свядомасці аўтара крыніцы, імкнецца зразумець сутнасць падзей і пазіцыю аўтара адносна іх. Гэта не проста граматычнае прачытанне тэкста, гэта тлумачэнне тэкста. Тлумачэннем тэкста займаецца спецыяльная навука – **герменеўтыка.** Задачай якой з’яўляецца вытлумачэнне крыніцы як з’явы культуры. Па-рознаму разумелі герменеўтыку прадстаўнікі розных школ крыніцазнаўства.[12]

Даследчык Ф. Шлеермахер падзяляў герменеўтыку (мастацтва правільнага разумення тэкста ў граматычным і псіхалагічным разуменні) і крытыку (крытычнае разуменне пытанняў сапраўднасці крыніцы) і выявіў іх узаемасувязь. У Ш. Ланглуа і Ш. Сеньябоса разглядаліся такія паняцці як крытытка паходжання крыніцы, унутраная крытыка і крытыка разумення (герменеўтыка), што выключала магчымасць дакладнага падзелу гэтых паняццяў і даследчых працэдур крытыкі і інтэрпрэтацыі крыніц. Даследчык Л. Мару разумеў герменеўтыку як сродак пераадолення культурна-гістарычнай дыстанцыі, дыстанцыі паміж свядомасцю людзей мінулага і сучасным даследчыкам.

Вучэнне аб гістарычнай інтэрпрэтацыі крыніц сістэматызаваў і лагічна абгрунтаваў, а таксама выклаў у кнізе “Метадалогія гісторыі” ***А. С. Лапа-Данілеўскі***. Ён звярнуў увагу на тое, што праблема інтэрпрэтацыі ў сучаснай яму літаратуры асвятлялася не дакладна. Напрыклад, Ш. Ланглуа і Ш. Сеньябос не размяжоўвалі задачы ўнутранай крытыкі крыніцы і задачы яе інтэрпрэтацыі. А. С. Лапа-Данілеўскі надае інтэрпрэтацыі крыніцы прынцыповае значэнне. Ён лічыць, што “толькі ставячы самастойныя задачы інтэрпрэтацыі гісторык можа дасягнуць благанадзейнасці сваіх высноў..., бо інтэрпрэтацыя дае магчымасць увайсці ў светаўспрыманне аўтара”. А. С. Лапа-Данілеўскі вылучае прынцыпы інтэрпрэтацыі: прынцып *псіхалагічнага тлумачэння* чужой свядомасці, прынцып *псіхалагічнай інтэрпрэтацыі* сімвала ці вобраза. Таксама даследчык вылучае метады інтэрпрэтацыі: *тэхнічны метад* (дае ўяўленне аб сэнсе і прызначэнні крыніцы), *тыпізіруючы метад* (суаднясенне крыніцы з адпаведным тыпам культуры), *індывідуалізуючы метад* (раскрывае індывідуальныя асаблівасці аўтара).[13]

---

[12] Гл.: Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 47.
[13] Гл.: Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособие, с. 138 – 139.

Пры тлумачэнні крыніцы важна ўлічваць гістарызмы, архаізмы, аўтарскія выразы. Даследчык вымушаны звяртацца да спецыяльных слоўнікаў, рабіць аналіз тэрмінаў, якія сустракаюцца ў крыніцах. Пры працы з заканадаўчымі крыніцамі, напрыклад, даследчык-гісторык звяртаецца да юрыдычнай тэрміналогіі. Спецыфікай інтэрпрэтацыі актаў з'яўляецца тое, што даследчык павінен ведаць склад актавага фармуляра. Вывучэннем актаў займаецца спецыяльная дысцыпліна – **дыпламатыка** *(гл. кн. Каштанава С. М. Руская дыпламатыка: вучэбны дапаможнік для вузаў па спецыяльнасці "Гісторыя". – М., 1988.).* Пры тлумачэнні апавядальных крыніц даследчык можа сустрэць іншасказанні, алегорыі. У такім выпадку ён павінен не толькі іх зразумець, але і растлумачыць. Пры тлумачэнні крыніц важнае значэнне мае веданне канкрэтных гістарычных абставін, у якіх пісаўся тэкст.

**Асаблівасці вывучэння рэчавых крыніц.** Методыка працы з рэчавымі крыніцамі адрозніваецца ад працы з крыніцамі пісьмовымі. Рэчавымі крыніцамі займаецца археалогія, музеязнаўства і інш. гістарычныя дысцыпліны.

**Выяўленне падробных крыніц.** Несупадзенне прамой і ўскоснай інфармацыі крыніцы аб часе яе стварэння, месцы стварэння, аўтарстве – гэта паказчык магчымай **падробкі крыніцы**. Падробкі – крыніцы, якія з'явіліся ў больш позні час, чым пазначана ў крыніцы, яны прыпісваюцца аўтарам больш ранняй эпохі. Часам, сапраўдныя крыніцы скажаліся шляхам іх скарачэння, выпраўлення, унясення больш позніх дадаткаў.

***Прычыны вырабу падробак:***

1) меркантыльныя імкненні аўтара (імкненне атрымаць грошы за "старажытны рукапіс");

2) ідэалагічныя меркаванні (імкненне даказаць "старажытнасць" сваіх ідэй, пазіцый і г.д.);

3) амбіцыі даследчыка (імкненне падцвердзіць сваю гіпотэзу "старажытным" дакументам);

4) амбіцыі калекцыянера (жаданне мець у калекцыі "старажытны дакумент").[14]

У гісторыі вядома шмат выпадкаў знакамітых падробак. Напрыклад, у 1765 г. шатландзец Джэймс Макферсан апублікаваў складзеныя ім самім у сентыментальным стылі "Песні Асіяна", якія прыпісваліся кельцкаму

[14] Гл.: Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 29.

барду III ст. Асіяну, у песнях былі выкарыстаны сюжэты, вобразы, імёны, якія сапраўды сустракаліся ў кельцкіх легендах. У “Песнях” прапагандавалася старажытнасць, самастойнасць і свабодалюбівасць продкаў шатланцаў.[15]

**Вывучэнне інфармацыі гістарычнай крыніцы.** Пасля ажыццяўлення працэдуры праверкі сапраўднасці крыніцы трэба правесці ***ўнутраную крытыку крыніцы.*** Мэта ўнутранай крытыкі – выявіць ступень суаднясення інфармацыі крыніцы тым падзеям, якія ў ёй апісваюцца. Задачамі ўнутранай крытыкі крыніцы з’яўляюцца: *вызначэнне сапраўднасці крыніцы, яе паўнаты, дакладнасці.*

**Сапраўднасць інфармацыі** – гэта ступень суаднясення яе з гістарычным фактам, які гэтая інфармацыя апісвае. *Увага! Звярніцеся да **модуля 1** і ўзгадайце, што такое “гістарычны факт”*. Ступень сапраўднасці вызначаецца паўнатой і дакладнасцю інфармацыі крыніцы. *Паўната* – гэта якасная характарыстыка, якая адлюстроўвае ў крыніцы рысы, найбольш істотныя для гістарычнага працэса ці з’явы. Колькаснай характарыстыкай з’яўяецца *дакладнасць інфармацыі крыніцы* – ступень перадачы асобных дэталяў падзей. На паўнату і дакладнасць уплываюць наступныя фактары:

1) аўтар быў сведкам падзей ці ведае аб іх з якіхсьці апісанняў;

2) час складання крыніцы (адразу пасля падзей, ці прайшоў прамежак часу);

3) індывідуальныя асаблівасці аўтара;

4) псіхалогія сацыяльнай групы, да якой належыў аўтар крыніцы;

5) жанр ці форма крыніцы.[16]

Апошнім этапам працы з гістарычнымі крыніцамі з’яўляецца – сінтэз гістарычнай інфармацыі аб крыніцы. Сінтэз – завяршальны этап вывучэння твора, які разглядаецца ў якасці гістарычнай крыніцы. На гэтым этапе ствараецца магчымасць абагуліць вынікі аналіза асобных бакоў твора, асобных комплексаў сацыяльнай інфармацыі, атрыманай пры аналізе яго зместа. Таксама на гэтым этапе даследчык параўноўвае дадзеныя розных крыніц аб гістарычных фактах, мадэлюе гістарычную сітуацыю.[17] Пры гэтым ён вызначае ступень рэпрэзентатыўнасці разглядаемай крыніцы (гл. модуль 1), яе навуковую каштоўнасць для дадзенага гістарычнага даследавання.

---

[15] Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С.Н., с. 49.
[16] Гл.: Каун С.Б., Липницкая О.Л., Ходин С.Н., с. 30.
[17] Там жа, с. 31.

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Асноўныя этапы гістарычнай крытыкі.
2. Этапы стварэння дакументаў.
3. Рэканструкцыя тэкстаў.
4. Вывучэнне паходжання тэксту.
5. Аналіз і сінтэз непасрэднай і ўскоснай інфармацыі аб часе стварэння крыніцы.
6. Методыка лакалізацыі ўзнікнення крыніц.
7. Атрыбуцыя.
8. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.
9. Паняцце сінтэзу інфармацыі крыніцы.

### Тэмы рэфератаў:

1. Прынцыпы крытыкі крыніц у працах А. С. Лапа-Данілеўскага.
2. “Влесава кніга” – падробка ці сапраўдная крыніца?
3. Гісторыя развіцця дыпламатыкі.
4. Прынцыпы крытыкі крыніц у працах Ш. Ланглуа і Ш. Сеньябоса.
5. Выкарыстанне прыёмаў крытыкі крыніц на прыкладзе “Слова аб паходзе Ігаравым.”
6. Выкарыстанне прыёмаў крытыкі крыніц на прыкладзе “Аповесці мінулых гадоў.”

## Кантрольныя заданні да практычнага занятка “Гістарычная крытыка крыніц”

### Заданне 1

**Суаднясіце паняцце і яго азначэнне:**

| | |
|---|---|
| **1. Ізвод** | а) прыпіскі на палях, якія паказваюць на тое, каму належала крыніца, хто яе чытаў ці перапісваў, тлумачаць незразумелыя словы. |
| **2. Пратограф** | б) ўстаўкі і дапаўненні ў тэксце, зробленыя перапісчыкам. |

| | |
|---|---|
| **3. Кантамінацыі** | в) бліжэйшы па тэксце арыгінал аднаго ці некалькіх спісаў крыніцы. |
| **4. Глосы** | г) група крыніц з аднатыпнымі механічнымі памылкамі. |
| **5. Кампіляцыі** | д) механічнае аб’яднанне розных частак пратографа перапісчыкам. |

**Заданне 2**

**Суаднясіце паняцце і яго азначэнне:**

| | |
|---|---|
| 1. **Эра – гэта** | а) разлік колькасці дзён у годзе ў адпаведнасці з абарачэннем Зямлі вакол Сонца ці Месяца вакол Зямлі.<br>б) звязаная з важнай палітычнай ці культурнай падзеяй кропка адліку, ад якой адлічваюцца гады. |
| 2. **Індыкт – гэта** | в) дзень, з якога пачынаўся год.<br>г) перыяд гісторыі, звязаны са значнымі палітычнымі ці культурнымі падзеямі. |
| 3. **Каляндар – гэта** | д) цыкл у 15 гадоў, разлічаны па сонечнаму каляндару. |

**Заданне 3**

**Пастаўце ў правільнай паслядоўнасці этапы працы даследчыка з гістарычным тэкстам:**

1. Вывучэнне граматыкі і лексікі тэкста.
2. Вызначэнне формы крыніцы (арыгінал, рэдакцыя, спіс).
3. Прачытанне.
4. Узнаўленне (рэканструкцыя) тэкста.
5. Вызначэнне складанага характара тэкста.
6. Вызначаны памераў і прычын скажэнняў тэкста.
7. Параўнанне тэкста з іншымі падобнымі.
8. Сінтэз інфармацыі, атрыманай з тэкста.
9.________________________________

*Калі якісь з этапаў прапушчаны, то дадайце самі.*

**Заданне 4**

Растлумачце, чым рэверсальны дакумент адрозніваецца ад дубліката?

**Заданне 5**

**Калі пачынаўся год ва ўсходніх славян у XI – XIV стст.?**

а) 1 снежня;

б) 1 верасня;

в) 1 мая;

г) 1 сакавіка;

д) 1 студзеня.

**Заданне 6**

**Суаднясіце паняцці і іх тлумачэнні:**

| | |
|---|---|
| **1. Прамая інфармацыя** | а) звесткі аб падзеях, даціроўка якіх можа быць карысна для даціроўкі крыніцы. |
| **2. Ненаўмысная інфармацыя** | б) дадзеныя, якія разглядаліся аўтарамі як часавыя арыентыры. |
| **3. Наўмысная інфармацыя** | в) звесткі, якія аб'ектыўна адлюстроўваюць гістарычны час, але ў мінулым не выкарыстоўваліся як часавыя вехі. |
| **4. Ускосная інфармацыя** | г) адлюстроўвае рэальны гістарычны час праз тую сістэму ліку гадоў, якая выкарыстоўвалася аўтарам крыніцы. |

**Заданне 7**

Колькі склала розніца паміж летазлічэннем "ад стварэння свету" і "ад Нараджэння Хрыстова" па канстанцінопальскаму стылю?

а) 5500 год;

б) 622 гады;

в) 776 год;

г) 5508 год;

д) 753 гады.

**Заданне 8**

**Што такое кан'ектура?**

а) параўнанне аднаго ці некалькіх тэкстаў;

б) навуковая праверка дакладнасці тэкста, яго сапраўднасці і праўдзівасці;

в) аднаўленне страчанага тэкста па ўскосных прыкметах;

г) выпраўленне дэфектаў тэкста на падставе абгрунтаваных здагадак.

**Заданне 9**

**Растлумачце розніцу паміж:**

а) белавіком і арыгіналам;

б) дублікатам і копіяй;

в) хронікай і летапісам;

г) спісам і пратографам.

**Заданне 10**

**Якая даследчая працэдура ў вызначэнні часа стварэння крыніцы складаецца з параўнання прамой і ўскоснай інфармацыі?**

а) атрыбуцыя;

б) інтэрпрэтацыя;

в) сінтэз;

г) унутраная крытыка крыніцы

**Рэкамендаваная па модулю літаратура:**


1. Бережков, Н. Г. Хронология русского летоисчисления // Проблемы источниковедения. – Вып. 6. – М., 1958.

2. Берков, П. Н. Введение в технику литературоведческого исследования. Источниковедение. Библиография. Разыскания / П. Н. Берков. – Л., 1955.

3. Бикерман, Э. Хронология древнего мира / Э. Бикерман. – М., 1975.

4. Борисенков, Е. П., Пасецкий, В. М. Экстремальные явления в русских летописях XI – XVII вв. / Е. П. Борисенков, В. М. Пасецкий. – Л., 1983.

5. Виноградов, В. В. Проблемы авторства и теория стилей / В. В. Виноградов. – М., 1961.

6. Горбачевский, Н. Краткия таблицы, необходимые для истории, хронологии, вообще для всякого рода археологических исследований / Н. Горбачевский. – Вильна, 1867.

7. Ермолаев, И. П. Историческая хронология / И. П. Ермолаев. – Казань, 1980.

8. Ефременков, Э. Л. Раскрытие авторства на основе анализа идейного содержания произведений // Вопр. текстологии. – Вып. 2. – М., 1960.

9. Жучкевич, В. А. Общая топонимика / В. А. Жучкевич. – Мн., 1980.

10. Жучкевич, В. А. Топонимика Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Мн., 1968.

11. Каменцева, Е. И. Хронология / Е. И. Каменцева. – М., 1982.

12. Климишин, И. А. Календарь и хронология / И. А. Климишин. – М., 1985.

13. Историческая география СССР // И. Д. Ковальченко и др. – М., 1973.

14. Лихачев, Д. С. Вопросы атрибуции произведений древнерусской литературы // Тр. Отдела древнерусской литературы АН СССР. Ин-т литературы. – М.; – Л., Т. 17, 1961.

15. Лихачев, Д. С. Текстология / Д. С. Лихачев. – М., 1983.

16. Максаковский, В. П. Историческая география мира / В. П. Максаковский. – М., 1997.

17. Нечкина, М. В. Кто автор «Записок» Н. И. Горбачевского? // Ист. зап. Т. 54. – М., 1955

18. Носовский, Г. В., Фоменко, А. Г. Новая хронология и концепция древней истории Руси, Англии, Рима. Факты, гипотезы / Г. В. Носовский, А. Г. Фоменко. Т. 1. Русь. – М., 1995.

19. О принципах определения авторства в связи с общими проблемами теории и истории литературы. – Л., 1960.

20. От Нестора до Фонвизина: Новые методы определения авторства / под ред. Л. В. Милова. –М., 1994.

21. Пиотровский, Р. Г. Анонимные произведения и их авторы / Р. Г. Пиотровский. – Мн., 1988. (Предисловие).

22. Пронштейн, А. П., Кияшко, В. Я. Хронология / А. П. Пронштейн, В. Я. Кияшко. –М., 1981.

23. Рейсер, С. А. Основы текстологии / С. А. Рейсер. – Л., 1978.

24. Рыбаков, Б. А. Петр Бориславич: Поиск автора «Слова о полку Игореве» / Б. А. Рыбаков. – М., 1997.

25. Рылюк, Г. Я. Истоки географических названий Беларуси (с основами общей топонимики) / Г. Я. Рылюк. – Мн., 1997.

26. Святский, Д. О. Астрономические явления в русских летописях с научно-критической точки зрения / Д. О. Святский. – Пг., 1915.

27. Статистика текста. – Мн., 1969.

28. Хавский, П. В. Взгляд на хронологию еврейскую, христианскую вообще и русскую в особенности / П. В. Хавский. – СПб., 1849.

29. Ходзін, С. М. Летапісанне на Беларусі // Бел. гіст. часоп. – 1997. – № 2. – С. 81 – 82.

30. Хронология Российской истории: энцикл. справ. – М., 1994.

32. Черепнин, Л. В. Повесть временных лет, ее редакции и предшествующие ей летописные своды // Исторические записки. – М., Т. 25 – 27, 1948.

33. Черепнин, Л. В. Русская хронология / Л. В. Черепнин. – М., 1944.

34. Шахматов, А. А. Обозрение русских летописных сводов XIV – XVI вв. / А. А. Шахматов. – М., 1972.

# МОДУЛЬ 8
# АСНОЎНЫЯ МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ КРЫНІЦ

**Змест праграмы:**

**Агульная характарыстыка метадаў даследавання гістарычных крыніц.** Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А. С. Лапо-Данілеўскага і І. Д. Кавальчанка. Выкарыстанне агульнанавуковых метадаў у крыніцазнаўстве. Аналіз, сінтэз, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага, метад класавага аналізу, індукцыя, дэдукцыя.

**Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц** – гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны.

**Інавацыйныя метады даследавання крыніц.** Неабходнасць у павышэнні інфарматыўнасці крыніц. Крыніца ў свеце тэорыі інфармацыі. Выкарыстанне ў крыніцазнаўстве колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій. Масавыя крыніцы і метады іх апрацоўкі.

**Магчымасці і абмежаванні выкарыстання колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц.** Мадэляванне аўтарскага стылю і вызначэнне складанага характару тэксту крыніцы. Інфармацыйны пошук лакун, купюр, інкарпарацый, экстрапаляцый і пазнейшых уставак.

**Метады семіётыкі пры вывучэнні гістарычных крыніц.** Знакі і сімвалы як аб'екты вывучэння семіётыкі. Даследаванне культурных кодаў і камунікатыўных сістэм навукоўца-гісторыка і аўтараў крыніц. Вызначэнне дыскурсаў у тэкстах крыніц. Выкарыстанне метаду дэканструкцыі.

**Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц.** Выкарыстанне дасягненняў гістарычнай псіхалогіі і псіхагісторыі ў даследаванні крыніц.

## Вучэбны матэрыял

**Метадалогія** – вучэнне аб навуковым метадзе пазнання, метадалагічнай рэфлексіі, бачанні гістарычнай рэальнасці, што падлягае вывучэнню.[1] *Для больш падрабязнага разгляду звярніцеся да* ***модуля 1***. Вывучэнне крыніцазнаўства немагчыма без разумення яго метадалогіі. Пастаноўка пытання аб метадалогіі крыніцазнаўства як сістэме прынцыпаў і метадаў працы з крыніцамі вызначыла ў свой час развіццё гэтай вобласці як навукі. Упершыню такое пытанне паставіў вучоны А. С. Лапо-Данілеўскі ў кнізе "Метадалогія гісторыі".

[1] Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентовю, с. 209.

А. С. Лапо-Данілеўскі (1863 – 1918) – вучоны, прафесар, акадэмік, аўтар шматлікіх прац па праблемах грамадства, дзяржавы, права і навуковай думкі Расіі, кіраўнік міжнародных праграм у вобласці гуманітарных ведаў. Ён з'яўляўся членам Міжнароднага сацыялагічнага інстытута, Міжнароднай асацыяцыі акадэмій, сакратаром з'езда яе прадстаўнікоў у Пецярбургу (1913 г.), удзельнікам міжнародных кангрэсаў гісторыкаў, адным з арганізатараў таварыства М. Кавалеўскага ў Расіі (1916 г.). У 1899 г. А. С. Лапо-Данілеўскі быў абраны ў Акадэмію навук, з 1902 г. – стаў экстраардынарным, а з 1905 г. – ардынарным акадэмікам. Да 1905 г. А. С. Лапа-Данілеўскі выкладаў на кафедры рускай гісторыі Гісторыка-філалагічнага інстытута ў Пецярбургу. Ён чытаў курсы: “Гісторыя саслоўяў у Расіі XVIII ст.”, “Грамадскі строй Маскоўскай дзяржавы да эпохі пераўтварэнняў”, курс рускай гістарыяграфіі, курс па гісторыі сацыяльных і гістарычных навук, курс метадалогіі гісторыі. Таксама даследчык займаўся пытаннямі рускай дыпламатыкі. У 1920 г. пасля яго смерці выйшла кніга “Нарыс рускай дыпламатыкі прыватных актаў”.[2] Найбольш значнай яго працай з'яўляецца “Метадалогія гісторыі”.

Канцэпцыя метадалогіі крыніцазнаўства А. С. Лапо-Данілеўскага – гэта новая парадыгма, якая абгрунтавала вучэнне аб гістарычнай крыніцы. Ён з'яўляўся распрацоўшчыкам метадалогіі крыніцазнаўства. Вучоны ўпершыню паставіў пытанне аб метадалогіі крыніцазнаўства як сістэматычным вучэнні. Ён супрацьпаставіў сваё разуменне метадаў вучэнню аб метадах толькі як аб тэхнічных прыёмах і пазітывісцкаму ўяўленню аб метадах як аб падрыхтоўчай частцы гістарычнага даследавання. Ён лічыў неабходным выкарыстанне гістарычнага сінтэза і абагульнення як неад'емнай часткі метадалогіі даследавання. А. С. Лапо-Данілеўскі адкрывае новы этап у фарміраванні крыніцазнаўства як цэласнай навукі аб крыніцах. У кнізе “Метадалогія гісторыі” даследчык разглядае тэарэтычна-пазнаваўчую ролю адзінай навукі – гісторыі як навукі аб чалавеку. Асновай яго канцэпцыі з'яўляецца вучэнне аб свядомай, актыўнай асобе творцы гістарычнай крыніцы і аб асобе даследчыка. Ідэю аб творчай асобе, якая ўздзейнічае на прыроднае асяроддзе А. С. Лапо-Данілеўскі пераняў з вучэння Вернадскага аб разумнай чалавечай дзейнасці, якая пераўтварае сусвет. Важнейшым пастулатам парадыгмы А. С. Лапо-Данілеўскага з'яўляецца сцвярджэнне аб аб'ектыўнасці гуманітарных ведаў. Даследчык крытыкуе інтуітывізм у пазнанні, сцвярджае прынцыпы строгай навуковасці. Ён даказвае неабходнасць выкарыстання прынцыпаў сістэмнасці,

[2] Приймак, Н.И. История Санкт-Петарурга в научном наследии А.С. Лаппо-Данилевского //Историография и источниковедение отечественной истории: сб. научн. статей и сообщений. – СПб., 2001, с. 144.

лагічнасці, навуковасці. Чалавецтва разглядаецца А. С. Лапо-Данілеўскім як цэласнасць у часе і прасторы. Аднак, ён не разглядае чалавецтва як нейкі адзіны арганізм (як О. Конт). Зыходным прынцыпам пазнання для даследчыка з'яўляецца пазнанне "чужоў адухаўлённасці". Чалавек як асоба, з пункту гледжання А. С. Лапо-Данілеўскага, разглядаецца як творца. Праз творы адбываецца камунікацыя іх аўтара і даследчыка. Даследчык павінен, перш за ўсё, зразумець, адчуць аўтара. Менавіта на гэтае пазнанне і павінны быць скіраваны ўсе метады гістарычнага даследавання на думку А. С. Лапо-Данілеўскага.[3]

Спадчына А. С. Лапо-Данілеўскага ў галіне метадалогіі крыніцазнаўства з'яўляецца актуальнай і сёння. Нават у перыяд негатыўных адносінаў да набыткаў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі ў галіне метадалогіі (напрыклад, у 40 – 50 гг. XX ст.) школа А. С. Лапо-Данілеўскага працягвала праяўляцца ў метадах даследавання, публікацыях крыніц, выкладанні крыніцазнаўства.

Значны ўнёсак у выкарыстанне колькасных метадаў у гістарычным даследаванні зрабіў І. Д. Кавальчанка. Ён адным з першых пачаў выкарыстоўваць ЭВМ для апрацоўкі гістарычнага матэрыяла.

І. Д. Кавальчанка (1923 – 1995) – заснавальнік Камісіі па выкарыстанні матэматычных метадаў і ЭВМ у гістарычных даследаваннях пры Акадэміі навук, член-карэспандэнт, а з 1987 г. – сапраўдны член Акадэміі навук СССР, член прэзідыума Акадэміі, старшыня Навуковага савета па гістарыяграфіі і крыніцазнаўству пры Аддзяленні гісторыі Акадэміі навук. Педагагічная дзейнасць І. Д. Кавальчанка пачалася з 1955 г. на гістарычным факультэце МДУ. У 1966 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю "Рускае прыгоннае сялянства ў першай палове XIX ст.", пры яе падрыхтоўцы адным з першых сярод савецкіх гісторыкаў выкарыстаў магчымасці ЭВМ.[4] І. Д. Кавальчанка абгрунтаваў паняцце **"масавая крыніца"** з пазіцый ***вучэння аб інфармацыі***. Ён зыходзіў з таго, што *інфармацыйныя працэсы з'яўляюцца часткай грамадскага жыцця*.[5] Пры перадачы сацыяльнай інфармацыі ў любым спавешчанні ўтрымліваецца два тыпы інфармацыі: патэнцыйная (схаваная) і актуальная (выяўленая). У агульным аб'ёме інфармацыі заўсёды больш схаванай інфармацыі. Скрытую інфармацыю ўтрымліваюць усе гістарычныя крыніцы, але асабліва шмат яе ў масавых крыніцах. Калі прыняць за аснову тое, што ўсе з'явы грамадскага жыцця могуць быць зведзены да дзьвух відаў з'яў – масавым і індывіду-

---

[3] Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники Российской истории: учеб. пособие, с. 73 – 74.
[4] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 4 – 5.
[5] Гл.: там жа, с. 7 – 8.

альным, то першыя могуць быць пазначаны як "сукупнасць гістарычных феноменаў (аб'ектаў) што з аднаго боку маюць аднолькавыя ўласцівасці, а з другога – характарызуюцца рознай мерай гэтых уласцівасцяў"*(па І. Д. Кавальчанку)*. Сукупнасці такіх аб'ектаў складаюць сістэмы са структурамі, якія бесперапынна змяняюцца. Таму сукупны вынік функцыянавання падобных сістэм з'яўляецца аб'ектыўна заканамерным. *Масавыя крыніцы* такія, якія ўтвараюць пэўныя сістэмы з адпаведнымі структурамі. Для атрымання, апрацоўкі і аналіза інфармацыі такіх крыніц магчыма прымяненне колькасных і машынных метадаў. Па свайму паходжанню масавымі з'яўляюцца статыстычныя крыніцы, бо іх стварэнне прадугледжвае збіранне па пэўнай праграме сістэматычных звестак і дадзеных аб масавых аб'ектах. Іншыя катэгорыі крыніц таксама фіксуюць такую інфармацыю, але ў схаванай форме. Якасна аднатыпныя крыніцы могуць быць спецыяльна вылучаны гісторыкам, які зыходзіць з вырашэння сваёй даследчай задачы, стварае сваю крынічную базу. [6]

**І. Д. Кавальчанка** цікавілі метадалагічныя праблемы працы з масавымі крыніцамі. Навуковец распрацаваў і больш за дваццаць гадоў чытаў курс "Метадалагічныя праблемы гістарычных даследаванняў", у якім знаёміў студэнтаў з асноўнымі метадалагічнымі праблемамі крыніцазнаўства: аб аб'екце гістарычнай навукі і яго спецыфіцы, аб суаднясенні аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, аб метадах, структуры, узроўнях гістарычнай навукі, аб шляхах праверкі новых ведаў і г.д. У 1987 г. выйшла кніга **"Метады гістарычнага даследавання",** у ёй апісваюцца прынцыпы, шляхі і метады, на якіх засноўваецца гістарычнае даследаванне незалежна ад яго канкрэтнай праблематыкі. І. Д. Кавальчанка, з'яўляючыся прыхільнікам марксісцкай філасофіі гісторыі, не быў дагматыкам, ён імкнуўся пазначыць новыя падыходы да метадалагічных праблем гістарычнага пазнання.[7]

Асновай любога даследавання з'яўляюцца канкрэтна-навуковыя ці канкрэтна-праблемныя метады. Спецыфіка кожнага з іх вызначаецца асаблівасцямі аб'екта пазнання і сутнасцю даследчых задач. Аднак, усе канкрэтна-праблемныя метады заснаваны на спецыяльна-навуковых метадах, а таксама агульнанавуковых і філасофскіх метадах. Напрыклад, гісторыка-параўнаўчы метад можа быць заснаваны на аналітыка-індуктыўным метадзе, на метадзе ўзыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага. *Аб гэтых метадах размова ўжо ішла* (гл. модуль 1).

**Агульнанавуковыя метады,** якія прымяняюцца ва ўсіх навуках, разлічаны на вырашэнне тых ці іншых задач, што ўзнікаюць у пазнаваўча-даследчай дзейнасці. Усе яны датычацца істотных момантаў пазнаваўчай

---

[6] Кавальчанка І.Д., с. 132 – 133.
[7] Гл.: там жа, с. 8 – 9.

дзейнасці, але іх «маштабнасць» неаднолькава. Адны з іх выкарыстоўваюцца як канкрэтныя пазнаваўчыя сродкі на эмпірычным і тэарэтычным узроўнях пазнання (напрыклад, назіранне, эксперымент, апісанне, аналіз, сінтэз, дэдукцыя, індукцыя і інш.). Іншыя звязаны з вырашэннем найбольш шырокіх пазнаваўчых задач (напрыклад, суаднясенне гістарычнага і лагічнага, канкрэтнага і астрактнага, мадэляванне і г.д.).[8]

**Гістарычны і лагічны метады** – у гістарычным даследаванні выступаюць у адзінстве. Асновай гістарычнага і лагічнага метадаў у навуковым пазнанні з'яўляецца тое, што функцыянаванне аб'ектаў адбываецца ў прасторы і часе. Інакш кажучы, кожны аб'ект (у тым ліку і гістарычны) мае сваё месца ў прасторы і часе. Лагічны метад паказвае рух прадмета ў прасторы, а гістарычны метад паказвае рух прадмета ў часе. Вывучэнне гістарычнага развіцця, асабліва калі гэта датычыцца складаных з'яў і працэсаў, толькі на падставе гістарычнага метада можа аказацца неэфектыўным. Неабходна выкарыстоўваць і лагічны метад. Напрыклад, аналіз дынамікі гістарычных з'яў на аснове прымянення матэматычных метадаў і ЭВМ паказаў, што толькі гістарычны аналіз неэфектыўны без папярэдняга вывучэння структуры і функцый адпаведных сістэм у прасторава-сінхронным аспекце.[9]

Важная роля ў навукова-даследчай дзейнасці належыць такім агульнанавуковым метадам, як **узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага** і ад **абстрактнага да канкрэтнага.** Пад *канкрэтным* разумеецца ўся аб'ектыўная рэальнасць ва ўсіх шматлікіх праявах яе рысаў і ўласцівасцяў, узаемасувязяў і заканамернасцяў яе функцыянавання і развіцця. Абстрактнае – гэта агульнае ўяўленне аб рэчаіснасці. А паколькі ўсю рэчаіснасць не магчама ўявіць, то галоўнае патрабаванне для *абстрагавання* як метада навуковага пазнання – абстракцыя павінна быць аб'ектыўна дапушчальнай. Працэс абстрагавання пры ўзыходжанні ад рэальна-канкрэтнага да абстрактнага можа ажыццяўляцца рознымі шляхамі. У навуковым даследаванні яно можа ажыцяўляцца шляхам *адцягнення, атаясамлення, ідэалізацыі*. **Узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага** не здольна давесці працэс навуковага пазнання да завяршальнай стадыі – да атрымання канкрэтна-тэарэтычных ведаў аб аб’ектыўнай рэчаіснасці. Такім чынам, веды могуць быць дасягнуты ў выніку **ўзыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага**. Узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага можа мець *два варыянты*:

1) рух пазнання ад абстракцыі як зыходнага да канкрэтна-тэарэтычнага раскрыцця аб’екта пазнання ва ўсёй яго разнастайнасці;

---

[8] Методологические проблемы истории, с. 213 – 214.
[9] Гл.: Кавальчанка І.Д., с. 155 – 158.

2) супастаўленне ідэальнага і рэальнага стану аб’екта і раскрыццё спецыфікі і ступені праявы агульных рысаў гэтага аб’екта.[10]

У сучаснай навуцы шырока выкарыстоўваюцца **сістэмны падыход і сістэмны аналіз.** Зыходным з’яўляецца паняцце сістэмы. Складанасць і разнастайнасць аб’ектыўнай рэчаіснасці дазваляе разглядаць яе як сістэму, якая складаецца з мноства асобных падсістэм. Усе сістэмы маюць сваю структуру і функцыі, элементы. *Элемент* – найменшая складаючая сістэмы, якая мае мяжу дзялення. *Структура* – унутраная арганізацыя сістэмы, што характарызуецца спосабам узаемадзеяння яе кампанентаў і іх уласцівасцяў. *Функцыя* – форма, спосаб жыццядзейнасці сістэмы і яе кампанентаў. Гісторыя вывучае грамадскія сістэмы. Для іх характэрны дынамізм развіцця, разнастайнасць уласцівасцяў, узаемасувязь асобных кампанентаў. **Сістэмны падыход** у навуковым даследаванні найбольш комплексны з усіх падыходаў, ён патрабуе прымянення такіх метадаў, як лагічны, дэдуктыўны, узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага. У якасці канкрэтных метадаў сістэмных даследаванняў выкарыстоўваюцца таксама **структурны і функцыянальны аналіз.** Першы накіраваны на раскрыццё структуры сістэм, а другі – на выяўленне іх функцый. Часта структура і функцыі сістэмы разглядаюцца ў непарыўным адзінстве, што дае магчымасць казаць аб **структурна-функцыянальным аналізе**. Часта даследчыкі, якія абіраюць гэты від аналіза лічаць, што галоўнай задачай гістарычнага пазнання з’яўляецца *мадэляванне гістарычнага працэса* (структуралізм). [11]

Такія метады як **індукцыя, дэдукцыя, аналіз і сінтэз, апісанне, статыстычны і дынамічны** і інш. знаходзяцца ва ўзаемасувязі з вышэй пазначанымі. Іх можна разглядаць і як сродкі рэалізацыі **гістарычнага, лагічнага** метадаў і **ўзыходжання** ад **канкрэтнага да абстрактнага і ад ад абстрактнага да канкрэтнага** (гл. модуль 1).

**Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц.**

Спецыяльна-гістарычныя (ці агульнагістарычныя) метады – гэта такія метады, якія скіраваны на вывучэнне аб’екта гістарычнага пазнання, г.зн. улічваюць усе асаблівасці дадзенага аб’екта, якія адлюстроўваюцца ў агульнай тэорыі гістарычнага пазнання.

Да ліку агульнанавуковых метадаў навуковага пазнання адносяцца: *гістарычна-генетычны, гістарычна-тыпалагічны, гістарычна-параўнальны і гістарычна-сістэмны.*[12] Пры выкарыстанні таго ці іншага агульнагі-

[10] Гл.: там жа, с. 159.
[11] Гл.: там жа, с. 173 – 180.
[12] Методологические проблемы истории, с. 221.

старычнага метада выкарыстоўваюцца і іншыя агульнанавуковыя метады (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, апісанне, вымярэнне, тлумачэнне і г.д.), якія выконваюць ролю канкрэтных пазнаваўчых сродкаў, неабходных для рэалізацыі падыходаў і прынцыпаў, што знаходзяцца ў аснове вядучага метада. Выпрацоўваюцца таксама неабходныя для правядзення даследавання правілы і працэдуры (даследчая методыка) і выкарыстоўваюцца пэўныя інструменты (тэхніка даследавання). *Аб спецыяльна-гістарычных метадах гл. модуль1.*

**Гістарычна-генетычны метад –** скіраваны на раскрыццё ўласцівасцяў, функцый і змен вывучаемай рэальнасці ў працэсе яе гістарычнага руху, што дазваляе ў найбольшай ступені наблізіцца да ўзнаўлення рэальнай гісторыі аб’екта. Гісторыка-генетычны метад дазваляе паказаць прычынныя сувязі і заканамернасці гістарычнага развіцця. Пры выкарыстанні гэтага метада праяўляюцца індывідуальныя асаблівасці даследчыка. Гісторыка-генетычны метад накіраваны, перш за ўсё, на аналіз развіцця. Недахопам яго з’яўляецца недастатковая ўвага да статыстыкі. Таму пры выкарыстанні гэтага метада неабходна паказваць змены і рух з фіксаваннем межаў якаснай устойлівасці вывучаемай рэальнасці. Яшчэ адным недахопам гісторыка-генетычнага метада з’яўляецца тое, што ён занадта надае ўвагу канкрэтнаму, што можа прывесці да перабольшвання індывідуальных рысаў, за якімі цяжка заўважыць агульнае. Гісторыка-генетычны метад імкнецца да апісальнасці, фактаграфіі, эмпірызму. Каб пераадолець гэта, неабходна ўлічваць, што колькі б не было фактаў, даследчыку неабходна звярнуць увагу на паказ агульных заканамернасцяў. Для паспяховага выкарыстання гісторыка-генетычнага метада, яго трэба сумяшчаць з іншымі метадамі гістарычнага даследавання.[13]

**Гістарычна-праўнальны метад** – заснаваны на выкарыстанні параўнанняў, без якіх немагчыма ні адно гістарычнае даследаванне. Гэты метад дае магчымасць раскрыць сутнасць вывучаемых з’яў на аснове іх падабенства і адрознення іх уласцівасцяў, а таксама праводзіць параўнанне такіх з’яў у прасторы і часе. Асновай гісторычна-параўнальнага метада з’яўляецца *аналогія*. Гісторычна-праўнальны метад мае шырокія пазнаваўчыя магчымасці. Ён дазваляе раскрыць сутнасць даследуемых з’яў у тых выпадках, калі яны відавочны, дазваляе вылучыць агульнае і рознае ў з’явах і працэсах. Ён таксама мае недахопы, галоўным з якіх з’яўляецца цяжкасць яго прымянення. Напрыклад, вельмі складана выкарыстоўваць гэты метад пры вывучэнні грамадскіх працэсаў. Фармальнае прымяненне гэтага метада прыводзіць да памылковых высноў. Недахопы гэтага метада

[13] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 184 – 186.

пераадольваюцца шляхам выкарыстання іншых метадаў гістарычнага даследавання.[14]

**Гістарычна-тыпалагічны метад** – заснаваны на выяўленні агульнага і асаблівага ў гістарычным развіцці аб’ектаў. Выяўленне агульнага ў гістарычным часе патрабуе выкарыстання *тыпалагізацыі*. Тыпалагізацыя мае на мэце дзяленне сукупнасці аб’ектаў ці з’яў на пэныя тыпы, класы на падставе прыналежных ім агульных істотных прыкмет. Тыпалагізацыя з’яў грамадскага жыцця – складаны працэс, які патрабуе выканання шэрагу метадалагічных прынцыпаў. Гэтыя прынцыпы могуць быць рэалізаваны толькі на падставе *дэдуктыўнага і індуктыўнага падыходаў*. Тыпы аб’ектаў вылучаюцца толькі на падставе сутнаснага аналіза разглядаемых з’яў. Цяжкасці ў тыпалагізацыі аб’ектаў узнікаюць тады, калі сутнасная прырода тыпаў мае некалькі істотных прыкмет. Каб пазбегнуць цяжкасцяў у такім выпадку магчыма выкарыстанне спецыяльных метадаў, распрацаваных у шматмерным статыстычным аналізе. [15]

**Гістарычна-сістэмны метад** – асновай гэтага метада з’яўляецца адзінства ў грамадска-гістарычным развіцці. Гэтае адзінства праяўляецца ў грамадска-гістарычных сістэмах рознага ўзроўня. У межах гэтага метада разглядаюцца як *індывідуальныя падзеі*, так *і гістарычная сітуацыя і гістарычны працэс*. Сістэмны характар грамадска-гістарычнага развіцця праяўляецца праз прычынную і функцыянальную сувязь усіх падзей і працэсаў. Усе падзеі і працэсы могуць быць: *адназначна дэтэрмінаванымі, выпадкова-верагоднаснымі і верагодна-дэтэрмінаванымі*. *Сістэмны падыход* і сістэмныя метады аналіза, да якіх адносяцца *структурны і функцыянальны аналіз*, характарызуюцца цэласнасцю і комплекснасцю. Вывучаемая сістэма разглядаецца не з боку яе асобных аспектаў і ўласцівасцяў, а як цэласная, якасная існасць з улікам яе асноўных рысаў, яе месца і ролі сярод іншых сістэм. Гісторыка-сістэмны аналіз мае і слабыя бакі: па-першае, ён можа прымяняцца для сінхроннага аналіза грамадска-гістарычных сістэм, пры гэтым застаецца нераскрытым працэс іх развіцця; па-другое, сістэмна-структурны і функцыянальны аналізы не надаюць дастатковай увагі сутнасна-змястоўнай частцы праблемы, для яго характэрна залішняя абстрагаванасць. Гэтыя недахопы пераадольваюцца шляхам выкарыстання іншых метадаў гістарычнага даследавання.[16]

Значную ролю ў працы сучаснага даследчыка-гісторыка адыгрываюць так званыя **інавацыйныя метады даследавання крыніц**. Іх выкары-

[14] Гл. там жа, с. 186 – 190.
[15] Гл.: там жа, с. 190 – 193.
[16] Ковальченко И.Д., с. 197 – 200.

станне выклікана неабходнасцю павышэння інфармацыйнасці крыніц. Адным з найбольш значных напрамкаў тут з’яўляецца выкарыстанне колькасных метадаў і ЭВМ. Адзін з напрамкаў колькаснага аналіза звязаны з вырашэннем уласна крыніцазнаўчых задач. Напрыклад, для атрыбуцыі безыменных помнікаў пісьменства і выяўлення моўна-граматычных асаблівасцяў прымяняліся матэматычныя метады *тэорыі мностваў і тэорыі графаў*. Другі напрамак звязаны з *колькаснай апрацоўкай дадзеных* індывідуальных наратыўных крыніц і іх зместу. Даследчыкі, якія карыстаюцца колькаснымі метадамі вывучэння наратыўных крыніц, перш за ўсё, займаюцца *вымярэннем*, г.зн. вылучэннем тых элементаў тэкста, якія могуць падвяргацца ўліку. Яны *фармалізуюць* тэкст у межах пастаўленай задачы. Выкарыстанне колькасных метадаў у гістарычнай навуцы прывяло да ўзрастання ў крыніцазнаўстве ролі задач, звязаных з распрацоўкай метадаў даследавання. Тым самым, можна казаць аб пашырэнні прадмета крыніцазнаўства. Адразу ўзнік шэраг метадалагічных праблем і пытанняў: аб месцы “інавацыйных метадаў” у гістарычнай навуцы, аб узаемасувязі сутнасна-змястоўнага, колькаснага і фармальна-колькаснага аналізаў, аб ролі пры прымяненні колькасных метадаў тэарэтыка-метадалагічных асноў гістарычнага пазнання, аб забеспячэнні даследаванняў, заснаваных на колькасных метадах, рэпрэзентатыўнымі па колькасных і якасных паказчыках канкрэтна-гістарычнымі дадзенымі, аб магчымасцях і асаблівасцях вымярэння гістарычных працэсаў, аб межах фармалізацыі, аб адэкватным адлюстраванні матэматычнымі метадамі ўнутранай сутнасці з’яў, аб карэктнасці прымянення адпаведных метадаў і г.д.[17]

Удакладнім тэрміны “колькасныя метады” і “матэматычныя метады.” ***Колькасныя метады*** – гэта такія, якія прымяняюцца для аналіза з’яў і працэсаў на аснове сістэмы колькасных паказчыкаў.

***Матэматычныя метады*** – гэта метады пабудовы на аснове сістэмы лічбавых дадзеных фармальна-колькасных, матэматычных мадэляў з’яў і працэсаў.[18]

*Эфектыўнасць* і магутнасць *матэматычных і камп’ютэрных метадаў* не робіць іх універсальным сродкам гістарычных даследаванняў, асабліва ў працы з апавядальнымі крыніцамі. Гэтыя метады не могуць замяніць апісальных метадаў, бо існуюць межы іх эфектыўнасці, што абумоўлена спецыфікай аб’екта гістарычнага пазнання, дасягнутым узроўнем развіцця гістарычных і матэматычных ведаў. Складанасць працы з апавядальнымі крыніцамі заключаецца ў тым, што асноўны прынцып

[17] Гл.: там жа, с. 305 – 306; Методологические проблемы истории, с. 223 – 224.
[18] Ковальченко И.Д., с. 309 – 310.

працы матэматыка – звядзенне ўсёй сукупнасці інфармацыі, ведаў да аксіём, зрабіць такое ў гуманітарнай сферы немагчыма. Аднак, камп'ютарныя метады можна выкарыстоўваць пры правядзенні працэдур працы з крыніцамі: вызначэння складанага характару тэкста крыніцы, у пошуку інфармацыйных лакун, купюр, інкарпарацый, экстрапаляцый, уставак і г.д. Фармалізацыя тэсктаў дазваляе зрабіць высновы аб іх якасных і колькасных характарыстыках.

Да колькасных метадаў адносяцца: ***колькасны аналіз; метад фармалізацыі і вымярэння паказчыкаў; метад кантэнт-аналіза; метад карэляцыйнага аналіза; метад рэгрэсіўнага аналіза, метад фактарнага аналіза*** і г.д.

Да матэматычных метадаў адносяцца: ***метады матэматычнай статыстыкі (напрыклад, выбарачны метад); метад экспертных ацэнак; метад мнагамернага шкаліравання; метад мадэлявання*** (матэматычная *мадэль* – гэта сістэма мат. паказчыкаў, якія апісваюць працэс ці з'яву. У гістарычных даследаваннях могуць прымяняцца вымяральныя мадэлі, імітацыйныя мадэлі, структурныя і дынамічныя мадэлі); ***метады матэматычнага аналіза (структурны аналіз, кластэрны аналіз, мнагамерная верагоднасная класіфікацыя, рэгрэсійны аналіз, карэляцыйны аналіз)*** і г.д.[19]

Пры выкарыстанні колькасных і матэматычных метадаў завяршальнай стадыяй гістарычнага даследавання з'яўляецца гістарычная інтэрпрэтацыя вынікаў матэматычнай апрацоўкі і аналіза колькасных дадзеных і абагульненне вынікаў. На гэтай стадыі гістарычнае даследаванне даводзіцца да лагічнага завяршэння і выяўляецца тое новае, што атрымалася ў выніку прымянення дадзеных метадаў, а значыць, праяўляецца ўвесь навукова-пазнаваўчы эфект прымянення метадаў.

Аднак не ўсе гістарычныя пытанні можна вырашыць толькі з дапамогай матэматычных і камп'ютэрных метадаў. Парадаксальнасць гістарычных ведаў была сфармулявана яшчэ прадстаўнікамі школы Аналаў, якая прапанавала historie-problem – праграму пошука і пастаноўкі новых праблем у гістарычных даследаваннях.

Так званы "лінгвістычны паварот" у гістарычнай навуцы прывёў да выкарыстання метадаў **семіятычнага аналіза** ў працы з гістарычнымі крыніцамі. Да метадаў семіётыкі адносяцца: *метад вылучэння знакаў, метад падзелу знакаў і "абазначаных" імі значэнняў, спосабы кадзіравання і перакадзіравання знакаў, складвання з іх новай гістарычнай пабудовы.*

[19] Гл.: Ковальченко И.Д., с. 330, 341, 343, 367, 373, 375, 386,403, 405.

Любую гістарычную крыніцу можна разглядаць як тэкст. З пункта гледжання **семіётыкі** існуе праблема не толькі даследавання тэкста крыніцы, але і кантэкста – таго акружэння, у якім ствараўся тэкст. Сама гэтая праблема не новая для гісторыі, яе пазначалі амаль усе вядомыя крыніцазнаўцы як адну з неабходных умоў інтэрпрэтацыі тэкста. Аднак, засноўваючыся на семіятычным разуменні крыніцы як тэкста, вылучаюць некалькі "кантэкстаў," якія яе акружаюць: знакавы, сэнсавы, прадметны, прагматычны. Па меркаванню **Дж. Леві** даследаванне кантэкстаў дапамагае зразумець сапраўдны сэнс падзей, апісаных у крыніцы (тэксце). А вось **Ла Капр** лічыць, што кантэкст – таксама свайго роду тэкст і вырашэнне праблемы гістарычнага разумення ёсць поле абмеркавання ўзаемадзеянняў тэкста і кантэкста. Такі кампаратыўны падыход стварае адзіны кантэкст для любога асобнага тэкста. Галоўнымі ў такім выпадку ён лічыць адносіны: "тэкст – чытач" (ці тэкст – даследчык). Даследчык павінен выкарыстоўваць "інтэртэкстуальнае прачытанне", г.зн. усе крыніцы павінны быць ім задакументаваны з мэтай атрымання найбольшага аб'ёма інфармацыі. Пры гэтым вывучэнню падвяргаюцца ўсе знакі і сімвалы ў тэксце. Прадстаўнікі гэтага напрамку заклікаюць да даследавання літаратурных тэкстаў як крыніц багатых гістарычным матэрыялам, якія характарызуюць эпоху. З пункту гледжання семіётыкі інтэрпрэтацыя мінулага адбываецца не толькі тэкстам гістарычнага наратыва, але і яго даследчыкам. Тут паўторана ідэя рускага філосафа М. Бахціна аб тым, што гісторык мае дыялогавыя адносіны з тэкстам, а пазнанне гісторыі адбываецца шляхам спасціжэння сэнсаў тэкстаў даследчыкам.

**Герменеўтыка –** сукупнасць правілаў і тэхнік у тлумачэнні тэкста. Гістарычныя віды герменеўтыкі: пераклад, рэканструкцыя, дыялог. **В. Дзільтэй** першым перанёс метады філалагічнай інтэрпрэтацыі ў гістарычную навуку. Неабходнасць такога кроку была абумоўлена тым, што ў еўрапейскай культуры канчаткова была вычарпана роля традыцыі. Традыцыя не магла даказаць сваю эфектыўнасць у дынамічным грамадстве, забяспечыць магчымасць разумення з дапамогай успамінаў. Такім чынам, гісторыя стала герменеўтычнай. Метады герменеўтыкі выкарыстоўвалі, перш за ўсё, у працы з гістарычнымі крыніцамі. Адносіны паміж даследчыкам і аўтарам крыніцы прадстаўнікі гэтага напрамку мадэлявалі пры дапамозе так званага ***"герменеўтычнага трохкутніка"***, які можна адлюстраваць наступным чынам:

**Аўтар ( S1)→ тэкст (O)→ інтэрпрэтатар (S2)**

Разуменне тэкста дасягаецца сродкам актуалізацыі ці інтэграцыі, таму дадзены тып герменеўтыкі называецца "тыпам інтэграцыі" (**Гада-**

**мер**). Прадстаўнікі герменеўтыкі лічаць, што быццё прадзначана мінулым, значыць не існуе разумення без прадразумення. Значыць ідэя навуковасці і аб'ектыўнасці не з'яўляецца агульнаістотнай, а толькі вытворнай. Гадамер паслядоўна аналізуе феномены эстэтычнай, гістарычнай, лінгвістычнай свядомасці. Гэтаму аналізу прысвечана яго кніга **"Ісціна і метад"** (1960 г.), дзе разглядаюцца праблемы эстэтыкі, гісторыі і мовы. Гадамер ставіць праблему метада. Ён лічыць, што паміж вопытам мастацтва і вопытам гісторыі існуе тоеснасць. Крытыка гістарычнага аб'ектывізма, абстракцыі "гістарычнай свядомасці" прыводзіць аўтара да ўвядзення тэрміна "дзейнасна-гістарычная свядомасць." У адрозненні ад гістарычнай свядомасці, якая ўсведамляе канчатковасць і адноснасць усіх гістарычных утварэнняў, дзейнасна-гістарычная свядомасць усведамляе сваю ўласную канчатковасць, свядома падначальваецца адпаведнай гісторыі ўздзеянняў.

Пошук новых метадаў даследавання прывёў гісторыкаў да выкарыстання **сацыяльна-псіхалагічных метадаў** у даследаванні гістарычных крыніц. Да сацыяльна-псіхалагічных метадаў адносяцца: *псіхааналіз, аналіз "групавых фантазій", кантэнт-аналіз, мадэляванне і інш.*

Псіхагісторыя на захадзе развіваецца з 1960-х гадоў. На працэс станаўлення гэтага напрамку паўплывалі ідэі З. Фрэйда (у псіхалогіі) і М. Блока, В. Дзільтэя, Л. Феўра, Ф. Арыеса (у гісторыі), ідэі французскай школы "Аналаў". Прадстаўнікі гэтага накірунка лічаць неабходным выкарыстанне псіхалагічных ведаў у гістарычных інтэрпрэтацыях. На аснове гэтай ідэі выпрацаваны арыгінальныя тэорыі, якія тычацца асноўных сфер даследаванняў: псіхабіяграфій, гісторыі дзяцінства, псіхалогіі груп. У Беларусі да псіхалагічнай метадалогіі звярнуліся ў 90-я гг. XX ст., калі з'явіліся першыя даследаванні па гісторыі дзяцінства, псіхааналітычныя трактоўкі фальклорных крыніц і г.д. У межах гістарычнай псіхалогіі гістарычныя крыніцы вывучаюцца з пункту гледжання псіхалагічных матывацый чалавека ў гісторыі, заканамернасцяў развіцця групавых працэсаў і інш.[20]

Такім чынам, у метадалогіі сучаснай гістарычнай навукі ўсё часцей выкарыстоўваюцца набыткі іншых навук, што сведчыць аб узмацненні міждысцыплінарных сувязяў. Міждысцыплінарныя метады выключаюць панаванне ў гістарычнай навуцы адной універсальнай канцэпцыі ці ідэалогіі. Сучаснае гістарычнае крыніцазнаўства больш абапіраецца не на ідэалагічнае адзінства, а на ўзаемаперапляценне розных метадаў у навуковых даследаваннях.

[20] Гл.: Методологические проблемы истории, с. 162.

## Практычны занятак

### План семінара:

1. Метадалогія крыніцазнаўства ў працах А. С. Лапо-Данілеўскага і І. Д. Кавальчанкі.

2. Спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц.

3. Інавацыйныя метады даследавання крыніц.

4. Выкарыстанне колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій у апрацоўцы апавядальных крыніц.

5. Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц.

### Тэмы рэфератаў:

1. Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц у працах А. С. Лапо-Данілеўскага.

2. Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц у працах І. Д. Кавальчанкі.

3. Метадалогія гістарычнага пазнання сучаснай гісторыі (па кнізе: *Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей учреждений, обеспечивающих получение высш. образования / В. Н. Сидорцов [и др.]; под общ. ред. В. Н. Сидорцова. – Мн.: ТетраСистемс, 2006).*

4. Колькасныя метады ў гістарычным даследаванні. (па кнізе: Ковальченко И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., доп. – М.: Наука, 2003. – 486 с.)

5. Матэматычныя метады ў гістарычным даследаванні. (па кнізе: Ковальченко И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., доп. – М.: Наука, 2003. – 486 с.)

6. Метады семіётыкі ў гістарычным даследаванні.

7. Метады герменеўтыкі ў гістарычным даследаванні.

8. Сацыяльна-псіхалагічныя метады ў гістарычным даследаванні.

**Кантрольныя заданні да практычнага занятка**
**“Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц”**

**Заданне 1**
**Суаднясіце навуку і яе метады:**

| | |
|---|---|
| **1. Сацыяльная псіхалогія** | *а) метад вылучэння знакаў, метад падзелу знакаў і “абазначаных” імі значэнняў, спосабы кадзіравання і перакадзіравання знакаў* |
| **2. Семіётыка** | *б) псіхааналіз, аналіз “групавых фантазій”, кантэнт-аналіз, мадэляванне* |
| **3. Матэматыка** | *в) рэканструкцыя тэкста, дыялог чытача і аўтара, пераклад, тлумачэнне* |
| **4. Герменеўтыка** | *г) метады статыстыкі, выбарачны метад, метад эксперных ацэнак, метад мнагамернага шкаліравання, метад мадэлявання* |

**Заданне 2**

**Якія метады называюцца агульнанавуковымі?**

а) якія прымяняюцца ва ўсіх навуках;

б) якія разлічаны на вырашэнне тых ці іншых задач, што ўзнікаюць у пазнаваўча-даследчай дзейнасці гісторыка;

в) якія выкарыстоўваюцца як канкрэтныя пазнаваўчыя сродкі на эмпірычным і тэарэтычным узроўнях пазнання;

г) якія прымяняюцца ва ўсіх навуках, разлічаны на вырашэнне тых ці іншых задач, што ўзнікаюць у пазнаваўча-даследчай дзейнасці.

**Заданне 3**

**Галоўнае патрабаванне для *абстрагавання* як метада навуковага пазнання:**

а) узыходжанне ад рэальна-канкрэтнага да абстрактнага;

б) абстракцыя павінна быць аб'ектыўна дапушчальнай;

в) атрыманне канкрэтна-тэарэтычных ведаў аб аб’ектыўнай рэчаіснасці;

г) супастаўленне ідэальнага і рэальнага стану аб’ектаў.

**Заданне 4**

**Размяжуйце агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання крыніц:**

| | |
|---|---|
| **а) Агульнанавуковыя метады** | 1) узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага<br>2) гістарычны метад<br>3) гістарычна-тыпалагічны метад |
| **б) Спецыяльна-гістарычныя метады** | 4) лагічны метад<br>5) аналіз і сінтэз<br>6) гістарычна-генетычны метад<br>7) гістарычна-сістэмны метад |

**Заданне 5**

**Растлумачце, як Вы разумееце сэнс «Лінгвістычнага павароту» ў гістарычнай навуцы?**

**Заданне 6**

**Хто першым выкарыстаў метады філалагічнай інтэрпрэтацыі ў гістарычнай навуцы?**

а) Гадамер;

б) М. Блок;

в) Ф. Арыес;

г) В. Дзільтэй.

**Рэкамендаваная па модулю літаратура:**


1. Бородкин, Л. И., Милов, Л. В., Морозова, Л. Е. К вопросу о формальном анализе авторских особенностей стиля в произведениях Древней Руси // Математические методы в историко-экономических и историко-культурных исследованиях. – М., 1977. – С. 298 – 326.

2. Бородкин, Л. И., Милов, Л. В. О некоторых аспектах автоматизации текстологических исследований (Закон Судный людем) // Математические методы в историко-экономических и историко-культурных исследованиях. – М., 1977. – С. 235 – 280.

3. Бородкин, Л. И. Многомерный статистический анализ в исторических исследованиях / Л. И. Бородкин. – М., 1986.

4. Буховец, О. Г. Социальные конфликты и крестьянская менталь-

ность в Российской империи начала XX века: новые материалы, методы, результаты / О. Г. Буховец. – М., 1996.

5. Кащенков, С. Г. Изучение массовых источников XIX – нач. XX стст. на кафедре источниковедения истории России Санкт-Петерургского университета (1991 – 2001 гг.) // Историография и источниковедение отечественной истории: сб. научных статей и сообщений. – Санкт-Петербург, 2001. – С. 15 – 24.

6. Ковальченко, И. Д. Исторический источник в свете учения об информации (к постановке проблемы) // История СССР. – М., 1982. – № 3. – С. 129 – 148.

7. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – 2-е изд., доп. – М., 2003.

8. Количественные методы в исторических исследованиях / под ред. И. Д. Ковальченко. – М., 1984.

9. Кухарцева, М. А. Опыт чтения текстов в лингвистической философии истории // Философия и общество. – 2005. – № 1(38). – С. 115 – 132.

10. Липницкая, О. Л., Кудряшов, В. Е. Компьютерное источниковедение в Беларуси: некоторые итоги и проблемы // информ. бюллетень ассоциации «История и компьютер». 1997. – № 21. – С. 167 – 171.

11. Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей учреждений, обеспечивающих получение высш. образования / В. Н. Сидорцов [и др.]; под общ. ред. В.Н. Сидорцова. – Мн., 2006.

12. Моисеенко, Т., Свищев, М. Изучение аграрной России последних десятилетий: перспективы «компьютерного источниковедения» // История и компьютер: Новые информационные технологии в исторических исследованиях и образовании. – Геттинген, 1993. – С. 151 – 167.

13. Приймак, Н. И. История Санкт-Петербурга в научном наследии А. С. Лаппо-Данилевского. // Историография и источниковедение отечественной истории: сб. научных статей и сообщений. – СПб., 2001. – С. 144 – 152.

## Тэмы кантрольных работ для студэнтаў завочнай формы навучання:

### Тэма 1:

1. Прадмет, мэты і задачы курса.
2. Дакументальныя крыніцы.
3. Паняцце дакладнасці гістарычнай крыніцы. Паўната і дакладнасць інфармацыі крыніцы.
4. Класіфікацыя гістарычных крыніц.

### Тэма 2

1. Атрыбуцыя.
2. Архіўная эўрыстыка.
3. Вызначэнне гістарычнай крыніцы.
4. Аднаўленне і рэканструкцыя тэкста.

### Тэма 3

1. Лінгвістычнае і палеаграфічнае вывучэнне тэкста.
2. Праблемы вывучэння рэчавых і выяўленчых крыніц.
3. Бібліяграфічная эўрыстыка.
4. Гісторыя крыніцазнаўства.

### Тэма 4

1. Віды пісьмовых крыніц і асаблівасці іх вывучэння.
2. Асноўныя этапы працы з крыніцамі.
3. Крыніцазнаўчая эўрыстыка.
4. Крыніцазнаўчая крытыка, яе мэты і асноўныя этапы.

### Тэма 5

1. Знешняя крытыка крыніцы.
2. Масавыя крыніцы.
3. Методыка даціроўкі гістарычных крыніц.
4. Справаводчыя матэрыялы як крыніца.

### Тэма 6

1. Паняцце аб сапраўднасці і падробцы гістарычнай крыніцы.
2. Крыніцазнаўчы сінтэз.
3. Пошук і выяўленне гістарычных крыніц.
4. Кіна-фота-фона дакументы, асаблівасці іх вывучэння.

**Тэма 7**

1. Унутраная крытыка крыніцы.
2. Аднаўленне і рэканструкцыя тэкста.
3. Вывучэнне паходжання гістарычнай крыніцы.
4. Заканадаўчыя крыніцы.

**Тэма 8**

1. Інтэрпрэтацыя гістарычнай крыніцы.
2. Матывацыя фальсіфікацыі гістарычнай крыніцы.
3. Паняцце дакладнасці гістарычнай крыніцы.
4. Крыніца як феномен культуры.

**Тэма 9**

1. Сацыяльна-псіхалагічныя метады вывучэння гістарычных крыніц.
2. Матэрыялы перыядычнага друку як крыніца.
3. Паўната і дакладнасць інфармацыі крыніцы.
4. Крыніцазнаўства як асаблівы метад пазнання рэальнага свету.

**Тэма 10**

1. Выкарыстанне колькасных метадаў і інфармацыйных (камп'ютэрных) тэхналогій у крыніцазнаўстве.
2. Метады выпраўлення скажоных месцаў тэкста.
3. Высвятленне палітычных, ідэалагічных і іншых пазіцый аўтара крыніцы.
4. Праблемы ўзаемадзеяння крыніцазнаўства і інфарматыкі.

**Тэма 11**

1. Устанаўленне складанага састава крыніцы.
2. Летапісы і хронікі як гістарычыя крыніцы.
3. Эпісталярная спадчына як гістарычная крыніца.
4. Паняцце аб сапраўднасці і падробцы гістарычнай крыніцы.

**Тэма 12**

1. Паняцце "гістарычная крыніца", "гістарычны дапаможнік", "гістарычнае даследаванне".
2. Развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай Імперыі.
3. Геральдыка і генеалогія ў вывучэнні гістарычных крыніц.
4. Тыпы і віды календароў.

**Тэма 13**

1. Колькасныя і матэматычныя метады ў вывучэнні гістарычных крыніц.
2. Школа "Аналаў".

3. Метады палеаграфіі пры даследаванні гістарычных крыніц.

4. Аналіз прамой і ўскоснай інфармацыі аб часе стварэння гістарычнай крыніцы.

**Тэма 14**

1. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.
2. Выяўленне крыніц у архівах.
3. Сістэматызацыя гістарычных крыніц. Віды сістэматызацыі.
4. Паняцце рэпрэзентатыўнасці гістарычнай крыніцы.

**Тэма 15**

1. Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы. Прадмет гістарычнай храналогіі.
2. Гістарычная крыніца як аснова міждысцыплінарнага сінтэза.
3. Метады палеаграфіі пры даследаванні гістарычных крыніц.
4. Атрыбуцыя.

**Тэма 16**

1. Прадмет, мэты і задачы курса.
2. Паняцце дакладнасці гістарычнай крыніцы. Паўната і дакладнасць інфармацыі крыніцы.
3. Лінгвістычнае і палеаграфічнае вывучэнне тэкста.
4. Праблемы вывучэння рэчавых і выяўленчых крыніц.

**Тэма 17**

1. Бібліяграфічная эўрыстыка.
2. Дакументальныя крыніцы.
3. Гісторыя крыніцазнаўства.
4. Класіфікацыя гістарычных крыніц.

**Тэма 18**

1. Перадумовы ўзнікнення і асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства.
2. Гістарычныя тэксты. Вызначэнне арыгінальнага тэкста.
3. Выкарыстанне метадаў дыпламатыкі для аналіза актавых крыніц.
4. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства.

**Тэма 19**

1. Выкарыстанне сфрагістыкі для вывучэння гістарычных крыніц.
2. Задачы крыніцазнаўчай эўрыстыкі.
3. Знешняя крытыка пісьмовых крыніц.
4. Сінтэз гістарычнай інфармацыі крыніцы.

**Тэма 20**

1. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.
2. Летапісы як гістарычныя крыніцы.
3. Бібліяграфічная эўрыстыка.
4. Тэарэтычнае і прыкладное крыніцазнаўства.

**Тэма 21**

1. Прырода гістарычнай крыніцы.
2. Асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства ў новы час.
3. Крытэрыі класіфікацыі. Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц.
4. Заканадаўчыя дакументы як гістарычныя крыніцы.

**Тэма 22**

1. Гістарычная крыніца ў святле вучэння аб інфармацыі.
2. Класіфікацыя крыніц С. О. Шмідта.
3. Акты як гістарычныя крыніцы.
4. Рэканструкцыя тэкстаў.

**Тэма 23**

1. Месца крыніцазнаўства ў сістэме навук. Суадносіны крыніцазнаўства і архівазнаўства, музеязнаўства, бібліяграфіі, інфарматыкі.
2. Мемуары як гістарычныя крыніцы.
3. Распрацоўка тэорыі і методыкі крыніцазнаўства А. С. Лапо-Данілеўскім.
4. Гістарычная крыніца і гістарычны дапаможнік.

***Увага!***

*Кантрольная праца студэнта-завочніка павінна быць выканана акуратна, пісьменна, з улікам агульных патрабаванняў да кантрольных работ. Работа можа быць выканана "ад рукі" ці ў друкаваным варыянце. Пры раскрыцці кожнага пытання павінны быць спасылкі на крыніцы, літаратуру, спіс літаратуры абавязкова робіцца ў канцы працы. Крытэрыем адзнакі працы лічыцца паўната раскрыцця ўсіх 4-х пытанняў і правільнасць афармлення.*

*Тэма кантрольнай выбіраецца па апошнім дзьвум лічбам Вашай залікоўкі. Калі апошнія дзьве лічбы нумара Вашай залікоўкі больш 23, то суміруеце апошнія дзьве лічбы і выбіраеце варыянт па атрыманаму выніку. Напрыклад, Ваш нумар залікоўкі 26, атрымоўваецца 2 + 6 = 8, Ваша кантрольная № 8.*

**Прыкладныя пытанні да экзамена па курсу:**

1. Аб’ект і прадмет крыніцазнаўства.
2. Тэарытычнае і прыкладное крыніцазнаўства.
3. Суаднясенне паняццяў “рэчавая крыніца”, “археалагічная крыніца”, “музейны прадмет”, “музейны экспанат”.
4. Вызначэнне гістарычнай крыніцы. Паняцце “гістарычная крыніца”, “гістарычны дапаможнік”, “гістарычнае даследаванне”.
5. Прырода гістарычнай крыніцы. Гістарычная крыніца як аснова міждысцыплінарнага сінтэза.
6. Роля і месца крыніцазнаўства ў сістэме гістарычных навук. Узаемадзеянне крыніцазнаўства і археграфіі, архівазнаўства, музеязнаўства.
7. Выкарыстанне метадаў дыпламатыкі і сфрагістыкі для аналіза актавых крыніц.
8. Выкарыстанне дадзеных гістарычнай метралогіі пры вывучэнні гістарычных крыніц.
9. Метады палеаграфіі пры даследаванні гістарычных крыніц.
10. Выкарыстанне навуковага патэнцыялу нумізматыкі і фалерыстыкі для аналіза гістарычных крыніц.
11. Геральдыка і генеалогія ў вывучэнні гістарычных крыніц.
12. Гісторыя крыніцазнаўства. Перадумовы і асноўныя этапы развіцця крыніцазнаўства.
13. Развіццё крыніцазнаўства ў Расійскай Імперыі. Зараджэнне расійскай школы крыніцазнаўства.
14. Развіццё крыніцазнаўства ў навейшы час. Дыскусіі аб сутнасці гісторыі і ролі гістарычных крыніц. Школа “Аналаў”.
15. Разработка тэорыі крыніцазнаўства савецкімі гісторыкамі (С. О. Шмідт, О. М. Медушэўская і інш.).
16. Колькасныя метады і новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў даследаванні гістарычных крыніц (І. Д. Кавальчанка, Л. І. Бародкін і інш.).
17. Распрацоўка крыніцазнаўства гісторыі Беларусі (М. В. Доўнар-Запольскі, Д. І. Даўгяла, Н. Н. Улашчык і інш.).
18. Класіфікацыя гістарычных крыніц, яе сутнасць і мэты. Крытэрыі класіфікацыі.
19. Сістэматызацыя гістарычных крыніц. Віды сістэматызацыі.
20. Пісьмовыя крыніцы, іх роля ў вывучэнні гісторыі. Класіфікацыя пісьмовых крыніц.
21. Выяўленне гістарычных крыніц. Задачы крыніцазнаўчай эўрыстыкі.
22. Пошук апулікаваных крыніц. іліяграфічная эўрыстыка.
23. Тыпы і віды публікацый. Праблемы, якія ўзнікаюць у працэсе працы з апублікаванымі крыніцамі.
24. Выяўленне крыніц у архівах. Архіўная эўрыстыка. Сетка архіўных устаноў Рэспулікі Беларусь.
25. Пошук гістарычных крыніц у сетцы “Internet”.

26. Знешняя крытыка пісьмовых крыніц. Агульная характарыстыка.

27. Вызначэнне паняцця “тэкст”. Гістарычныя тэксты. Вызначэнне арыгінала.

28. Вызначэнне складанага характару тэкста. Паняцці “рэдакцыі”, “спіска”, “ізвода”. Інтэрпаляцыя і глосы.

29. Этапы стварэння дакументаў: чарнавікі, белавікі, копіі, дублікаты.

30. Рэканструкцыя тэкстаў пісьмовых крыніц.

31. Інтэрпрэтацыя гістарычных крыніц. Крыніцазнаўчая герменеўтыка.

32. Вызначэнне часу ўзнікнення крыніцы. Прадмет гістарычнай храналогіі.

33. Летазлічэнне. Тыпы і віды календароў.

34. Методыка даціроўкі гістарычнай крыніцы. Аналіз прамой і ўскоснай інфармацыі аб часе стварэння гістарычнай крыніцы.

35. Аналіз ускоснай інфармацыі аб часе стварэння гістарычнай крыніцы. Сінтэз інфармацыі аб часе стварэння гістарычнай крыніцы.

36. Лакалізацыя гістарычных крыніц. Прадмет гістарычнай геаграфіі. Гістарычныя карты.

37. Выкарыстанне дадзеных тапанімікі для лакалізацыі гістарычных крыніц.

38. Вызначэнне месца ўзнікнення гістарычнай крыніцы з дапамогай дадзеных лінгвістыкі.

39. Методыка лакалізацыі гістарычных крыніц. Аналіз прамой інфармацыі аб месцы стварэння гістарычнай крыніцы.

40. Аналіз ускоснай інфармацыі аб месцы стварэння гістарычнай крыніцы. Сінтэз інфармацыі аб месцы стварэння гістарычнай крыніцы.

41. Атрыбуцыя гістарычнай крыніцы. Прамая інфармацыя аб аўтары гістарычнай крыніцы: імя, імя па бацьку, прозвішча, мянушка. Выкарыстанне дадзеных генеалогіі і генеалагічных табліц пры высвятленні інфармацыі аб аўтары крыніцы.

42. Ускосная інфармацыя аб аўтары гістарычнай крыніцы: тытул, пасада, псеўданім, сацыяльны статус.

43. Аўтарскі стыль і яго структура. Колькасныя метады і інфармацыйныя тэхналогіі вызначэння аўтарства.

44. Вызначэнне падлогаў і падробак.

45. Мэты і задачы ўнутранай крытыкі крыніц.

46. Паняцце сапраўднасці інфармацыі гістарычнай крыніцы. Паўната і дакладнасць інфармацыі гістарычнай крыніцы.

47. Фактары, якія ўплываюць на паўнату і дакладнасць інфармацыі гістарычнай крыніцы.

48. Сінтэз гістарычнай інфармацыі крыніц, яго сутнасць, мэты. Паняцце рэпрэзентатыўнасці гістарычнай крыніцы. Вызначэнне навуковай каштоўнасці інфармацыі гістарычных крыніц.

## Кароткі тэрміналагічны слоўнік:

**Актавыя матэрыялы** (граматы, запісы) – гэта прававыя дакументы, якія ў юрыдычнай форме фіксавалі дамовы паміж асобамі.

**Археаграфія** (ад грэч. archaios – старажытны + grapho – пішу ) – дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая распрацоўвае методыку пошуку і збору пісьмовых помнікаў, пытанняў навуковага ўліку і апісання рукапісаў і рукапісных кніг (камеральная археаграфія), прынцыпы і метады выдання тэкставых гістарычных крыніц (эдыцыйная археаграфія).

**Архівазнаўства** – комплексная дысцыпліна, што вывучае гісторыю, арганізацыю, тэорыю і практыку работы архіваў у галіне ўліку, апісання, выкарыстання, забеспячэння захаванасці дакументаў, навуковую арганізацыю працы і эканоміку архіўнай справы.

**Архіўная эўрыстыка** – гэта тэорыя і методыка пошуку неапублікаваных матэрыялаў па тэме ў архівах.

**Архіўны каталаг** – гэта тып архіўнага даведніка, у якім другасная дакументальная інфармацыя размешчана па прадметах, тэмах, галінах.

**Біліяграфічная эўрыстыка** – гэта тэорыя і методыка бібліяграфічных пошукаў, сукупнасць тэарытычных і практычных ведаў, якія адносяцца да прыёмаў пошуку якога-небудзь тыражыраванага кніжнага матэрыялу ці асобных яго элементаў.

**Герменеўтыка** – навука аб тлумачэнні сэнса тэкста.

**Гістарычная бібліяграфія –** дысцыпліна, прадметам якой з’яўляецца распрацоўка метадаў пошуку, бібліяграфічнага апісання, мэтавага адбору і прадастаўлення атрыманай інфармацыі даследчыку.

**Гістарычны дапаможнік** – гэта мадэль гістарычнай рэальнасці, заснаваная на дадзеных крыніцы, якая дазваляе вывучаць падзеі мінулага.

**Гістарычнае даследаванне** – гэта праца прафесійнага гісторыка, якая выканана на аснове гістарычных крыніц з выкарыстаннем распрацаваных у гістарычнай навуцы метадаў даследавання.

**Гістарычныя крыніцы** – гэта матэрыяльныя аб’екты, якія маюць сацыяльную прыроду паходжання, адлюстроўваюць гістарычнае мінулае грамадства, уцягнуты ў сферу гістарычнага даследавання і служаць сродкам гістарычнага пазнання.

**Глосы** – прыпіскі на палях, якія паказваюць на тое, каму належала крыніца, хто яе чытаў ці перапісваў, тлумачаць незразумелыя словы.

**Дыпламатыка** – спецыяльная гістарычная дысцыпліна, якая вывучае паходжанне, форму і змест актавых крыніц для вызначэння іх сапраўднасці.

**Заканадаўчыя акты** – гэта прававыя нарматыўныя дакументы, якія выдаваліся вярхоўнай дзяржаўнай уладай і мелі вышэйшую юрыдычную сілу ў межах якой-небудзь тэрыторыі ці дзяржавы.

**Інвентарны вопіс** – гэта ўліковыя дакументы і даведнікі па апісанню дакументаў, яны ўтрымліваюць пералікі загалоўкаў і іншых звестак аб складзе і змесце спраў пэўнага комплекса з самастойнай парадкавай нумарацыяй у архіве.

**Канвенцыянальныя крыніцы** (лац. *conventionalis* – умоўны), гэта нотныя запісы, знакі матэматычнай і іншай сімволікі, інфармацыя, што закадзіравана на машынных носьбітах і г.д.

**Картатэка** – гэта нанесены на асобныя карткі пералік выданняў, выяўленых па асобнай тэматыцы ці іншаму прынцыпу ў бібліятэцы.

**Каталаг** – гэта пералік крыніц і даследаванняў, што знаходзяцца ў фондах дадзенай бібліятэкі.

**Класіфікацыя** – гэта дзяленне неаднароднай сукупнасці прадметаў на аднародныя групы па якой-небудзь сутнаснай, унутранай прыкмеце.

**Колькасныя метады** – гэта такія метады, якія прымяняюцца ў гістарычнай навуцы для аналіза з'яў і працэсаў на аснове сістэмы колькасных паказчыкаў.

**Крыніцазнаўчая эўрыстыка** (ад грэч. "знаходжу") – раздзел крыніцазнаўства, які разглядае спосабы, методыкі выяўлення і адбору неабходных для гісторыка крыніц.

**Летапіс –** гэта гістарычнае апавяданне, у якім звесткі размяшчаюцца пад пэўнымі гадамі.

**Матэматычныя метады** – гэта метады пабудовы на аснове сістэмы лічбавых дадзеных фармальна-колькасных, матэматычных мадэляў з'яў і працэсаў.

**Мемуары** (ад лац. *memoria* – памяць) – успаміны пра мінулае, напісаныя ўдзельнікамі, альбо сведкамі якіх-небудзь падзей.

**Метадалогія** – вучэнне аб навуковым метадзе пазнання, метадалагічнай рэфлексіі, бачанні гістарычнай рэальнасці, што падлягае вывучэнню.

**Музейныя прадметы** – гэта крыніцы, якія знаходзяцца ў экспазіцыі і фондах музеяў.

**Музеязнаўства** (музеялогія) – навуковая дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці ўзнікнення і развіцця музейных адносін да рэчаіснасці, гісторыю музея як сацыяльнага інстытута і яго функцый у грамадстве, формы і спосабы рэалізацыі гэтых функцый на розных этапах грамадскага развіцця.

**Навукова-гістарычны факт** – гэта адлюстраванне гісторыкам фактаў гістарычнай рэальнасці на аснове фактаў крыніц.

**Навуковыя працы –** гэта творы, якія адлюстроўваюць навуковыя ўяўленні мінулага і новыя тэарытычныя і практычныя навуковыя распрацоўкі.

**Наўмысная інфармацыя** – гэта дадзеныя ў крыніцы, якія разглядаліся аўтарам як часавыя арыентыры.

**Ненаўмысная інфармацыя** – гэта тыя звесткі ў крыніцы, які аб'ектыўна адлюстроўваюць гістарычны час, але ў мінулым не выкарыстоўваліся як часавыя вехі.

**Непасрэдная інфармацыя крыніцы** – такая, у якой аб'ект адлюстроўваецца прама, без "пасрэднікаў". Гэта непасрэднае адлюстраванне пазнаецца праз мэты, якіх намагаецца дасягнуць стварэннем гэтай крыніцы яе творца, праз метады і формы ўспрымання аб'ектыўнай рэальнасці і г.д.

**Паданне** – аповед аб гістарычным факце, што перададзены ў крыніцы.

**Перыядычны друк** – гэта выданні, якія выходзілі з пэўнай перыядычнасцю (раз ў тыдзень, штодзённа, раз у месяц і г.д.) і мелі мэтай публікаванне інфармацыйных і аналітычных матэрыялаў па праблемах эканамічнага, палітычнага, культурнага жыцця.

**Публіцыстычныя творы** – такія творы, у якіх пераважаюць палемічныя функцыі, яны не толькі фіксуюць падзеі, але і адлюстроўваюць адчуванні, пачуцці, роздумы аўтараў аб пэўных падзеях.

**Пратограф** – гэта бліжэйшы па тэксце арыгінал аднаго ці некалькіх спісаў летапіса.

**Рэчавыя крыніцы** – гэта любыя матэрыяльныя аб'екты, створаныя працай чалавека і якія ўтрымліваюць інфармацыю аб мінулым.

**Рэшткі** – гэта самі прадметы (факты) мінулага, якія непасрэдна вывучае гісторык.

**Сістэматызацыя** – дзяленне неаднароднай сукупнасці крыніц па неістотнай для навукі прыкмеце.

**Справаводчыя матэрыялы –** гэта дакументацыя, што выдавалася рознымі дзяржаўнымі, судовымі, эканамічнымі, палітычнымі і грамадскімі арганізацыямі (установамі) з мэтай кіравання дзейнасцю.

**Статыстычныя матэрыялы –** гэта матэрыялы, якія характарызуюць колькасныя заканамернасці жыцця грамадства.

## ЗМЕСТ

Уводзіны ... 3
Рабочая праграма ... 5
Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны ... 19
Модуль 1. Прадмет і змест крыніцазнаўства ... 23
Вучэбны матэрыял ... 23
Практычны занятак ... 40
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 43
Модуль 2. Вызначэнне гістарычнай крыніцы ... 45
Вучэбны матэрыял ... 45
Практычны занятак ... 52
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 54
Модуль 3. Гісторыя крыніцазнаўства ... 56
Вучэбны матэрыял ... 56
Практычны занятак ... 71
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 75
Модуль 4. Класіфікацыя і сістэматызацыя крыніц ... 76
Вучэбны матэрыял ... 76
Практычны занятак ... 81
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 83
Модуль 5. Пісьмовыя крыніцы ... 84
Вучэбны матэрыял ... 84
Практычны занятак ... 97
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 101
Модуль 6. Крыніцазнаўчая эўрыстыка ... 102
Вучэбны матэрыял ... 102
Практычны занятак ... 110
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 113
Модуль 7. Гістарычная крытыка крыніц ... 115
Вучэбны матэрыял ... 115
Практычны занятак ... 128
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 131
Модуль 8. Асноўныя метады даследавання гістарычных крыніц ... 134
Вучэбны матэрыял ... 134
Практычны занятак ... 146
Рэкамендаваная па модулю літаратура ... 148
Тэмы кантрольных работ для студэнтаў завочнай формы навучання ... 150
Прыкладныя пытанні да экзамена па курсу ... 154
Кароткі тэрміналагічны слоўнік ... 156

*Вучэбнае выданне*

# КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 “Гісторыя”,
1-02 01 02 “Гісторыя. Англійская мова”

Складальнік

КАСЦЮКЕВІЧ Святлана Уладзіміраўна

Рэдактар *Ю. М. Казакевіч*

Дызайн вокладкі *І. С. Васільевай*

Падпісана да друку 19.12.06. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура «Таймс».
Друк трафарэтны. Ум.-друк. арк. 9,28. Ул.-выд. арк. 7,59. Тыраж 70 экз. Заказ 1646.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны універсітэт»

ЛВ № 02330/0133020 ад 30.04.04 ЛП № 02330/0133128 ад 27.05.04

211440 г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29